Азіза Ахмедава

Вавёрка-садоўніца

Апавяданні і казкі

МІНСК
«ЮНАЦТВА»
1987

ББК 84Аз
А95

Пераклад *У. Б. Ідэльсона*

З азербайджанскай

Мастак *У. І. Сытчанка*

Для дзяцей малодшага школьнага ўзросту

А $\frac{4803010200-087}{М\ 307(03)-87}$ 121—86

© Выдавецтва «Юнацтва», 1987.

ГЭТА — НАБРАНЬ

Прырода Азербайджана непаўторная. Калі хто пабачыць гэту зямлю, яго, безумоўна, зачаруе кожны яе куток. Магутныя лясы жалезнага дрэва Ленкарані. Скрозь — укрытыя арэхавымі дрэвамі паляны Закатала, песні Анадыля, пасяленні Гараязы, Кубінскія кізілавыя сады — ніколі не стомішся любавацца ізумрудная зелянінай гэтых садоў, слухаць песні салаўёў.

Калі прайсці па беразе Каспія на поўнач — трапіш у цудоўны свет: тут быццам усю прыгажосць зямлі — мора, лясы і рэкі — сабралі разам. Гэта — Набрань.

Пеністыя хвалі абмываюць залатыя пяскі. Белыя чайкі ныраюць у празрыстую ваду. Пявучыя рэкі, што цякуць праз лясы, яднаюцца адна з адной і назаўсёды зліваюцца з морам. Уздоўж берагоў Каспія ўзвышаюцца лясы, якія густа зараслі хмызнякамі. Увесну тут можна ўбачыць мноства кветак. Маладая трава, што выросла па калена, абдымае далікатныя фіялкі, быццам хавае іх ад нас. Нагніся да кустоўя, паглядзі ўважліва і ты ўбачыш смелага падснежніка, які выглядае з-пад снегу, падае вестку, што прыйшла вясна .

Як толькі пройдзе дождж, растуць і растуць, напіўшыся ўволю, узнімаюцца пад леташнім лісцем, што ляжыць на зямлі, грыбы.

І раптам дзе-небудзь у глыбіні лесу прыкмячаем мясціны, чорныя ад вогнішчаў. Нехта нядобры пакінуў свой чорны след. Мусіць, тут больш ніколі нічога не вырасце... І чуваць толькі трывожныя галасы птушак. Яны баяцца, што разбураць іхнія гнёзды і знішчаць птушанят.

Узнімі голаў, паглядзі ўважліва на высокае дрэва, на ім толькі-толькі з'явіліся зялёныя кволыя лісточкі. Але на дрэве, на яго ствале, відаць след нажа. Той нядобры чалавек не пасаромеўся надрапаць сваё імя. З раны дрэва цякуць слёзы — плача дрэва.

Лес таямнічы, але трэба навучыцца слухаць яго. Тут побач радасць і гора, плач і смех, песня і гамонка. Птушаня, звераня чакаюць сваіх матак. А тыя робяць усё, каб пакарміць сваіх дзяцей. Лес — гэта цэлы свет!

Убачыў над сабою жураўліны клін. Значыць, прыляцелі добрыя, жаданыя госці.

Лес поўніцца шолахам, гэта першыя кроплі дажджу падаюць на лісце. Раптам пачынаецца лівень. У небе пярэпалах. Кветкі курчацца, сціскаюць свае пялёсткі. Жукі, мурашы, палявыя мышы бягуць хавацца. Птушкі злятаюцца ў свае гнёзды. А лісты, стаўшы плячо ў плячо, не даюць дажджу размываць зямлю. Ведаеце, што б тады здарылася? Дождж парэзаў бы, спаласаваў зямлю, ператварыў на сто гадоў у невылечныя яры.

Добрыя лясы не дазволяць, каб маці Зямля страціла сваю прыгажосць. Кожны лісток ператвараецца ў місачку, кроплі дажджу збіраюцца ў іх, а затым ужо вада выліваецца на зямлю. Яна прагна глытае крышталь на чыстую ваду. Ад яе ідзе прыемны водар. А потым лісце, ападаючы з дрэў, высахне, раскрышыцца, змяшаецца з зямлёю, і яна стане зноў урадлівай.

Неба і зямля, лясы і рэкі, кветкі і травы, птушкі і звяры. Гэта — Набрань. Адораная ўсім харавством прыроды — Набрань.

МАЛЕНЬКІЯ ПРЫГОДЫ З МАЛЕНЬКАЙ ГЮЛЬЦЕМГІЛЬ

Гюльцемгіль і ружа

Назлы даўно хацела паехаць разам з маленькай Гюльцемгіль у сваё роднае сяло. І кожны раз гаварыла: «Хай і мая дачушка пабегае сялом, па лесе, у полі і лузе, пабачыць заснежаныя горы...»

Калі Назлы сама была маленькай, яна вельмі любіла быць на прыродзе, асабліва вясною. Разам з усімі дзецьмі збірала кветкі, бегала па лузе і гуляла з ягнятамі. І цяпер яна вельмі хацела, каб і дачка яе адчула ўсё харство жыцця на ўлонні прыроды. Вось чаму ўвесну яна разам з дачкою паехала ў роднае сяло. Ужо зусім сцямнела, калі яны прыехалі, і Гюльцемгіль адразу ж легла спаць.

Калі назаўтра маці разам з дачкою выйшлі на двор, дрэвы стаялі ў прыгожым белым убранні, а кусты руж былі скрозь усыпаны цудоўнымі кветкамі, ну якраз як на дыване,

што вісеў на сцяне ў пакойчыку Гюльцемгіль.

Дзяўчынка не стрымалася і падбегла да раскідзістага куста. Ёй захацелася сарваць кветку. Але толькі дакранулася да сцяблінкі, як адразу ж адхапіла руку, нават, спалоханая, адышлася ад куста.

Маці спытала:

— Гюльцемгіль, што здарылася, ты хацела сарваць кветку?

Дзяўчынка адказала:

— Мама, паглядзі, кветка ўкусіла мяне за руку.

Маці засмяялася:

— Дачушка, у кветак няма зубоў. Гэта — ружа, а на яе сцяблінках растуць шыпы, яны засцерагаюць, ахоўваюць кветку.

Гюльцемгіль спярша здзівілася: як гэта ахоўваюць? А потым здагадалася. Гэтыя шыпы ўсё роўна як вартавыя. Бацька колькі разоў расказваў ёй пра пагранічнікаў, яна і сама бачыла іх у кіно, па тэлевізары. Яны ж таксама ахоўваюць нашу граніцу. Толькі ў пагранічнікаў аўтаматы, а ў ружы — шыпы, таксама зброя, ды яшчэ якая, вунь як укалолі руку!..

Гюльцемгіль асцярожна падышла да куста і пачала ўважліва разглядаць яго. Яна ўбачыла на пялёстках кветак бліскучыя, быццам жэмчуг, кропелькі.

— Мамачка,— павярнулася дзяўчынка да маці,— калі ў ружы ёсць такія добрыя ахоўнікі, дык чаго ж яна так напалохалася? Паглядзі, нават заплакала.

— Не, дачушка, гэта не слёзы, гэта кропелькі расы, што апусціліся на кветкі і траву ў бязвоблачную ноч. І цяпер яны з прыемнасцю купаюцца ў гэтай расе.

— Мамачка, а што такое раса, адкуль яна ўзялася? — пацікавілася Гюльцемгіль.

— Заўтра ранічкай я табе гэта пакажу.

Бабуля, якая з усмешкай прыслухоўвалася да іх размовы, зрэзала нажніцамі некалькі руж і аддала іх Гюльцемгіль.

— Пойдзем, унучачка, дамоў, паставім кветкі ў ваду, а то яны завянуць...

Гюльцемгіль і туман

Пяшчотны туман, які правёў ноч на зялёным лузе, пачаў раніцай сплываць у горы. Ахутваючы невялікія пагоркі, ён спусціўся ў сяло па схіле гары. Жалезныя дахі дамоў, вялікія раскідзістыя дрэвы паступова схаваліся ў тумане. Нават сонца не відаць. Як быццам усё паглынуў белы туман.

Гюльцемгіль прачнулася рана. Яна праз акно назірала, як сцелецца туман. Калі на дварэ ўсё стала белым, дзяўчынка падумала, што гэта дым. Вунь нават на веранду ўзлез, зараз пачне шчыпаць вочы. Гюльцемгіль зморшчылася і паклікала маці:

— Мамачка, зачыні акно, бачыш, колькі вакол дыму!

Назлы ўбачыла тонкае пакрывала туману, які прасочваўся скрозь галіны дрэў, і засмяялася.

— Гэта не дым, дачушка, гэта туман! Ты ўчора пыталася, адкуль бярэцца раса? Хадзем, я табе пакажу.

Яны выйшлі на двор. Тонкія, нібы шаўковыя, пасмы туману сцякалі ўніз, ператвараліся ў кроплі, збіраліся на кветках і травінках. Здавалася, што пад лёгкім ветрыкам яны вя-

дуць свой вясёлы карагод, напаўняючы ўсё вакол цудоўным водарам.

— Падабаюцца табе кветкі? — запыталася ў дачкі Назлы.— Бачыш, кропелькі на іх, кожную з іх падарыў кветкам туман. Яны выкупаліся, прыбраліся, вунь якія яны ўсе прыгожыя, як хораша і прыемна пахнуць!

Паступова туман разышоўся. Узышло сонца. У яго яшчэ не гарачых промнях пераліваліся і зіхацелі на маладых зялёных травінках і розных кветках вясёлыя кроплі ранішняй расы.

Гюльцемгіль і пчала

Сонца пачало прыпякаць. Над духмянымі кветкамі ляталі, пырхалі, кружыліся, гулі жоўтыя ў чорную палоску пчолы, стракатыя матылі, чырвоныя з чорнымі кропкамі божыя кароўкі.

Вось адна пчала села на чырвоную круглую кветку канюшыны і пачала высмоктваць з яе нектар.

Гюльцемгіль вельмі захацелася злавіць пчалу. Яна ціхенька падышла і хацела паклясці на яе сваю далоньку. Але пчала паспела ўзляцець і сесці на другую кветку. Гюльцемгіль — за ёю. Так паўтаралася шмат разоў, аж пакуль дзяўчынка не злавіла пчалу. Пчала раззлавалася на Гюльцемгіль і балюча ўджаліла яе. Дзяўчынка войкнула, выпусціла пчалу і голасна заплакала. Прыбеглі бабуля і маці. Гюльцемгіль нічога не магла ім сказаць, толькі выстаўляла руку і плакала. Нарэшце яна паказала палец, які ўджаліла пчала, і сказала:

— Вя-лі-і-кая муха, я трымала яе ў руцэ, укусіла мяне за палец.

Назлы, каб суцешыць дачку, уважліва агледзела яе палец.

— Гэта цябе пчала ўджаліла.

Яна выцягнула джала, падобнае на калючку, і памазала палец кіслым малаком.

Назаўтра раніцай за сняданкам маці, паказваючы Гюльцемгіль на мёд, які яны елі, сказала:

— Вось гэты мёд пчала сабрала з нектару кветак. Памятаеш, я расказвала табе казку пра мядзведзя, які ўлез у пчаліны вулей, хацеў паласавацца мёдам. Пчолы так пакусалі яго, што ён ледзь уцёк.

— Мамачка, я баюся! Пчала ўбачыць, што я ем яе мёд, прыляціць і зноў мяне ўджаліць!

— Не, дачушка, пчала, калі ты не будзеш яе дражніць, ніколі не ўджаліць цябе. Пчала людзям вельмі карысная. Гэта ж дзякуючы ёй, яе нястомнай працы, мы ядзім салодкі, духмяны і такі патрэбны для здароўя мёд.

БАБУЛЯ І Я

Я жыву ў доме пенсіянераў, у доме, які пабудавалі для пенсіянераў суконнай фабрыкі. Не, не, я не выйшаў на пенсію. Тата кажа, што маё жыццё яшчэ толькі пачынаецца. Мне дзевяць гадоў, вучуся я ў трэцім класе. Так, я разумею ваша здзіўленне. Як здарылася, што я жыву разам з пенсіянерамі? Праўда? Зараз усё растлумачу. Справа ў тым, што мы не захацелі пакідаць бабулю адну. Тата сказаў:

— Ну, мужчына, можа, ты пажывеш з бабуляй?

Мне вельмі спадабалася, што тата так назваў мяне. Я ж і сапраўды мужчына. І вось з таго дня я і пераехаў да бабулі.

Не здзіўляйцеся, што бабуля жыве адна. Ёсць на гэта прычына. Але я раскажу ўсё з самага пачатку.

Бабуля ў маладыя гады прыйшла на суконную фабрыку і прарабіла там усё жыццё. Сябравала са сваімі равеснікамі. Разам жылі і працавалі, разам пастарэлі, разам і на пенсію пайшлі. Мама і тата заўсёды казалі: «Мама, гэта ж ганьба, да якога часу ты будзеш жыць адна ў гэтым цёмным, нізенькім доме? Пераязджай да нас, адзін з чатырох пакояў мы аддамо табе. Кожны дзень будзеш дыхаць марскім паветрам».

Бабуля не згаджалася.

— Не, дзеці мае, мне і тут хапае паветра. І, калі ласка, не ўмешвайцеся ў мае справы. Я старая жанчына, дазвольце жыць, як мне хочацца. Я прывыкла да гэтых мясцін. Мне нідзе не будзе гэтак зручна, у другім месцы я жыць не змагу.

Тата сказаў:

— Эх, мама, што людзі пра нас падумаюць. Чаго добрага, скажуць, маці ў крыўдзе на сваіх дзяцей.

— Якая ў мяне можа быць крыўда на вас?

— Я ж бачу, з якім дакорам яны глядзяць на нас. Ты ж ведаеш, гамана людзей, як горны паток, спыніць яе немагчыма.

Бабуля адказала:

— Ты не звяртай увагі, сынок, на гаворкі і позіркі. Мне тут жыць больш зручна.

Маці і бацька часта вярталіся да гэтай размовы, але бабулю ўгаварыць было цяжка.

У бабулі была вельмі дзіўная кватэра, яна зусім не падобная на сучасныя.

— Бабуля,— казаў я,— прымі з паліцы піялы. Хто іх цяпер выстаўляе на паліцах?

Бабуля засмяялася:

— Гэтыя піялы я паставіла сюды яшчэ ў маладосці, з таго часу яны і стаяць тут. Не чапай іх, дзіця маё!

Кожны раз бабуля, каб заслаць паліцу, вырэзвала з белай паперы прыгожы ўзор, а потым выціралa піялы і ставіла іх на ранейшае месца. Паміж піяламі бабуля яшчэ стаўляла чырвоныя шыкоўныя флаконы. Адыходзіла ўбок, глядзела на паліцу, і на твары яе з'яўлялася задаволеная ўсмешка.

У адным куце стаяў вялізны куфар. Бабуля прызналася, што прывезла яго сюды, калі нявестай перасялілася ў гэты дом. Мне вельмі падабаўся куфар. Ключ ад яго бабуля заўсёды насіла ў кішэні, і ніхто, акрамя яе, адчыніць куфар не мог. Калі бабуля паварочвала ключ у замку, чуваць быў дзіўны перазвон, пад які века само прыўзнімалася.

Бабуля адчыняла куфар адзін раз у год, вымала з яго ўсё, што там ляжала, праветрывала, перасыпала рэчы нафталінам і зноў зачыняла. Чаго толькі не было ў тым куфры! Вясельныя ўборы, сярэбраны пояс, архалук з залатымі гузікамі, футляр для грэбеня, вышыты серабром, духмяныя кавалкі мыла, цёмна-сіні мужчынскі гарнітур і яшчэ — у самым кутку куфра—пажаўцелыя, складзеныя трохкутнікамі пісьмы — пісьмы майго дзеда.

Бабуля, паслаўшы на падлогу дыван, акуратна раскладвала на ім мяккія мутакі. Я не ўмеў есці, седзячы на падлозе, таму садзіўся

ў крэсла за старадаўні круглы стол. А бабуля, паслаўшы на дыван прыгожы абрус, садзілася і ела з вялікім апетытам. Сядзела яна неяк дзіўна — скрыжаваўшы ногі. Я, нават каб і захацеў сесці гэтак, не змог бы.

Аднойчы бабулю паклікалі на фабрыку. Вярнулася яна адтуль дужа занепакоеная, узбуджаная. Рухі ў яе былі нейкія дзіўныя, вусны нешта шапталі, яна ўвесь час мітусілася па пакоі.

— Што здарылася, бабуля?

— Далі мне, унучак, новую кватэру. Колькі разоў я ім казала, што мяне мой пакой цалкам задавальняе. Дык не, не паслухалі. Сказалі, што гэтыя дамы старыя і іх у хуткім часе пазносяць.

— Табе адной далі кватэру?

— Не, выклікалі ўсіх пенсіянераў і ўручылі ордэры.

— А дзе табе далі кватэру?

— У новым пяціпавярховым доме. Сказалі, каб хутчэй перасяляліся. Усе мае таварышы ўжо перасяляюцца, таму і я дала згоду. Інакш я нізавошта не пераехала б, нават калі б і знеслі гэты дом.

Тата прыехаў на грузавой машыне, пагрузіў усе нашы рэчы. Рукі і ногі ў бабулі дрыжалі, язык не слухаўся, смутак-журба прыгняталі яе. Тата не сцярпеў:

— Ёсць чаго бедаваць! Вазьмі сябе ў рукі, мамачка! Табе далі прасторны светлы пакой. У сто разоў лепшы за гэты. Вада, газ, святло, вялікі двор, вакол дрэвы, зеляніна. І сябры маладосці побач!

Бабуля запярэчыла:

— Добра, добра, сынок... Ты не звяртай на мяне ўвагі, я старая жанчына... Ведаеш, коль-

кі дзён, і добрых і цяжкіх, правяла я ў гэтым доме. Бацька твой сядзеў вось тут. А калі ты пачаў хадзіць, то пабег адразу да дзвярэй. Як добра, што бацька паспеў схапіць цябе за руку, інакш бы ты спатыкнуўся аб парог і ўпаў. Калі бацька твой адыходзіў на вайну, ведаеш, колькі людзей сабралася ў гэтым маленькім пакойчыку? Як цяпер помню, сказаў ён тады: «Джаміля, пакідаю на цябе Кямаля, майго адзінага сына!» Голас у яго быў такі журботны, быццам адчуваў, што больш сюды не вернецца, больш не ўбачыць цябе. Эх, жыццё, жыццё!..

Я нават разгубіўся, убачыўшы слёзы ў бабуліных вачах, татаў позірк, утароплены ў адну кропку...

Мы пераехалі ў новы дом. Бабуля выйшла на балкон, паглядзела на горад, глыбока ўздыхнула. Мора адсюль было добра відаць, спакойныя, блакітныя агні акружалі яго. Мора было падобна на святочную хончу. Электрычнае святло нагадвала запаленыя на хончы свечкі. Бабуля глядзела, глядзела, а потым сказала:

— Вай, як многа агнёў у горадзе! Які прасторны і ўтульны наш горад!

Цяпер ад былога суму на яе твары і следу не засталося.

Яна быццам зусім забылася на свой стары дом. Бабуля была шчаслівая.

Спярша мне здалося: убачыць бабуля, што няма ў новым пакоі палічкі, куды можна ставіць піялы, і засумуе. І каб развесяліць яе, я сказаў:

— Бабуля, давай паставім піялы ў сервант.

Яна пагладзіла мяне па галаве.

— Разумнік ты мой, адзіная мая радасць, дзякуй твайму добраму сэрцу!..

І тата быў шчаслівы, калі ўбачыў, што бабуля вясёлая.

Гэта быў сапраўды дзівосны дом. Суседзі — блізкія адзін аднаму людзі. Усе яны былі старыя рабочыя суконнай фабрыкі, таварышы па працы.

ЭЛЬБЕНІЗ ІДЗЕ Ў ШКОЛУ

За ноч выпала столькі снегу, што людзі, прачнуўшыся раніцай, ажно дзівіліся. Дахі дамоў, балконы былі скрозь белыя. Дрэвы пабліскваліі зіхацелі белымі крупінкамі снегу.

Эльбеніз ніколі не бачыў гэтулькі снегу. І раней ішоў снег, але не было марозу і таму снег хутка раставаў. І пасля снегу станавілася гразка.

Эльбеніз апрануўся і выйшаў на вуліцу.

— Пачакай, не хадзі адзін, на вуліцы вельмі слізка, я правяду цябе,— аклікнула сына Рахіля.

— Не турбуйся, мамачка, не ўпаду. Можа, крышку спазнюся на заняткі, але буду ісці асцярожна.

Эльбеніз ішоў вуліцаю і думаў: «Маме ўсё яшчэ здаецца, што я маленькі. Заўсёды стараецца правесці мяне ў школу».

Раптам Эльбеніз убачыў, як маленькая дзяўчынка пераходзіць вуліцу. Асцярожненька гэтак ставіць ножкі, баіцца ўпасці. Эльбеніз скамячыў снежку, прыцэліўся і кінуў у дзяўчынку. А сам хуценька схаваўся за нечыя дзверы.

Дзяўчынка ўздрыгнула ад нечаканага

ўдару, павярнулася, паглядзела ва ўсе бакі, але на вуліцы нікога не было. Дзяўчынка паціснула плячыма і пайшла далей.

Эльбеніз пачакаў, пакуль дзяўчынка зайшла за рог вуліцы, і накіраваўся ў школу. Але неўзабаве ўбачыў на сцяне афішу і пачаў чытаць. Ага, будзе эстрадны канцэрт?

Паглядзеўшы крадком па баках і нікога не заўважыўшы, Эльбеніз сарваў афішу, скамячыў яе і кінуў убок, а сам пабег далей. Яшчэ здалёк убачыў газетную вітрыну, падышоў бліжэй. «15 студзеня...» Так, значыць, сённяшні нумар. Ну што гэта такое? Няўжо людзям няма чаго рабіць, каб у такі холад чытаць на вуліцы газету? Няхай дома чытаюць! І ён зрабіў з газетай тое ж самае, што з афішай — сарваў, скамячыў і кінуў. Пайшоў далей, пазіраючы то направа, то налева. Убачыўшы на першым паверсе адчыненую фортачку, скамячыў снежку і запусціў проста туды, у кватэру. Азірнуўся па баках і са смехам пабег далей.

На дрэве гучна цырыкалі, тулячыся адзін да аднаго, галодныя, натапыраныя вераб'і. Іх таксама не прамінуў малы свавольнік.

— Бач, расселіся! Зараз я вам пакажу!

З гэтымі словамі Эльбеніз пачаў кідаць снежкамі ў вераб'ёў, аж пакуль не разагнаў птушак.

— Вось такое снежнае надвор'е мне вельмі падабаецца,— гаварыў уголас Эльбеніз.— Народу мала, нікому да цябе няма клопату, рабі што хочаш! А калі людзей многа, кожны крычыць: «Гэй, хлопчык, так няможна рабіць, не дурэй!»

Нарэшце Эльбеніз дайшоў да школы. Хацеў быў ужо зайсці, але ўбачыў старэнькую бабульку, якая паволі ішла па вуліцы, абапіраю-

чыся на кіёк. Паблізу нікога не было, і Эльбеніз хуценька скамячыў снежку і пульнуў ёю ў бабульку. Пульнуў і адразу ж забег у школьны будынак.

Заняткі ўжо даўно пачаліся. Эльбеніз паціхеньку адчыніў дзверы і ціхенька ўвайшоў у клас.

— Эльбеніз, чаму спазніўся? — адразу ж пачуў ён строгі голас настаўніцы.

— Адна старэнькая бабулька,— пачаў, запінаючыся, Эльбеніз,— не магла перайсці дарогу, дык я ёй памог, а потым правёў дадому. Сёння гэтак слізка, яна ж магла ўпасці.

— Малайчына, Эльбеніз! Бачыце, дзеці, Эльбеніз зрабіў як сапраўдны піянер! Дзякуй табе!..

Эльбеніз ганарыста паглядзеў на аднакласнікаў, задаволены сам сабою. «Во як выкруціўся! — падумаў ён.— Настаўніца ніколі б не даравала за такое вялікае спазненне на ўрок. Абавязкова загадала б, каб маці ў школу прыйшла».

Эльбеніз дастаў сшытак і пачаў рашаць задачку. Раптам адчыніліся дзверы і ўвайшла школьная вартаўніца разам з нейкай старой жанчынай. Усе з цікаўнасцю пазіралі на іх.

— Прабачце, Рэна муаліма,— сказала вартаўніца,— што перашкаджаем вашым заняткам, але вось гэтай бабульцы, відаць, патрэбен Эльбеніз.

Усе вучні павярнуліся да Эльбеніза, а той, пазнаўшы бабульку, ад страху ледзь пад парту не палез.

— Дзе ён, той Эльбеніз,— звярнулася бабулька да настаўніцы,— пакажыце мне яго! — яна ўважліва паглядзела на вучняў.

— Эльбеніз, падыдзі сюды!

Уцягнуўшы галаву ў плечы і ледзь перастаўляючы ногі, Эльбеніз падышоў да класнай дошкі. Ад ранейшага, ганарыстага Эльбеніза, якім яго ведалі ў класе, і следу не засталося. Згорблены, як быццам пабіты, стаяў ён каля дошкі і толькі вачыма лыпаў, паглядаючы то на настаўніцу, то на бабульку.

— Так, гэта той самы хлопчык, які кінуў у мяне снежкай,— з нейкім жалем у голасе прамовіла бабулька.— Што ж я табе кепскага зрабіла, дзіцятка?..

Ад нечаканасці і здзіўлення ўсе анямелі.

Эльбеніз, мусіць, не ведаў, што пра кепскія ўчынкі раней ці пазней даведаюцца ўсе.

БЛІЗНЯТЫ

Мы — два браты, мы — блізняты. Завуць мяне Айулдуз, а майго брата — Айгюняш. Нарадзіліся мы ў адзін дзень. Я малодшы за свайго брата на дзесяць мінут. Айгюняш заўсёды выхваляецца:

— Я старэйшы за цябе.

А я яму кажу:

— Які ты старэйшы? Усяго на якія-небудзь дзесяць мінут!

— Ты што, лічыць не ўмееш? Хіба гэта мала?

— Канечне, мала!

— Ну, а калі б ты нарадзіўся першы, хай сабе і на дзесяць мінут раней?

— Тады іншая справа!

Нягледзячы на тое, што мы часта спрачаемся, мы з братам любім адзін аднаго. І яшчэ хачу сказаць: мы надта падобны адзін на аднаго. Гэта вельмі цікава. Нам і ў люстра гля-

дзецца не трэба. Паглядзелі адзін на аднаго, і ўбачылі кожны сябе.

Я кажу:

— Ты, Айгюняш, кірпаты.

А брат адказвае:

— І ты таксама, Айулдуз, кірпаты.

Мы задаволена ўсміхаемся.

Аднойчы суседка спытала ў мамы:

— Паслухай, Зулейха, як ты пазнаеш сваіх сыноў?

— Раней не магла,— адказала мама,— цяпер навучылася.

А сусед сказаў:

— Гэта, як той яблык, які падзялілі на часткі...

— Вось толькі характары, схільнасці ў іх розныя,— адказала мама.

Правільна сказала наша мама. Я, напрыклад, люблю гуляць, а Айгюняш увесь час спявае. У мяне ёсць цэлы полк салдацікаў — алавяных і з пластмасы. Лежачы на дыване, я парознаму перастройваю іх: салдацікі нясуць службу, удзельнічаюць у баях — абараняюцца, наступаюць.

Айгюняш кажа:

— І як ты не стомішся бясконца гуляць са сваімі салдацікамі? Лепш бы кніжку пачытаў.

— Лепш ты чытай, а я буду слухаць.

— А чаму сам не хочаш чытаць?

— Цярпення не хапае.

— Ведаеш чаму? Таму, што не прывучыў сябе да гэтага добрага занятку. І чытаеш вельмі марудна. Паглядзі, як хутка я чытаю.

— Гэта таму, што старэйшы за мяне.

— Усяго на дзесяць мінут,— смяецца Айгюняш.

Айгюняш сапраўды шмат чытае. Я спярша

спрабаваў падлічыць, колькі кніг ён перачытаў, а потым і з ліку збіўся. Ён вельмі многа ведае, шмат цікавага можа расказаць. Вось і сёння кажа мне:

— Айулдуз, давай будзем расказваць адзін аднаму што-небудзь цікавае, незвычайнае.

— Давай,— згаджаюся я,— толькі ты пачынай першы.

Айгюняш усміхаецца і пачынае:

— Ведаеш, Айулдуз, я ж старэйшы за цябе?

— Ведаю, на дзесяць мінут.

— А як ты думаеш, многа гэта ці мала?

— Канечне, мала!

— А вось ты паслухай спярша, а потым і скажаш, многа ці мала.

І ён пачаў расказваць:

— Як толькі я нарадзіўся, дык адразу ж пачаў расці. Падрос і сказаў сабе: буду касманаўтам! Сеў у блакітную ракету і падняўся ў неба, аж да самых зор. Калі мая ракета выходзіла на арбіту, я ўбачыў другую ракету. Яшчэ здалёк я пазнаў, што гэта ракета нашай краіны — на ёй красавалася чырвоная зорка. Калі ракета падышла бліжэй, я пазнаў першага касманаўта Зямлі Гагарына. Ён убачыў мяне і закрычаў: «Гэй, піянер, сардэчна запрашаю ў космас!»

— А ты ж гаварыў, што вырас, дарослым мужчынам стаў,— з'едліва сказаў я.

— Ну, можа, і не такім ужо і дарослым,— сумеўся Айгюняш.

— Добра, добра, расказвай далей, гэта я пажартаваў,— падбадзёрыў я брата.

— Я ўключыў радыё і сказаў Гагарыну, што лячу на Месяц. Ён спытаў: «З якой мэ-

тай?» Я адказаў, што хачу там пасяліцца. Гагарын запытаўся: «Ты думаеш, што там жывуць людзі?» — «Вось злятаю і пагляджу!» І мы развіталіся. Я падляцеў да Месяца, але сесці не змог, таму што была ноч і нічога не было відаць. І было вельмі холадна. Я вырашыў вярнуцца назад, на Зямлю. Калі прызямліўся, дык убачыў, што і ты з'явіўся на свет.

— Выходзіць,— сказаў я,— ты старэйшы за мяне не на дзесяць мінут!

— Чаму? Мой палёт у космас заняў роўна дзесяць мінут. Я ж не на трамваі ехаў, а на касмічнай ракеце ляцеў! Ну, Айулдуз, цяпер расказвай ты.

— Ведаеш, Айгюняш. Я таксама лятаў на Месяц.

— Раскажы што-небудзь іншае, хопіць і маёй гісторыі.

— Ты сказаў, што не змог апусціцца на Месяц, а мне гэта ўдалося. Праўда, як толькі я сеў, мяне тут жа схапілі нейкія людзі.

— Усё, хопіць! — усклікнуў Айгюняш.— Усім вядома, што людзей на Месяцы няма. Адразу відаць, што ты мала ведаеш, бо зусім не чытаеш кніг.

— Я ж табе не сказаў, што мяне схапілі людзі — жыхары Месяца. Нехта, напэўна, прыляцеў туды раней за мяне. Адзін з іх сказаў, што ён першы прыляцеў на Месяц і захапіў яго. Я яму адказаў: «Якая розніца, хто прыляцеў першы. Мы з вамі — дзеці Зямлі, і нам тут, на Месяцы, трэба, як і на Зямлі, захоўваць мір». Раптам Месяц запытаўся: «Хто вы, прышэльцы? Адкуль з'явіліся?» Той, што схапіў мяне, адразу ж адпусціў і моўчкі адышоўся ўбок. «Мяне завуць Айулдуз,— адказаў я Месяцу.— Я прыляцеў з Зямлі».— «Цікава,— за-

пытаў Месяц,— а мяне там, на Зямлі, ведаюць?» — «Вас там усе ведаюць і любяць,— сказаў я.— Пра Вас столькі вершаў і песень напісана». І я праспяваў: «Свеціць Месяц, свеціць ясны!..» — «Гэта цудоўна,— заўсміхаўся Месяц.— У такім выпадку я прыйду да вас у госці, а то я тут зусім адзін. Аднаму вельмі кепска... А ты, хлопчык, заставайся, калі хочаш, гуляй сабе тут, у космасе. Я пакіну цябе...»

— І ты, канечне, спалохаўся? — сказаў Айгюняш.

— Зусім не. Што я, баязлівец! Калі мне Месяц прапанаваў застацца, я адказаў, што з ахвотай застаўся б, але не магу сабе гэтага дазволіць. «Чаму?» — запытаўся Месяц. «Таму, што на Зямлі засталася мама. Яна чакае і вельмі сумуе без мяне».— «А хто такая, мама?» — не зразумеў мяне Месяц. І тады я адказаў: «Людзі таму шчаслівыя, што ў кожнага з іх ёсць мама!»

Мы так захапіліся сваімі расказамі, што і не заўважылі, як да нас падышла мама. Яна ўсё чула. Мама пацалавала мяне і Айгюняша і сказала:

— Проста і не ведаю, што б я рабіла, калі б у мяне не было гэтакіх разумных дзетак!

Мы засмяяліся. І мама, і Айгюняш, і я. Наша казка засталася няскончанай. Але мы пра гэта не шкадавалі. У нас жа наперадзе яшчэ столькі часу!

СУБОТНІК

Габіба пабудзіла раніцай Эльчына і сказала:

— Эльчын, сыночак, прачынайся, я іду на работу, а ты, глядзі, не спазніся ў школу.

Эльчын сеў на ложку, працёр вочы і, крыху памаўчаўшы, спытаў:

— Мама, сёння ж субота, дзень адпачынку. У суботу ж не ходзяць на работу?

Габіба засмяялася:

— Праўда, сынок, сёння не рабочы дзень, сёння ўся краіна адзначае 50-годдзе Ленінскага суботніка. Як ты думаеш, магу я ў такі дзень сядзець дома, магу не ўдзельнічаць у суботніку?

— Вядома, ты павінна быць на рабоце. Я ўспомніў, старшакласнікі нашай школы разам з настаўнікамі таксама пойдуць на суботнік.

— Вось бачыш, ніхто не павінен у такі святочны дзень застацца ўбаку.

— Мама, а што вы будзеце рабіць на суботніку?

— Будзем садзіць дрэвы, навядзем парадак вакол нашай установы, усюды ўсё падмяцем, пачысцім. Работы многа!

Маці пайшла. Эльчын хуценька памыўся, паснедаў і пайшоў збіраць сваіх сяброў-аднакласнікаў — Рафіка, Рубэна, Аяза, Ільгара, Ілхама.

Неўзабаве, калі ўсе яны сабраліся ў двары, Эльчын сказаў:

— Ведаеце, хлопцы, сёння споўнілася 50 гадоў Усесаюзнаму камуністычнаму суботніку, Ленінскаму суботніку,— паўтарыў ён словы маці.— Ніхто не павінен заставацца ўбаку.

— Ведаем, ведаем,— загаманілі ўсе разам.

— Давайце і мы правядзем суботнік,— прапанаваў Эльчын.

— І што мы будзем рабіць? — запытаў Рафік.

— Ачысцім нашу вуліцу ад смецця, абкапаем дрэвы, пальем іх вадой.

— Давайце лепш пойдзем туды, дзе працуюць дарослыя, папрацуем разам з імі, так цікавей,— прапанаваў Аяз.

— Ты думаеш, што дарослыя з усяго горада сабраліся ў адным месцы? — запярэчыў Эльчын.— Не, кожны працуе на сваім участку. І мы таксама будзем працаваць на сваёй вуліцы.

Усе згадзіліся з Эльчынам і разбегліся па сваіх дамах, а неўзабаве зноў сабраліся разам, хто прынёс рыдлёўку, хто венік, хто пустое вядро.

— Хлопцы,— сказаў Эльчын,— у нас усяго дзве рыдлёўкі, таму абкопваць дрэвы будзем па чарзе. Гэтыя два дрэвы Рафіку і Рубэну, гэтыя — Ільгару і Ілхаму, і па аднаму дрэву мне і Аязу.

Хлопчыкі ўзяліся за работу. Абкопваць дрэвы было не так лёгка, як спачатку здавалася дзецям — яны ж ніколі гэтым не займаліся. Зямля была цвёрдая, рыдлёўка не лезла ў яе, слізгала, стукалася аб дрэва.

Пенсіянерка Сарыя муаліма, што жыла непадалёк, падышла, паглядзела і сказала Ільгару, які ўжо добра спацеў:

— Так нельга, сынок. Спярша ўваткні рыдлёўку ў зямлю і націскай на яе нагой, а потым пераварочвай зямлю.

Ільгар стараўся рабіць, як яму раіла жанчына, але рыдлёўка не слухалася яго.

— Мацней націскай, тады рыдлёўка не будзе слізгаць. Бачыш, ты параніў дрэва, а ад такіх ран яно можа засохнуць. Трэба асцярожней.

Сарыя муаліма далучылася да дзяцей, па-

чала венікам змятаць вільготны пясок з асфальту.

Рафік і Рубэн падмяталі вуліцу, збіралі абрыўкі паперы і смецце ў кучы.

Праз некаторы час паадчыняліся вокны, што выходзілі на гэтую вуліцу. Цётка Шафіга ўзялася ручніком працiраць шыбы.

— Гэй, Шафіга, здаецца, і ты разахвоцілася,— звярнулася да суседкі Сарыя.

— Вось убачыла, што хлопчыкі падмятаюць вуліцу, наводзяць на ёй парадак. Дык хіба ж можна, каб мае вокны псавалі агульную чысціню?

Падбадзёраныя словамі цёткі Шафігі, вучні пачалі працаваць яшчэ больш старанна.

Неўзабаве амаль усе жыхары вуліцы далучыліся да дзяцей.

— Рубэн,— звярнуўся да таварыша Эльчын,— вазьмі вядро, прынясі вады, будзем паліваць дрэвы.

Рубэн прынёс вады, і яны палілі абкапаныя дрэвы. Разрыхленая зямля хутка ўсмактала ваду, якая так была неабходна дрэвам.

— Цяпер, калі мы нарэшце навучыліся добра абкопваць дрэвы, хай кожны даглядае сваё дрэва,— сказаў сябрам Эльчын.

Надышоў час ісці ў школу. Бабуля Рафіка паклікала хлопчыкаў:

— Хопіць ужо вам, напрацаваліся, ідзіце апранацца, а то спозніцеся на заняткі!

— Праўда, дзеткі, пара збірацца ў школу. Дзякуй вам, вы вельмі добра папрацавалі.

Радуючыся, што зрабілі карысную справу, хлопчыкі пабеглі дадому. Праз некаторы час юныя ленінцы крочылі па дагледжанай іхнімі рукамі вуліцы.

Іх чакала школа.

ІДЗЕ ХАЗАР З ХАЗАРА

Мне ўжо трынаццаць гадоў. Вучуся ў сёмым класе. І завуць мяне Хазар. Я праўду кажу, менавіта Хазар [1]. Калі я пайшоў у першы клас, дзеці дзівіліся:

— Цябе завуць Хазар?!

— Чаму Хазар?

— Хіба ты мора?

Проста засыпалі пытаннямі.

— Я Хазар свайго бацькі.

Я так адказваў таму, што тата заўсёды гэтак гаварыў.

Аднаго разу, вярнуўшыся дадому, я прыстаў да бацькі:

— Тата, скажы, чаму я Хазар?

Бацька не зразумеў майго пытання і здзіўлена паглядзеў на мяне. Я падышоў да акна, паказаў на вялікі блакітны Хазар.

Бацька засмяяўся.

— Мора — вялікі Хазар, а ты — маленькі Хазар. І той блакітнавокі Хазар, і ты блакітнавокі Хазар. Той глыбокі Хазар, а пра цябе я яшчэ не ведаю. Вось калі ты прачытаеш шмат кніг, будзеш атрымліваць пяцёркі ў школе, і ты станеш глыбокім Хазарам. Той горды Хазар, Хазар-змагар. Я хачу, каб і ты стаў гордым Хазарам, змагаром. Той — празрысты Хазар, я хачу, каб і ты стаў празрысты і чысты, як Хазар.

Бацька гаварыў яшчэ пра нешта, але я не зусім зразумеў сэнс яго слоў. Адно зразумеў добра: Хазар — гэта любоў майго бацькі. Бацька любіць Хазар. І я павінен захоўваць любоў майго бацькі.

---

[1] Каспійскае мора.

Я пачаў цікавіцца ўсім, шмат чытаць. Бацька адкладваў кнігі для мяне, а я потым зачытваўся імі. Я вельмі любіў кнігі пра птушак, пра звяроў, пра ўвесь жывёльны свет. Куды б ні ехаў бацька, ён адусюль прывозіў мне кнігі.

У мяне ёсць калючы вожык, чарапаха, падобная на драўляную міску, белы як снег голуб, салавей, стракаты папугай, зялёнагаловы качар, жоўтыя круглыя кураняты, белыя-белыя гусі. Я дужа люблю маіх гусей, я і верш склаў пра іх:

Эй, гусі мае, гусі,
Неглыбокі розум ваш.

Гусі закруцілі галовамі і скоса паглядзелі на мяне.

Сястра сказала:

— Чаму ў іх розум неглыбокі? Калі б гусі разумелі, дык пасварыліся б з табой.

Я сказаў:

— Вось таму я і кажу, што ў іх неглыбокі розум.

Аднаго разу я вяртаўся з мора. Бацька, убачыўшы мяне, весела ўсклікнуў:

— О, Хазар! Адкуль ідзе Хазар?

Маці сказала:

— Хазар з самага ранку ідзе.

Бацька сказаў:

— Хазар ідзе з прагулкі.

Сястра сказала:

— Хазар ідзе з горада.

Я сказаў:

— Не, Хазар ідзе з Хазара.

Усе смяяліся.

Бацька сказаў:

— Хазар будзе паэтам.

Я спытаў:

— Як твой Хазар, у якога шмат казак і песень?

Бацька сказаў:

— Так, менавіта так.

Маці сказала:

— Не, Хазар будзе мастаком.

Што рабіць, я ж не мог пакрыўдзіць маму. Таму сказаў:

— Добра, я буду памасам.

Маці здзіўлена спытала:

— Памас? Што гэта такое?

Я сказаў:

— Памас — гэта паэт і мастак разам.

Яны зноў засмяяліся.

Аднойчы бацька пакрыўдзіўся на мяне, быў незадаволены, сказаў, што я нядбайны. Мне захацелася загладзіць сваю віну, дагадзіць бацьку. Але як, чым? Ага, знайшоў! Бацька вельмі любіў нашу дачу, увесь час нешта рабіў там, падпраўляў. І я напісаў для яго вось такія чатыры радкі:

Мы зямлю, дзе стаіць наша новая дача,
Угнаеннем кармілі, паілі вадой,
Каб усе, хто ідзе, не змаглі не убачыць:
Гаспадар гэтай дачы — мужык з галавой.

Бацька прачытаў і доўга смяяўся, а потым сказаў:

— Няблага, сынок. А што-небудзь сур'ёзнае ў цябе ёсць?

І тады я разгарнуў свой запаветны сшытак і прачытаў:

— Каспійскае сіняе мора,
Магутны, вялікі Хазар,
Твае берагі і прастора
Натхняюць і клічуць да мар.
Я мару ствараць свае вершы,
Вучыцца пісаць, працаваць,

І добра, што я тут не першы
Гатоў людзям талент аддаць.

Бацька пацiснуў мне руку і сказаў:

— Здаецца, Хазар, ты і сапраўды станеш паэтам.

КАЛІ ЎДОД ЛЯЦІЦЬ НІЗКА...

Я вельмі люблю лета. У гэты час быццам больш становіцца дарог. Хочацца ісці і ехаць па гэтых дарогах бясконца. Улетку я больш за ўсё люблю ездзіць на дачу. Купаюся ў моры, яго хвалі забягаюць проста да нас у двор. Я абкопваю дрэвы, паліваю градкі, даглядаю куранят. На дачы нас двое мужчын — бацька і я. Ніхто не ўмешваецца ў нашы справы. Ні мама, ні бабуля, ні сёстры, ні распешчаныя дзеці нашага двара ў горадзе.

На дачы я многа працую, вельмі многа. Увесь дзень аж да самага вечара. За маму і бабулю. Бацька часам кажа:

— Халасцяцкае жыццё.

Гэта правільна. Ну, а калі няма таго халасцяцкага жыцця, тады як? Калі мы нічога не будзем рабіць, ніхто за нас нашу работу не зробіць.

...Зноў надышло лета, якога я чакаў ледзь не цэлы год. Я так радаваўся, але майго бацьку нечакана паслалі ажно на месяц у камандзіроўку ў далёкі горад.

Настрой у мяне адразу ж сапсаваўся. Колькі часу чакаў, і заняткі ў школе скончыліся.

Калі ўвечары бацька вярнуўся з работы, я ўбачыў, што ён вельмі стомлены.

— Дык што, тата, заўтра пераязджаем?

— Куды?

— Як куды? На дачу!

Бацька адказаў, што збіраецца ў дарогу.

— Няхай хто іншы паедзе.

— Гэта, сынок, мая работа, ніхто іншы яе не зробіць.

— А я?

— Мора пачакае, месяц прабяжыць непрыкметна.

— А як жа дача, кураняты?

— І яны пачакаюць.

Бацька паехаў. Адзін месяц. Лёгка сказаць... Дні робяцца даўжэзнымі, тыдні цягнуцца бясконца...

І вось нарэшце бацька вярнуўся. Пераехалі мы на дачу. Калі мы прыехалі, як вы думаеце, што мы ўбачылі? На балконе нейкая птушка вывела птушанят. Ведаеце, як я ўзрадаваўся?!

— Тата, што гэта за птушка?

— Гэта ўдод — сапраўдная аздоба бакінскіх садоў.

— І праўда, вельмі прыгожая птушка. Тата, мне здаецца, што ўдод пераехаў разам з намі і пасяліўся на балконе, каб быць нашым суседам. Хаця, якім суседам! Дом жа цяпер у нас адзін.

— Ён пераехаў яшчэ ўвесну, пасяліўся, звіў гняздо пад нашым балконам і вывеў толькі адно птушаня.

— А чаму ты мне пра гэта раней не расказваў?

— Таму, што твае думкі былі б тут і ты зусім бы не думаў пра ўрокі, сынок.

Я з захапленнем глядзеў на прыгожага ўдода, які сядзеў на электрычным провадзе. Пёркі яго пераліваліся ўсімі колерамі вясёлкі. У доўгай дзюбе, падобнай на муштук, птуш-

ка нешта трымала. Галаву яе ўпрыгожваў чубок, нібы на ўдода надзелі карону.

Я спытаў:

— Тата, а што гэта ён трымае ў дзюбе?

Бацька ўважліва паглядзеў.

— Гэта яйка, яйка яшчаркі. Прынёс свайму птушаняці.

— Яго птушаня будзе есці яйка яшчаркі?

— Так, птушаня ўдода вельмі пражэрліва. Колькі ні есць, ніяк не наесца.

— А чаму ён не аддае яму яйка?

— Відаць, нас баіцца.

Мы адышліся ўбок. Удод нешта прасіпеў. У гняздзе паказалася маленькая галоўка з чубком. І яна прасіпела нешта. Бацька сказаў:

— Гэта іх умоўныя знакі. Сіпенне азначае: іду, будзь каля ўвахода ў гняздо. Ведаеш, калі я ўпершыню пачуў гэтае сіпенне, мне здалося, што на нашым балконе з'явілася змяя.

У гэты час удод падляцеў да гнязда, сунуў доўгую дзюбу ў горла свайму птушаняці, быццам карміў яго драўлянай лыжкай. Потым паляцеў прэч. Усё гэта адбылося імгненна. Убачыўшы мой здзіўлены позірк, бацька сказаў:

— Язык удода вельмі кароткі. Калі маці ці бацька не будуць соваць корм проста ў горла, птушаня не зможа праглынуць яго.

— Дык што, язык кароткі толькі ў птушаняці?

— Не, у дарослых таксама.

— А як жа глытае корм маці ці бацька? Іх таксама кормяць?

Бацька засмяяўся:

— Дарослы ўдод бярэ корм у дзюбу, падкідвае яго, разяўляе рот, корм пападае яму

проста ў горла, і ён яго з задавальненнем глытае.

— Ты падумай толькі, які хітрун, га?!

Між тым удод адлятаў і прылятаў зноў і кожны раз прыносіў у дзюбе што-небудзь. Ежа была даволі дзіўная — яшчарка, скарпіён, жук-бамбардзір... І птушаня глытала іх жыўцом.

Ранічкай маці ўдодзіха некуды адляцела. Нейкі час яе не было відаць. І так кожны дзень. Я пачынаў ужо непакоіцца: «Раптам дзеці злавілі яе?! Тады птушаня застанецца галоднае». Але яна заўсёды вярталася і да сярэдзіны дня карміла птушаня. Потым адлятала, рабіла своеасаблівы перапынак, і зноў, ужо да самага вечара, карміла сваё дзіцяня...

Такія перапынкі зацікавілі мяне. Куды яна адлятае? Бацька сказаў, што ў гэты час птушка здабывае корм сабе. А я і не падумаў пра гэта. Маці ж таксама не павінна быць галоднай.

Бацька сказаў:

— Калі ўдод лятае нізка, дык, ведай, сынок, ён шукае корм свайму дзіцяняці. У гэты час ні ў якім выпадку нельга яго чапаць, бо птушаня застанецца галоднае.

ПАДСНЕЖНІК — КВЕТКА ВЯСНЫ

З кожным днём рабілася цяплей, снег неахвотна адыходзіў у горы, лугі засцілаліся зялёным дываном.

Аднойчы з-пад рыхлага снегу на самым схіле гары паказалася галоўка Падснежніка. Глянуў ён на свет і ўсклікнуў:

— Ой, як холадна!

Яго кволыя пялёсткі задрыжалі. Але паступова, адчуваючы, як ветрык ласкава абдзімае ягоны твар, Падснежнік, павесялеў, яму зрабілася прыемна. Ён шырока расплюшчыў вочы і паглядзеў уніз на лужок. Які ж прыгожы гэты схіл гары, зялёны-зялёны!.. Дрэвы ўкрыліся пупышкамі, не сёння-заўтра з'явяцца лісцікі. А вунь пад кустамі расцвілі фіялкі. Адчуваючы, што на іх загледзеліся кветкі і маладыя травінкі, фіялкі засаромеліся, схілілі на плечукі свае галоўкі.

Падснежнік гучна, каб усе пачулі, сказаў:

— Фіялка, ай, Фіялка, ай, прыгажуня палёў, не схіляй галоўку, не саромейся. Ты ж такая красуня! Мы ўсе цябе любім!

Фіялка ўзняла была галоўку, каб лепей пачуць, што там пра яе гавораць, але адразу ж зноў схілілася. Такая ўжо ў яе прывычка з дня нараджэння.

Мінула яшчэ два дні, і зранку зноў пачуўся вясёлы голас Падснежніка:

— Паглядзіце, паглядзіце, і Нарцыс прыйшоў да нас у госці! Які ён далікатны, духмяны! Як цудоўна ён пахне!

Усе павярнуліся і паглядзелі на Нарцыса. Травінкі весела гукнулі:

— І праўда, Нарцыс таксама прачнуўся. Сардэчна запрашаем да нас, цудоўны Нарцыс!

— Вялікі вам усім дзякуй. Каб вы толькі ведалі, як я сумаваў без вас!..

Нарцыс пакруціў сваёй жоўтай галоўкай, і ўсе пачулі, які ад яго ідзе цудоўны водар.

— І мы табе вельмі ўдзячны, Нарцыс,— сказалі дрэвы.— Нават лягчэй стала дыхаць. Пекната!

Мінуў яшчэ адзін дзень. І зноў пачуўся голас Падснежніка:

— Гэй, зірніце на Рамонак, ён падобны на Сонейка, што апусцілася на зямлю!

— Добры дзень, Рамонак,— выцягнула шыйку Фіялка,— мы рады цябе бачыць. Ці даўно ты прыйшоў?

— Толькі што, сястрычка Фіялка,— Рамонак паглядзеў вакол сябе. Ён быў вельмі падобны на сонечнага русявага хлопчыка ў прыгожым белым каўнерыку.

Фіялка сарамліва спытала:

— А ты не сумаваў без нас?

— Вядома, сумаваў. Але, даруйце, брацікі і сястрычкі, больш за ўсіх на свеце я люблю Сонца!

— І мы таксама любім Сонца,— заківаў галоўкай Падснежнік.

Міналі дні. На лужку расцвіталі ўсё новыя кветкі. І сярод іх — Мак у чырвонай кашульцы, жоўты-жоўты Люцік, танюсенькі, як струна, Ландыш.

Аднойчы кветкі занепакоіліся, што не чуваць больш голасу Падснежніка. Ён ужо не аклікае кветак, якія толькі што з'явіліся, не паказвае на іх, не радуецца разам з імі. Падснежнік завяў, схіліўся да зямлі, пялёсткі яго зморшчыліся.

Нарцыс сказаў:

— Падснежнік радаваўся, як мы расцвіталі. У яго добрае сэрца. Але ж ніхто з нас не парадаваўся за яго, нават не прыкмеціў яго прыгожага блакітнага ўбрання. Ён непрыкметна адышоў, бо зрабілася зусім цёпла. Так яму наканавана нашай матухнай Прыродай.

Прыціхлі ў задуменні кветкі. Іх цяпер на лугу было многа-многа. І ўсе яны памяталі добрыя словы, што сказаў кожнай з іх Падснежнік — першы вястун Вясны.

ЯЕ ПАЛЮБІЛІ КВЕТКІ

Цудоўным сонечным днём у даліну, усыпаную кветкамі, прыляцела шэрая птушка.

— Ах, як тут прыгожа! Я застануся тут жыць сярод гэтых кветак!..

Ландыш шырока расплюшчыў заспаныя вочы.

— Вай, што гэта за пачварная птушка! Я ажно спалохаўся яе!

— Небарака, яна падобная на жабу,— сказаў палявы Рамонак.

— Адкуль яна прыляцела? — раззлавалася Ружа.— Якая яна агідная!

Шэрая птушка пачула галасы кветак і зусім разгубілася. Яна хацела схавацца за кустом, але ён нават і блізка не падпусціў яе.

— Адкуль прыйшла,— зашыпеў куст,— туды і ідзі.

Шэрая птушка паляцела з даліны. Так вось і пачала жыць адна-адзінюткая.

Калі-нікалі вецер даносіў з даліны цудоўны водар кветак.

Шэрая птушка ўдыхала яго і гаварыла сама сабе:

— Ах, як хораша! З якім задавальненнем жыла б я сярод кветак. Але ж яны не дазваляюць, кажуць, што я брыдкая, праганяюць мяне.

Аднойчы шэрая птушка паляцела папіць вады, і раптам да яе данёсся голас:

— Вай, я згараю ад смагі, хаця б глыток вады!

Шэрая птушка паляцела ў той бок, адкуль пачула гэтую скаргу, і ўбачыла Ландыша. Ад смагі ён ледзьве дыхаў і схіліў галаву амаль

да зямлі. Ды і іншыя кветкі былі вялыя, прыціхлыя.

— Вай, бедныя кветкі, скурчыліся, зліняліі, і травінкі зусім пажоўклі. Пачакайце трошкі, я зараз прынясу вам вады.

— Так, так, прынясі нам, калі ласка, вады, добрая птушка!..

З таго часу больш ніхто не праганяў яе з гэтых мясцін. Шэрая птушка, не ведаючы спакою, увесь час насіла ваду.

Аднойчы на небе з'явіліся воблакі, пайшоў дождж. Зямля, усе кветкі і травінкі з радасцю і асалодай пачалі купацца ў кроплях дажджу. Яны былі такія шчаслівыя, такія вясёлыя... Шэрая птушка вельмі спалохалася. Яна схавалася ў кустах і прытулілася да зямлі... «Відаць, кветкі зноў мяне прагоняць,— сумна думала яна.— Цяпер, калі вакол столькі вады, я ім ужо зусім не патрэбна».

Ландыш сказаў Ружы:

— Давайце зробім так: хай кожны з нас аддасць шэрай птушцы трошкі свайго колеру. Толькі каб яна нічога не ведала, я падару ёй свой белы колер.

Ландыш паклікаў да сябе птушку, і калі яна падляцела да яго, ён непрыкметна дакрануўся да яе.

— Падляці і да мяне, шэрая птушка,— гукнула Ружа.

— Лячу, лячу, мілая Ружа!

Птушка ў адзін момант падляцела да Ружы, і тая, таксама непрыкметна, аддала ёй чырвоны колер.

Люцік пафарбаваў галоўку птушкі жоўтым колерам. Цяпер яе маленькія, як пацеркі, чорныя бліскучыя вочкі зрабіліся вельмі пры-

гожымі. А маладыя травінкі аддалі птушцы свой зялёны колер.

Шэрая птушка, нічога пра гэта не ведаючы, пералятала з кветкі на кветку, і ўсе яны дарылі ёй свае цудоўныя фарбы. Раней такая шэрая, несамавітая, птушка раптам зрабілася прыгожай, што нават самі кветкі здзівіліся.

Дождж даўно скончыўся. Кветкі пачалі адчуваць смагу, і птушка зноў паляцела па ваду. Калі яна падляцела да ракі і нахілілася, каб набраць у дзюбу вады, дык замерла ад здзіўлення. У вадзе яна ўбачыла нейкую цудоўную птушку, яе пёркі пераліваліся ўсімі колерамі вясёлкі.

«Вось каб я была такой красуняй!» — падумала птушка.

Яна з горыччу ўздыхнула і паглядзела па баках, але нікога паблізу не было. Птушка яшчэ раз паглядзела ў ваду і раптам сцяміла: гэта ж яе адлюстраванне! Яна проста не ведала, што рабіць ад такой вялікай радасці. Узняўшыся высока-высока, птушка пачала гойсаць, куляцца ў паветры.

— Дарагія мае кветкі,— весела гукала яна,— паглядзіце, якая я прыгожая! Цяпер вы мяне больш не будзеце праганяць, мы будзем дружыць!

Кветкі згодна ківалі галоўкамі, задаволеныя тым, што падарылі птушцы такое шчасце. А былая шэрая, а цяпер такая шчаслівая птушка не ведала стомы і ўсё лятала і лятала ў блакітнай вышыні. Яе цудоўнае ўбранне іскрылася і зіхацела ў промнях гарачага ліпеньскага сонца.

ЗІМА-ПАДМАНШЧЫЦА

Прыляцела белагрудая з вілаватым хвосцікам ластаўка, прынесла першую вестку пра вясну. Усе ўзрадаваліся...

Зайцы саромеліся сваёй вопраткі. Іх белыя кажушкі вылінялі, былі брудныя. Яны нікому не маглі паказацца на вочы.

Мядзведзі, якія ўсю зіму праспалі ў сваіх бярлогах, схуднелі, бедалагі, і аслабелі.

Вераб'і цвыркалі і то пераскаквалі з галіны на галіну, што ўкрыліся бухматымі пупышкамі, то корпаліся ў зямлі, снег на якой зусім растаў.

Усе падумалі, што прыйшла сапраўдная Вясна, і зарадаваліся, пачалі віншаваць адзін аднаго. Але было неяк дзіўна, не адчувалася вясенняга цяпла. Ды і ўсмешка ў Вясны была нейкая незвычайная. Калі б прыйшла сапраўдная Вясна, яна прынесла б зайцам шэрае футра; мядзведзі не спалі б у бярлогах, а грэліся б на сонейку, набіраліся сілы; у вераб'ёў ужо нарадзіліся б малыя дзіцяняткі; дрэвы атрымалі б новае ўбранне, а кветкі і трава паказаліся б на белы свет.

Вішня і Алыча сказалі кветкам і лісцікам, каб яны не спяшаліся, пачакалі трохі — нешта вельмі халоднае дыханне ў гэтай Вясны. Лісцікі спалохаліся, а ўпартыя кветкі не паслухаліся Вішні і Алычы: расхінулі свае зялёныя кашулькі, расплюшчылі вочкі і пацягнуліся да сонейка. Яны былі такія шчаслівыя!

Старая Зіма-падманшчыца зларадна заўхмылялася: «Бач ты, як яны ўсе зарадаваліся. Ну, пачакайце, зараз я вам пакажу Вясну!»

Яна скінула зялёнае адзенне і вянок, на-

слала на ўсё жывое вецер, ураган, мароз і снег.

Паляцелі прэч птушкі, пахаваліся звяры. Толькі кветкам і траве не было дзе схавацца. Зіма сарвала кволыя пялёсткі, замарозіла, высушыла іх. Але час зімы ўжо мінуў. Падманшчыца зусім знясілела. Губляючы сваю ўладу над прыродай, яна пачала адпаўзаць у горы.

А сапраўдная Вясна ўжо ішла па зямлі, надзеўшы духмянае ўбранне з маладой зялёнай травы і вянок з самых прыгожых кветак. Залатыя промні сонца рассыпаліся на яе плячах. Яе непераможную хаду ўжо ніхто не мог спыніць і затрымаць.

Добры дзень, маладая, прыгожая, жаданая Вясна!

КАЛЫХАНКА

Калі непадалёк ад сяла вырас малады прыгожы лес, вароны разнеслі ўсім гэту радасную вестку. Звяры і птушкі перабраліся сюды і пачалі абжываць лес. Паступова яго жыхароў станавілася ўсё больш і больш. Лес напоўніўся галасамі маладых звяркоў і птушак.

Сустрэліся аднаго разу Варона і Вожычыха. Убачыўшы, што Вожычыха штосьці цягне ў сваю нару, Варона сказала:

— Нешта даўно я цябе не сустракала, матухна Вожычыха.

— І не пытайся, сястрыца Варона, увесь час такая занятая, што няма нават хвілінкі, каб пачухаць патыліцу.

— Чым жа ты гэтак занятая?

— А ўсё дзеткі, каб яны здаровенькія бы-

лі. Цудоўны, разумееш, у іх апетыт. Давай ім есці і давай. Вось я і шукаю, цягаю, назапашваю. Не магу я пакінуць сваіх дзетак галоднымі!

— Так, так, матухна Вожычыха, і ў мяне тое ж самае.

— А што, твае дзеці таксама многа ядуць?

— Дзякуй алаху, на гэта паскардзіцца не магу. А ты, матухна, і не пытайся пра гэта, яшчэ сурочыш маіх дзетак,— узлавалася Варона.— Думаеш, толькі ты гэтым занятая? Мне зверху ўсё відаць. Вось тая ж ластаўка, зусім з сіл выбілася. Яе птушаняты такія пражэрлівыя!.. Бедныя мацяркі, ад раніцы і да ночы не ведаюць спакою!

Міналі дні. Нарэшце малыя трохі падраслі. Цяпер яны ўжо маглі самі шукаць і знаходзіць сабе корм. Набегаўшыся і налятаўшыся за дзень, яны вярталіся дадому, у норы і гнёзды, і там, прытуліўшыся да маці, стомленыя і шчаслівыя, засыналі. А мацяркі спявалі ім калыханкі.

Аднойчы сабраліся ў лесе звяры і птушкі і ўсчалі спрэчку, чыя калыханка лепшая. Кожны лічыў сваю песню самай прыгожай.

Матухна Вожычыха сказала, што ў іх, вожыкаў, калыханка самая пяшчотная і дасціпная ў свеце:

— Не патрэбен вожыку грабеньчык,
У яго іголачкі стаяць,
Патушу я хуценька агеньчык,
Каб хутчэй сыночак клаўся спаць.

Матухна Зайчыха запярэчыла і сказала, што іхняя калыханка лепшая. Вось паслухайце:

— Палыновы ветрык вей,
Песню зайчыку навей,

У небе маладзік стаіць,
У калысцы зайчык спіць.

Пачуўшы гэта, сястрыца Варона засмяялася:

— Вай, знайшлі што хваліць. Вось паслухайце нашу калыханку, усё жыццё будзеце яе спяваць:

— Мы не лодары, вароны,
Спрытныя працаўнікі,
Добра спім, ўстаем мы рана,
Не адлежваем бакі.

Нечакана ўсе пачулі:

— Пяшчотныя пялёсткі
Ад пошчаку трапечуць,
А хто гэтак прыгожа
Спявае зноў і зноў?
То ж Салавей і Ружа
Пра нешта таямніча
Вядуць сваю размову.
Напэўна, пра любоў.

Усе звяры і птушкі згадзіліся, што калыханка Салавейкі, бадай, самая рамантычная і ўзнёслая.

Але раптам ад сяла нехта вельмі прыгожым голасам заспяваў:

— Ночка цёмная раскрыла
Над зямлёю парасон
І сыночку падарыла
Добры і салодкі сон.

Усміхаецца сыночак,
Песню слухае маю,
Калыханку праспяваю
І сыночка залюляю,
Баю-баінькі-баю.

— Якая цудоўная калыханка,— не змагла стрымацца матухна Вожычыха.

— І сапраўды, прыгожая,— падтрымала яе сястрыца Варона.— Цікава, хто ж гэта спяваў?

— Я ведаю,— сказаў брацік Салавейка.— Гэта спявала Маці, Маці чалавека! Калі я жыў у людзей, дык часта слухаў гэтую душэўную, такую сардэчную калыханку. Потым людзі выпусцілі мяне з клеткі, і я ім век буду ўдзячны за тое, што яны падарылі мне шчасце быць вольным птахам. Давайце вывучым цудоўную калыханку людзей.

Усе звяры і птушкі ўхвалілі словы браціка Салавейкі.

З тае пары жыхары маладога лесу, як толькі сцямнее, слухаюць калыханку Маці чалавека, а потым, аб'яднаўшы яе са сваімі калыханкамі, спяваюць сваім дзецям:

— Ночка цёмная раскрыла
Над зямлёю парасон
І сыночку падарыла
Добры і салодкі сон.
Усміхаецца сыночак,
Песню слухае маю,
Калыханку праспяваю
І сыночка залюляю,
Баю-баінькі-баю.

ТАПЛАН І ЯГО ЦЕНЬ

Таплан прачнуўся, ляніва пацягнуўся, высунуў галаву з будкі і агледзеў усё навокал. Стаяла цудоўная вясновая раніца. Сонца паслала на зямлю свае залатыя промні. Кураняты, папіскваючы, беглі за сваёю маці. Кот Мастан, лежачы, назіраў за імі. У яго аж слінка цячэ, але наблізіцца да куранят баіцца, бо

ведае: маці Курыца — злосная-злосная, задзяўбці можа!

Таплан выйшаў на двор, падаўся да весніц і раптам заўважыў побач свой цень. Ён быў такі вялізны, што Таплан замёр на месцы.

— А яшчэ кажуць, што я шчанюк. Чаму ж тады мой цень такі вялізны? Выходзіць, мяне падманвалі. Я ж зусім нармальны вялікі сабака!

Ён уважліва пачаў разглядаць свой цень. І праўда, галава, хвост, тулава — усё такое ж, як у яго маці Алабаш. Таплан спадабаўся сам сабе.

— Ну і ну!.. Мабыць, я гэтак падрос за адну ноч?..

Таплан задраў нос, змяніў хаду, ну зусім як дарослы сабака. Убачыўшы такія змены, Певень здзіўлена запытаўся:

— Кукарэку, вай, шчанюк, што з табою здарылася?

— Я не шчанюк, я сабака! Няўжо ты не бачыш? Прывык мяне так называць. Нічога, давядзецца адвыкаць.

— Чаму я прывык, чаму трэба адвыкаць?

— А навошта ты мяне абражаеш, называеш шчанюком, калі я — вялікі сабака?

Такі адказ Пеўню не спадабаўся, і ён балюча дзеўбануў Таплана.

Таплан заскавытаў і ўцёк на вуліцу. Потым, калі трохі супакоіўся ад страху, пачаў сарамаціць сам сябе: «Ну чаго я так напалохаўся нейкага пеўня. Так мне і трэба! Хаця і вырас, а ўсё роўна баязлівы, як шчанюк».

Калі Таплан вярнуўся дадому, сонца падняло ўжо высока.

Успомніў Таплан, што ён цяпер не малень-

кае шчаня, а вялікі сабака, і паглядзеў на свой цень.

— Што гэта здарылася з ценем?

Таплан пабег на тое месца, дзе раніцай убачыў свой цень. Але і там цень быў маленькі. Таплан засмуціўся і заплакаў. Да яго падышла Алабаш.

— Чаго ты, сынок, плачаш, хто цябе пакрыўдзіў?

— Як жа мне не плакаць? Раніцай я вырас, зрабіўся вялікім сабакам, а цяпер зноў маленькі. Не ведаю, хто гэта мяне такім зноў зрабіў.

Алабаш нічога не разумела.

— Што ты такое гаворыш, сынок? Як гэта раніцай вырас, а цяпер зноў зрабіўся маленькі?

Пачуўшы іх размову, Певень сказаў:

— Сёння Таплана не пазнаць. Што ён такое вярзе? Глупства нейкае!

— Ніякае не глупства. Калі раніцай я выйшаў на двор і ўбачыў свой цень, я зразумеў, што вельмі падрос і стаў нармальным сабакам. А цяпер, самі паглядзіце, мой цень зусім маленькі.

Алабаш і Певень паглядзелі адзін на аднаго і засмяяліся.

— Не плач, Таплан,— сказала Алабаш,— пачакай трошкі. Вечарам ты зноў станеш вялікім сабакам.

— Як гэта? — здзівіўся Таплан.

Таплан быў яшчэ вельмі маленькім шчанём і не ведаў, што велічыня ценю залежыць ад таго, дзе знаходзіцца сонца, што ўдзень, калі сонца высока, цені кароткія, а раніцай і ўвечары, на ўсходзе і захадзе сонца, наадварот — цені доўгія.

Калі маці Алабаш растлумачыла яму гэта, Таплан усё зразумеў па-свойму. Ён сеў каля будкі і пачаў чакаць захаду сонца.

— Нічога не зробіш,— сказаў Таплан самому сабе,— пакуль не вырасту, буду глядзець на свой цень толькі раніцай і ўвечары.

ЧЫК-ЧЫК І ГРАНАТ

Шэры натапыраны верабей Чык-Чык прыляцеў у сад. Ён сеў на гранатавае дрэва ў квецені і сказаў:

— Цікава, а чаму гэтыя ружы не пахнуць?

Чырвоныя кветкі, што выглядвалі з пупышак на гранаце, усе разам загаманілі:

— Мы не ружы, мы — кветкі граната, а гранат — плод лекавы, асабліва карысны сок...

— А дзе ж ваш сок, пакажыце,— пацікавіўся верабей Чык-Чык.

— Мы пакуль што кветкі, а калі вырасце і даспее плод, гранат нальецца сокам.

— І калі ж вы зробіцеся гранатам?

— Увосень.

— А гранат смачны?

— Ого, яшчэ які!

— А мне можна пакаштаваць?

— Вядома, але гранат павінен спачатку паспець. Тады каштуй на здароўе.

З таго часу Чык-Чык штодзень прылятаў да гранатавага дрэва. Аднаго разу ён заўважыў, што чырвоныя пялёсткі кветак скурчыліся і апалі, а на іх месцы засталіся маленькія шышачкі.

Міналі дні, шышачкі раслі. Адну з іх і аблюбаваў Чык-Чык. «Як хутка расце мой гранат, калі ж ён паспее?»

— Не спяшайся, Чык-Чык,— сказаў няспелы Гранат,— я яшчэ не прыдатны для яды. Праўда, я падрос, з'явіліся зярняты, толькі яны сухія, белыя, яшчэ не пачырванелі. Вось калі я ўволю нап'юся сонечных промняў, тады мае зярняты напоўняцца смачным сокам.

Мінула лета, надышла восень. Чык-Чык прылятаў, садзіўся на гранатавае дрэва і цярпліва чакаў. Аднойчы ён спытаў у Граната:

— Гранат, а Гранат, ты ўжо напіўся сонечных промняў?

— Удосталь, мае чырвоныя зярняты поўныя соку.

Чык-Чык узрадаваўся і дзеўбануў гранат. У роце зрабілася горка-горка.

— І гэта твой хвалёны сок, ён жа горкі!

— Гэта скурка мая горкая, яна ідзе на лекі, а чырвоныя зярняты салодкія.

Замаркоціўся Чык-Чык. А калі зноў прыляцеў назаўтра раніцай, дык убачыў, што на дрэве не засталося ніводнага граната.

— Куды ж яны ўсе падзяваліся?

Гранат, які здолеў схавацца сярод лісця, сказаў:

— Не бядуй, Чык-Чык, я тут. Убачыў, што людзі пачалі збіраць нас, і схаваўся.

Раптам узняўся вецер, ён сарваў гранат і шпурнуў яго на зямлю. Скурка граната лопнула, і Чык-Чык, не помнячы сябе ад радасці, пачаў дзяўбці чырвоныя зярняты.

— Ах, якія смачныя! Ніколі ў жыцці не каштаваў нічога падобнага! І як іх многа, цудоўных зярнят! Браткі-вераб'і, вавёркі, мура-

шы! Ідзіце сюды, пакаштуйце гэты смачны гранат!

Чык-Чык не быў скнара, ён падзяліўся салодкім гранатам са сваімі сябрамі.

ЯК МЯДЗВЕДЗЬ ПАСВАРЫЎСЯ З ЛЕСАМ

Мядзведзь, які ўсю зіму праспаў у сваёй бярлозе, прачнуўся раптам ад гучных галасоў. Высунуў галаву, паглядзеў наўкол, убачыў Вожыка і запытаўся ў яго:

— Гэй, Вожык, што за крык і гоман? Спаць не даюць!

— Дзядзька Мядзведзь, гэта птушкі спяваюць, Вясна прыйшла! Вылазь хутчэй са свае бярлогі, а то Вясну праспіш!

— Дык чаму ж мяне не пабудзілі? Паслухай, а Вясна даўно прыйшла, я не спазніўся?

— Не, не, дзядзька Мядзведзь, ты прачнуўся ў самую пару.

— Які ж я галодны! Разумееш, усю зіму толькі лапу і смактаў. Зусім аслабеў, аж галава кружыцца!..

— Ну, дык вылазь хутчэй, пашукай сабе яды, тады і сілы набярэшся,— сказаў Вожык і пайшоў па сваіх справах.

Доўга блукаў па лесе Мядзведзь, вярнуўся дадому з вялізным букетам кветак.

Убачыла яго Варона, закаркала:

— Што з табою здарылася, дзядзька Мядзведзь? Навошта ты кветкі пачаў збіраць?

Мядзведзь засаромеўся, схаваў кветкі за спіну.

— Так, збіраю кветкі, вельмі яны мне падабаюцца.

Раптам Мядзведзь радасна зароў:

— Глядзіце, груша! Як хутка яна расцвіла! Гэта маё дрэва! І амаль побач з маім домам. Нікога і блізка да яе не падпушчу! Люблю сакавітыя, смачныя грушы! Цяпер толькі трэба дачакацца, калі яны паспеюць!..

З тае пары Мядзведзь пачаў пільна вартаваць грушу. Мінуў месяц, другі. У лесе расцвілі іншыя дрэвы. Іх белыя, ружовыя кветкі былі такія прыгожыя!

Мядзведзь бурчаў:

— Маё дрэва ўжо даўно расцвіло, а плады на ім ніяк не паспеюць.

У гэты час на дрэва сеў Шпак і спытаў у Мядзведзя:

— Чаму ты, дзядзька Мядзведзь, не адыходзіш ад дрэва? Я ўжо шмат часу назіраю за табою і ніяк не магу зразумець гэтага.

Убачыўшы Шпака, які сеў на ягонае дрэва, Мядзведзь абурыўся:

— Ты адкуль такі ўзяўся? Чаму без дазволу сеў на маё дрэва? Ану, выбірайся адгэтуль!

Спалохаўся Шпак, пераляцеў на другое дрэва.

— Чаго ты, дзядзька Мядзведзь, злуешся, адкуль я мог ведаць, што гэта тваё дрэва?

— Дык ведай, маё, маё ўласнае, і нікому ніводнай грушы я не дам! Думаеш, лёгка столькі часу яго вартаваць?!

— А навошта табе яго вартаваць? Напішы, што яно тваё, і ніхто нават і блізка не падыдзе.

— А што з таго, што я напішу? Ці ж мала мядзведзяў бадзяецца ў лесе. Разумнік які знайшоўся! Нікуды я ад майго дрэва не пайду.

— Як сабе хочаш. Табе лепш ведаць.— Шпак узмахнуў крыламі і паляцеў.

Мядзведзь трохі пахадзіў вакол дрэва і

толькі быў улёгся пад ім зноў, як убачыў шмат мурашак, якія беглі ўверх і ўніз па дрэве. Ускочыўшы, ён зароў:

— Вы толькі паглядзіце на іх! Адкуль вы ўзяліся на маю галаву, чаму залезлі на маё дрэва?! Я знайшоў сабе гатовую ежу, а яны тут як тут, на гатовенькае папрыбягалі. Груш, бач, ім захацелася? А трасцу не хочаце?!

Мядзведзь пачаў раз'юшана скрэбці лапамі кару, скідаць мурашак на зямлю. Перапалоханыя мурашкі разбегліся хто куды.

Надышла восень. А Мядзведзь усё сядзеў пад грушай і нікога да яе не падпускаў.

Завітаў неяк да Мядзведзя Заяц. Былі яны добрымі сябрамі. Мядзведзь не раз ратаваў Зайца ад вострых зубоў Лісіцы.

— Дзядзечка Мядзведзь,— запытаўся Заяц,— чаму ты сядзіш пад гэтым дрэвам?

— Я чакаю,— адказаў Мядзведзь,— калі на ім паспеюць смачныя грушы, каб потым уволю наесціся.

— Дзядзечка Мядзведзь, паглядзі, вунь колькі ў лесе расце груш. Ідзі і бяры колькі хочаш.

— Як, ты праўду кажаш?

— Галавой тваёй магу прысягнуць, што кажу чыстую праўду,— адказаў Заяц і аж папярхнуўся ад страху. Бо як гэта ён асмеліўся вымавіць такое? Гэта ж трэба было сказаць: сваёй галавой. Але Мядзведзь не звярнуў на гэта ніякай увагі, яго зусім іншае турбавала.

— Дык чаму ж мае грушы не паспелі?

— Не-не ве-даю, дзядзечка Мядзведзь,— заікаючыся, адказаў Заяц.

— Тады вось што, Заяц, пачакай тут, а я збегаю наемся груш і хуценька вярнуся.

Пабег Мядзведзь і сапраўды неўзабаве вярнуўся, несучы цэлыя прыгаршчы груш.

— Малайчына, Даўгавухі, праўду сказаў, там поўна груш. Пакуль мае паспеюць, буду есці грушы з тых дрэў.— Мядзведзь аж скакаў ад радасці.

Вось так Мядзведзь кожны дзень бегаў па грушы, потым вяртаўся і вартаваў сваё дрэва, цярпліва чакаў.

Нарэшце плады паспелі. Але што гэта? Яны зусім не былі падобныя на грушы, нейкія чырвоныя, дробныя. Мядзведзь разгубіўся:

— Што гэта за грушы? Я ніколі ў жыцці не бачыў такіх.

Сарваў адну, узяў у пашчу і тут жа зморшчыўся, выплюнуў.

— Фэ, якая кіслая,— прабурчаў ён.— Дзень і ноч вартаваў такую кісляціну.

Мядзведзь раззлаваўся, схапіў камень і кінуў у дрэва. Ён жа не ведаў, што гэта кізіл. Кізілавае дрэва цвіце раней за іншыя дрэвы, а плады яго паспяваюць позна, калі на другіх дрэвах плады ўжо даўно паспелі.

Доўга яшчэ лаяў Мядзведзь гэты лес, грозіўся, што больш ніколі жыць у ім не будзе. Пасварыўся Мядзведзь з лесам і пайшоў куды вочы глядзяць.

А лес пра гэта нават нічога і не ведаў.

КРУГЛАГАЛОВЫ

У лісіцы было трое дзяцей: Лапавухі, Пласканосік і Круглагаловы.

Аднойчы раніцай маці Лісіца пайшла на паляванне. Вось і поўдзень ужо, а яна ўсё не вяртаецца. Лісяняты прагаладаліся, пачалі енчыць:

— Чаму наша мама так доўга не ідзе, жывот ужо бурчыць ад голаду...

Час ішоў, і Круглагаловы не вытрываў:

— Пайду пагляджу, можа, і знайду чагонебудзь паесці.

— Ты што, здурнеў! — абурыўся Пласканосік.— Як гэта ты адзін пойдзеш?

— Не бойся, нічога не здарыцца. Калі што знайду, дык і табе прынясу,— адказаў Круглагаловы.

— Не, не, нікуды не хадзі,— спалохана сказаў і Лапавухі.— Мама загадала, каб ніхто з дому не выходзіў, інакш заблудзім, не знойдзем дарогу назад, нас зловяць і з'ядуць. Пойдзем на паляванне, а самі здабычай зробімся.

— Ты, Лапавухі, вядомы баязлівец, не хвалюйся, я пайду асцярожна.

Круглагаловы, хоць і баяўся, ціхенька ішоў праз лес. Упершыню ён выйшаў адзін у лес. Была вясна, надвор'е стаяла цёплае. Дрэвы і хмызнякі зазелянелі.

— Добра, што я не захацеў чакаць,— гаварыў сам сабе Круглагаловы.— Як тут прыгожа! Колькі вакол кветак! І як усе яны прыемна пахнуць! Шкада, што не ўгаварыў Лапавухага і Пласканосіка пайсці разам са мной. Тады я зусім не сумаваў бы.— Круглагаловы, паглядзеўшы па баках, ціхенька дадаў: — І не баюся. Цікава, а мама наша ўжо вярнулася?..

І тут раптам Круглагаловы пачуў нейкае шамаценне. Ён хуценька схаваўся за куст, выцягнуў шыю і паглядзеў на ўсе бакі. Убачыўшы вожыка, Круглагаловы асцярожна наблізіўся да яго. Той імгненна натапырыў свае іголкі. Лісяня дакранулася да яго носам і тут жа адскочыла.

— Вай, як ён колецца! Лепш не чапаць яго. І мама ніколі не прыносіла нам такую калючую ежу.

Круглагаловы абышоў вожыка і рушыў далей. Вось каб яму трапіўся заяц, гэта іншая рэч!

Паступова пачало цямнець. Круглагаловы, убачыўшы гэта, спалохаўся, заенчыў, нават заікацца пачаў.

— Вай, вай, паміраю з голаду. Мне страшна, я баюся!..

Нарэшце ён падышоў да рэчкі. Успомніў, што ў рацэ можна злавіць рыбу, смачную-смачную. Але як гэта зрабіць? Падумаў-падумаў, апусціў хвост у ваду, павярнуў галаву назад і пачаў чакаць улову. Праз некаторы час блізка да хваста падплыла рыбка. Круглагаловы хацеў злавіць яе, але рыбка спрытна вільнула ўбок, толькі луской бліснула і знікла ў глыбіні. Круглагаловы зноў пачаў цярпліва чакаць. Нарэшце з'явілася яшчэ адна рыбка. На гэты раз лісяня не прамахнулася, злаўчылася і злавіла рыбку.

«Мама і не паверыць, што я гэтак спрытна злавіў рыбку»,— падумаў Круглагаловы.

Ён з'еў рыбку і парашыў вяртацца дадому. Шукаў, шукаў дарогу, ды так і не знайшоў. Спалохаўся Круглагаловы, заплакаў:

— Вай-вай-вай, дамоў хачу, хачу да мамы...

— Што здарылася, маленькае лісяня, чаго ты плачаш? — запытаўся ў Круглагаловага лясны Певень.

— Я заблудзіўся. Да мамы хачу, хачу дамоў...

— А ты не маніш?

— Не, я праўду кажу.

— Калі ты нават і праўду кажаш, я не змагу табе дапамагчы. Твая маці шмат нашых дзетак паела. Колькі слёз мы пралілі!..

— Вашых дзетак... Якіх гэта вашых? — сумеўся Круглагаловы.

— Нашых, гэта значыць, лясных пеўнікаў. Няўжо ты не ведаеш?

— Не, мне пра гэта нічога невядома.

Аднак ён сказаў няпраўду. Маці Лісіца колькі разоў прыносіла ім лясных пеўнікаў.

Пайшоў Круглагаловы далей.

— Няма чаго плакаць,— сказаў ён сам сабе.— Лепш пашукаю якую нару і заначую ў ёй.

Доўга ішоў па лесе Круглагаловы, нарэшце такі натрапіў на вялізную пячору.

— Вось гэта і будзе мой дом, хоць пасплю трохі, а калі хто зойдзе, я так моцна закрычу, што той напалохаецца і ўцячэ.

Ён хвастом падмёў падлогу, пачысціў усё, навёў парадак, выйшаў на двор, абтрос хвост, вярнуўся, улёгся ямчэй і раптам пачуў страшэнны рык.

— Вай, хто гэта так страшна раве? — ліся-ня ўсхапілася, выскачыла з пячоры, схавалася за дрэва і пачало назіраць.

Аказалася, што гэта ніякая не пячора, а мядзведзева бярлога.

— Вай, як добра, што я паспеў уцячы адтуль. Ён бы задушыў мяне. Паглядзіце на яго, які ён брудны, а я такі парадак навёў у яго бярлозе...

— Вось дык любата! Хто гэта так добра прыбраў у маім доме? — пачуў Круглагаловы.— Няхай бы ён заўсёды тут прыбіраў!..

— А як жа, чакай,— ціхенька прамовіў Круглагаловы.— Знайшоў дурня, каб твой сметнік прыбіраць!..

Пайшоў Круглагаловы далей. А калі зноў убачыў нейкую нару, спыніўся, агледзеўся па баках, перш чым падысці бліжэй. І тут убачыў, што гэта ваўчынае логава. Ваўчыха, вакол якой спалі, наеўшыся, ваўчаняты, злосна гыркнула:

— Хто там совае нос у маё логава? Разарву на шматкі!..

Пачуўшы гэта, лісяня дало такога драпака, што толькі праз гадзіну апамяталася.

— Яшчэ трошкі, і ваўчыха разарвала б мяне...

Круглагаловы зноў узяўся шукаць начлег. Убачыў нейкую нару, хацеў быў залезці ў яе, але норка была маленькая.

— Цікава, а хто тут такі маленькі жыве, яшчэ меншы за мяне?

І ў гэты ж момант убачыў, як мышка стрымгалоў забегла ў сваю норку.

— Глядзі, як хутка яна заляцела. Вельмі мне патрэбна твая норка!

Па дарозе Круглагаловы ўбачыў яшчэ адну нару.

Там нікога не было.

— Вось, гэта тое, што трэба,— сказаў Круглагаловы і залез у нару. Тут было цёпла і ўтульна.— Адсюль я ўжо не пайду!

Праз некаторы час прыйшоў гаспадар нары — Барсук.

— Гэй, хто залез у мой дом? Ану, хутчэй выбірайся!

Круглагаловы закрычаў у адказ страшным голасам:

— Прэч адсюль, інакш разарву на шматкі!..— а сам аж задрыжаў ад страху.

— Куды ж мне ісці? — заенчыў Барсук.— Гэта мой дом.

Круглагаловы адчуў, што Барсук напалохаўся.

— Нікуды я адсюль не пайду. А ты ідзі і знайдзі сабе другую нару.

— Мне не трэба чужая нара, я хачу ў сваю.

— Калі ты зараз жа не знікнеш з маіх вачэй, я з'ем цябе!.. Мы, лісіцы, жартаваць не любім.

Пачуўшы гэта, Барсук з плачам пайшоў да сваіх сяброў. Раззлаваліся барсукі, яны сказалі:

— Не, гэтага так пакідаць нельга, трэба адвучыць лісінае племя ад дурной звычкі займаць чужыя норы.

Барсукі ўзброіліся хто чым і пайшлі да нары, дзе сядзеў Круглагаловы. Убачыўшы іх, ён зразумеў, што яму не мінуць ліха. Круглагаловы выскачыў з нары і задаў лататы.

ВЕРБЛЮДЗЯНЯ

Я верблюдзяня. Дзіця вярблюдзіцы. Мама вельмі любіць мяне. Заўсёды, калі я кладуся спаць, яна кажа:

— Дзіця маё роднае, заплюшчы вочкі.

Я пытаюся:

— Навошта, мама?

А яна адказвае:

— Няхай і вочкі твае паспяць.

Я пытаюся:

— Мама, а калі не заплюшчыць вочы, яны не спяць?

Маці адказвае:

— Вядома, не спяць.

Я кажу сам сабе: «Мабыць, вочы адпачываюць у цемры. Калі цёмна, яны засынаюць.

Калі заплюшчыш вочы, дык робіцца ж цёмна-цёмна».

Альбо маці кажа:

— Родны мой, еш, еш, інакш аслабееш, у цябе не будзе сілы.

Я адказваю:

— Не, мамачка, я не аслабею, у мяне ж вунь які тоўсты горб.

Маці смяецца, ківае галавой і нічога не адказвае.

Аднойчы я вельмі моцна захварэў. Маці плакала, жалілася суседзям-вярблюдам:

— Святло вачэй маіх, сыночак мой захварэў. Дапамажыце, добрыя суседзі, уратуйце маё дзіця!..

Ледзь варушачы ад гарачыні губамі, я супакойваў яе:

— Не хвалюйся, мама. Нічога са мной не здарыцца. Усё будзе добра.

Маці адказвала:

— Хаця б усё было добра, сыночак.

Маці паклікала майго сябра-верблюдзяня, каб ён быў побач са мной, гэта значыць, каб я не сумаваў.

— Ты захварэў, не можаш нават пагуляць са мной,— сказаў сябар.

Ён прынёс лекі.

Я закруціў галавой:

— Не магу я праглынуць лекі, горла ў мяне распухла.

Сябар адказаў:

— Не, ты павінен праглынуць, інакш ніколі не паздаравееш.

Ён стаў перад люстэркам і пачаў строіць грымасы, хацеў, відаць, мяне рассмяшыць. Я, смеючыся, сказаў:

— Гэй, верблюдзяня, якія ў цябе нязграбныя вушы.

— Вушы для таго, каб слухаць і чуць,— адказаў з гонарам ён,— а прыгожыя яны ці не, гэта ўжо не так і важна.

Потым дадаў:

— Я вельмі прагаладаўся, давай разам паядзім.

— Не,— адказаў я,— есці я таксама не магу.

— Правільна кажа твой сябар,— узрадавалася маці.— Трэба абавязкова што-небудзь з'есці, інакш зусім аслабееш.

— Не, не аслабею.

— Слухайся маці, паеш,— падтрымаў яе і мой сябар.

Але есці я не мог, бо горла зусім распухла.

— Паглядзі, які смачны абед маці згатавала,— пачаў угаворваць мяне сябар.— Не трэба нават жаваць, толькі каўтай.

Я паспрабаваў пракаўтнуць, але нічога з гэтага не выйшла. Маці пачала рабіць мне масаж горла.

— Не бойся, дзіця маё, не бойся, ты прастудзіўся, гэта пройдзе.

Сябрук зноў прынёс лекі, я выпіў іх.

Маці ўзрадавалася:

— Добры сябар заўсёды дапаможа ў цяжкую хвіліну. У цябе, сынок, сапраўдны сябар.

Так прахварэў я з тыдзень. Нарэшце горла маё перастала балець. Праўда, за гэты час я зусім аслабеў, нават на ногі не мог падняцца.

Маці сказала:

— Дзіця маё, ты вельмі схуднеў, але не думай пра гэта. Будзеш есці добрую, спажыўную ежу і хутка паправішся, набярэшся сілы.

Я падышоў да люстэрка і аж аслупянеў ад

нечаканасці. Уявіце, я не пазнаў самога сябе. Горб, мой прыгожы, мой цудоўны горб некуды знік.

— Мама,— закрычаў я ў роспачы,— хто ўкраў мой горб?!

Прыбегла маці:

— Што з табой, дзіця маё, чаго ты плачаш?

— Паглядзі на маю спіну, дзе мой прыгожы горб? Адна толькі скура вісіць!..

Маці засмяялася, хацела нешта сказаць, але я ўсё гаварыў і гаварыў:

— Я ведаю, гэта мой сябрук натварыў. Ён украў мой горб і пачапіў на сваю спіну. Цяпер я ўжо не падобны на вярблюда! Які ж вярблюд без гарба! Мне так падабаўся мой цудоўны горб!

— Дарагое маё дзіця,— засмяялася маці,— ці ж можна ўкрасці горб? Твой сябар нават і не дакрануўся да твайго гарба. Ты ж хварэў, нічога не еў, а жыў гэты час за кошт гарба. Мы, вярблюды, можам доўгі час абыходзіцца без ежы і вады, бо нас корміць і поіць наш горб.

У гэты час прыйшоў мой сябар-вярблюдзік, ён прынёс мне корм. Непрыкметна я паглядзеў на ягоны горб. Не, што б там ні казала маці, але мой горб украў ён. Адкуль жа ў яго такі вялізны?.. Але я не сказаў яму ні слова. Каб праверыць, ці праўду казала маці, я пачаў многа есці, некалькі разоў на дзень. І што б вы думалі? Мой горб пачаў расці, зрабіўся яшчэ большы, чым да хваробы. Выходзіць, мама не хлусіла.

Сябры мае, ведайце, маці заўсёды гаворыць праўду.

СЯБРОЎСТВА

Надвор'е было халоднае. Дрэвы агольваліся, скідвалі лістоту. І трава высахла, пажоўкла. Птушкі паляцелі ў вырай. Лес парадзеў, стаяў маўклівы. Яго жыхары, дрыжучы ад холаду, сабраліся разам і вялі размову.

Дзяцел сказаў:

— Работы для мяне больш не засталося, пачынаюцца канікулы. Не сёння-заўтра пойдзе снег, зіма апране дрэвы ў белае ўбранне, я ўжо больш не патрэбен, дрэвавых чарвякоў мароз сам знішчыць.

Заяц здзівіўся, ён заўсёды альбо палохаецца, альбо дзівіцца.

— Нешта я цябе не зразумеў, што гэта значыць — пойдзеш на канікулы? Ты ж лясны лекар!..

Дзяцел паглядзеў на Зайца:

— Эх ты, Касавокі!

Заяц загаварыў пісклівым голасам:

— Не называй мяне касавокім, я цяпер акуляры нашу, у мяне ў вачах больш не дваіцца.

— Добра, добра, не крыўдуй, Куртаты, няўжо ты не ведаеш маёй работы?

Заяц залыпаў вачамі.

— Ведаю, а як жа!

Але адчувалася, што Заяц кажа няпраўду. Дзяцел гэта зразумеў.

— Я дзяўбу кару дрэў, потым высоўваю язык...

— Язык?..

— Так, так, язык! Ён у мяне клейкі і доўгі. Як выцягну, дык усе чарвякі самі лезуць мне ў рот.

— Не, гэтага я не ведаў.

— Вось цяпер будзеш ведаць. Інакш, які ж для мяне быў бы сэнс цэлымі днямі дзяўбці дрэвы?

— Я думаў, у цябе такая звычка.

— А чаму ж тады мяне называюць лясным лекарам?

— Не ведаю.

— А таму, што я ачышчаю ад шкоднікаў дрэвы, не даю ім захварэць і загінуць. Зразумеў?

Заяц здзіўлена глядзеў на яго. Потым утаропіўся на дрэва, што стаяла побач з ім, каб убачыць шкодных чарвякоў. Але нічога не разгледзеў. Калі Заяц глядзіць зблізку, яго косыя вочы нічога не бачаць.

— Дзе ж тыя чарвякі?..

Дзяцел усміхнуўся:

— Калі цябе завуць Касавокім, ты крыўдуеш. Праўда, чарвякоў цяпер стала менш, але, прыгледзеўшыся, знайсці іх можна.

Вожык, які ўважліва слухаў іх размову, сказаў:

— Братка Дзяцел, ты праўду кажаш, твая работа скончылася. Цяпер трэба думаць пра зімовую вопратку. Гэй, Куртаты,— звярнуўся ён да Зайца,— паглядзі на сябе. Як жа ты будзеш зімаваць у сваім лінялым футэрку?

Дзяцел засмяяўся:

— Гэй, Касавокі!.. Прабач, прабач, калі ласка... Гэй, Куртаты, на каго ты падобны, чаму ты такі неахайны?!

— Чаму неахайны? Днямі памяняю сваё футэрка.

— Вай, вай, якая халадэча! Зусім змерзла, няма дзе схавацца!..

Усе ўбачылі Лісіцу. Згледзеўшы Даўгахвостую, Заяц перапалохаўся, адбег ад усіх,

схаваўся за дрэвамі, ужо адтуль пачаў пільна сачыць за Лісіцай.

Вожык сказаў:

— Праўду кажаш, Даўгахвостая, халадэча страшэнная. Давайце ўсе разам пабудуем дом. Перанясем туды нашы прыпасы і перазімуем.

Заяц, які вельмі баяўся Лісіцы, хацеў запярэчыць Вожыку, але не адважыўся. Дрыжучы ад страху, ён прыслухоўваўся да размовы.

— Цудоўная ідэя,— згадзілася Лісіца,— але мы, лісіцы, не ўжываем вашу ежу. Мы звычайна ядзім курэй, куранят, птушак і зайцаў.

Калі Заяц пачуў сваё імя, душа яго ў пяткі ўцякла. Ён пабег і зашыўся ў кусты.

Нават Дзяцел спалохаўся, мацней учапіўся за галіну, на якой сядзеў.

— Ежай зоймемся потым, цяпер трэба пра дом падумаць,— сказаў Вожык і паглядзеў у той бок, дзе сядзеў Заяц. Але таго і след прастыў.

— Куртаты, дзе ты?

— Я ту-у-т! — заікаючыся, адказаў Заяц і высунуў галаву з кустоў.

— Што гэта з табой, чаго ты дрыжыш?

— Не-е, я про-ро-о-ста так,— Заяц не мог суняць дрыжыкаў.

— Ідзі збяры ўсіх звяроў, будзем дом будаваць.

— Мы не ўмеем дом будаваць, ён нам не патрэбен.

Вожык здагадаўся, каго так баіцца Заяц.

— І Мядзведзь будзе з намі. Ідзі заві зайцаў, а я пагавару з Мядзведзем.

Хітрая Лісіца незадаволена сказала:

— Навошта турбаваць Мядзведзя, ён ужо

да спячкі рыхтуецца. Я яго нядаўна бачыла, ходзіць сонны, нікога не заўважае...

— Усё ж пайду,— сказаў Вожык,— пагаманю з ім.

Валюхаючыся з боку на бок, Вожык пайшоў да Мядзведзя.

— Братка Мядзведзь, братка Мядзведзь, добры дзень!..

— Хто гэта мяне турбуе, спаць не дае? — Мядзведзь сонна паглядзеў вакол сябе.

— Гэта я, Вожык.

— Які яшчэ такі Вожык? А, гэта ты, ну што скажаш?

— Звяры просяць, каб ты дапамог дом пабудаваць, інакш замерзнем усе.

Мядзведзь гучна пазяхнуў і буркнуў:

— Няма мне калі дамы нейкія будаваць. Ёсць у мяне свая бярлога.

— Братка Мядзведзь, якая карысць з тваёй бярлогі: там і цёмна і холадна, сам ты нічога не ясі, адно лапу сваю смокчаш... Вясной прачнешся худы, аслабелы. Ты ж ніколі зімы не бачыў...

— Зіма, якая яшчэ зіма? Я вясну люблю. Выйдзеш у лес, вакол птушкі спяваюць, кветкі цвітуць, проста сэрца радуецца. Вось прыйдзе вясна, тады і пабудзіце мяне...

Зразумеў Вожык, што ніякай карысці ад Мядзведзя не будзе, і вярнуўся назад. Зайцы ўжо сабраліся. І Лісіца прывяла сваіх сябровак. Пайшлі яны шукаць зручную пячору.

Наперадзе ішоў Вожык, за ім — лісіцы, ззаду брылі зайцы.

Адна з лісіц шапнула на вуха сяброўцы:

— Я такая галодная, давай паласуемся заечынкай.

— Не, не, пакуль што нельга. Трэба трош-

кі пацярпець, рана ці позна ўсе яны нашымі будуць.

Нарэшце знайшлі невялікую пячору. Зайцы былі задаволены.

— Вельмі добрая, вельмі зручная пячора, усе змесцімся. А паненка Лісіца са сваімі сяброўкамі хай другую, яшчэ лепшую за гэту знойдзе. Тут жа месца ўсім не хопіць.

Даўгахвостая вельмі раззлавалася, пачуўшы гэтыя словы:

— Чаму гэта не хопіць? Мы ж усе разам шукалі і знайшлі гэтую пячору.

А потым, спахапіўшыся, лагодненька так паглядзела на Зайца і салодкім галаском дадала:

— Зайчыкі трошкі пацясняцца, месца ўсім нам і хопіць.

— Але ж, дарагая Лісічка,— баязліва заўважыў Заяц,— адзін твой цудоўны хвост колькі месца займае...

Ледзь стрымліваючы сябе, Лісіца адказала:

— Ну, што ты, любенькі Зайчык,— пяшчотна пагладзіла свой хвост,— майму хвасту не трэба асобнае месца. Я накрыю цябе хвастом, як коўдрай, і табе будзе мякка і цёпла.

Вожык сказаў:

— Хопіць табе, Даўгахвостая, нахвальваць свой хвост. Давайце зойдзем у пячору, праверым, ці сапраўды ўсе мы там размесцімся.

Першыя ўвайшлі лісіцы, але колькі яны ні ціснуліся, усім месца не хапіла.

— Праўду казаў Куртаты,— пачухаў патыліцу Вожык,— трэба вам, паненкі лісіцы, шукаць іншае месца.

Лісіцам нічога не заставалася, як згадзіц-

ца. Яны выйшлі з пячоры і пачалі шаптацца.

— Што ж нам цяпер рабіць? Такі зручны выпадак, столькі зайчаціны!..

— Няхай яны збіраюць свае запасы на зіму. Потым, калі яны зусім супакояцца, нападзем на іх і з'ядзім усіх да аднаго!..

Лісіцы так захапіліся размовай, што і не заўважылі, што над імі, на дрэве, сядзіць Сарока і ўважліва слухае. Пакуль лісіцы змаўляліся, Сарока расказала Вожыку пра хітрую задуму лісіц.

— Я ўсё думаю, чаго яны гэтак доўга шэпчуцца? Дзякуй табе, сястрыца Сарока,— інакш бы нашы зайцы трапілі на зубы гэтым хітрунам.— Потым сказаў, звяртаючыся да зайцаў: — Паглядзіце добра, ці ёсць яшчэ адзін выхад з пячоры?

Заяц спытаў:

— А навошта нам яшчэ выхад?

— Калі ёсць, дык можна будзе ўцячы адсюль, выратавацца!

Пачалі зайцы заўзята абшукваць пячору. Нарэшце адзін з іх знайшоў адразу аж два выхады — як пралезці зайцу.

Вожык узрадаваўся:

— Ну, цяпер лісіцы застануцца з носам!..

Неўзабаве падышла Даўгахвостая і лісліва прамовіла:

— Мы згодны, няхай гэтая пячора застанецца нашым добрым сябрам зайцам. А мы размесцімся каля пячоры і будзем вас вартаваць ад розных драпежнікаў.

Тады Вожык сказаў:

— Заходзьце, браткі Зайцы, у пячору, цяпер нам ніхто не страшны! Сяброўкі лісіцы будуць надзейна вартаваць!..

А сам непрыкметна падаў знак зайцам,

каб яны хутчэй выбіраліся з пячоры праз запасныя выхады.

Убачыўшы, што Лісіца хоча таксама ўвайсці ў пячору, Вожык стаў каля ўвахода.

— Гэй, Даўгахвостая, куды лезеш?!

— Хачу паглядзець, ці добра ўладкаваліся нашы зайчыкі.

— Яшчэ рана, паспееш.

Хітрая Лісіца падміргнула сваім сябрам: маўляў, не спяшайцеся, нікуды цяпер яны ад нас не ўцякуць.

Калі апошні Заяц выбраўся праз запасны выхад, Сарока падала знак Вожыку. Той адышоўся ўбок і сказаў:

— Вось цяпер, дарагія лісічкі-сястрычкі, заходзьце! Вашы сябры запрашаюць вас!

Лісіцы адразу ж убеглі ў пячору, але там ужо нікога не было. Падманутыя, галодныя, яны накінуліся на Вожыка. Але той чакаў нападу. Як бачыш схаваў галаву і лапкі і натапырыў ва ўсе бакі свае вострыя іголкі. Лісіцы пакруціліся вакол яго, але ні адна не адважылася і блізка падысці. Звесіўшы насы, лісіцы падаліся прэч. Няўдалае выйшла паляванне.

Сарока задаволена сказала:

— Вялікі дзякуй табе, братка Вожык, твая разумная парада выратавала гэтых бедалаг-зайцаў.

Вожык адказаў:

— І табе вялікі дзякуй, сястрыца Сарока, і твая дапамога была немалой. Дрэнныя былі б нашы справы, калі б мы так хораша не сябравалі.

ПЛАКСІВАЕ КАЗЛЯНЯ

У адной вёсцы, што стаяла на ўскраіне вялікага лесу, жыло маленькае плямістае, вельмі гуллівае Казляня. Цэлыя дні яно бегала і скакала па гарах і пагорках. Маці Каза любіла сваё дзіцятка і нікому не давала яго ў крыўду. Вось толькі была ў вясёлага, гарэзлівага Казляняці адна кепская звычка. Кожную раніцу, не паспеўшы як след прачнуцца, Казляня пачынала плакаць. Колькі ні суцяшала яго маці Каза, як ні лашчыў бацька Казёл, нічога не памагала. Такое ўжо плаксівае Казляня!..

Аднойчы, прачнуўшыся, Казляня, як звычайна, пачало плакаць. І маці Каза, як звычайна, запыталася:

— Ну, чаго ты плачаш?

Казляня заплакала яшчэ мацней і нічога не адказала, бо і само не ведала, чаго яно плача.

І тады маці Каза сказала:

— Я ведаю, чаму ты плачаш!

Казляня раптам зацікавілася:

— А чаму я плачу?

— Бо калі прачынаешся, дык устаеш з левай нагі.

— Як гэта я ўстаю з левай нагі? — Казляня больш не плакала.

— Разумееш, калі хто, прачнуўшыся, устае з левай нагі, ён адразу і сам злуецца, і ўсім псуе настрой.

Казляня паціснула плячыма:

— Я не ведаю і не разумею гэтага.

— Вось заўтра раніцай, як прачнешся, паглядзі ўважліва, з якой нагі ты ўстаеш.

Казляня ўвесь дзень гуляла, бегала, скакала па скалах і з нецярплівасцю чакала ве-

чара, надта ж хацелася праверыць матчыны словы.

Усю ноч Казляня спала неспакойна. Нарэшце надышла раніца, светлая, прыгожая! Сонечны прамень казытнуў Казляняці пыску. Казляня адплюшчыла вочы і адразу ўспомніла словы маці.

— Ай, як добра, што я ўспомніла! — Казляня хуценька ўскочыла на правую нагу і... плакаць зусім не захацелася.

Казляня пабегла да маці.

— Мама, мама! Ты праўду казала, я сёння ўстала з правай нагі і мне не хочацца плакаць!

Маці Каза ўзрадавалася:

— Малайчына! Калі ты не плачаш, ты такое прыгожае!..

З таго дня ніхто не бачыў, каб Казляня плакала.

Аднаго разу, калі Казляня бегала сярод скал, яно сустрэлася з Ваўком. Той ад нечаканасці спыніўся, уважліва паглядзеў на маленькую істоту: «На адзін зуб не хопіць!» — падумаў Воўк. А Казляня падумала: «Чаму ён гэтак злосна на мяне пазірае?»

— Дзядзечка Воўк, а вы ведаеце, чаму вы такі злосны?

— Што? — не зразумеў Воўк.

— Мусіць, ваша мама вам не гаварыла. Хочаце, я вам раскажу?

Воўк усміхнуўся:

— Ну, ну, раскажы, чаму я гэтакі злосны!

— Ды таму, дзядзечка Воўк, што раніцай вы ўсталі з левай нагі, а трэба ўставаць з правай.

Воўк спярша нават разгубіўся, але потым усё ж скеміў, што да чаго, і сказаў:

— Якое ты разумнае Казляня! Хто цябе гэтаму навучыў?

Казляня дужа любіла, калі яго хвалілі, і адказала:

— Дзядзечка Воўк, і я быў гэтакі ж злосны, як і вы. Мама казала, што ёй брыдка на мяне глядзець.

— Што, што ты сказаў? Табе брыдка на мяне глядзець?

— Не, не, гэта мама пра мяне казала, але, з таго часу як я пачаў уставаць з правай нагі, усё змянілася, цяпер я ўвесь час усміхаюся. Ме-е-е!..

Воўк падумаў сам сабе: «Колькі дзён цярплю голад. Што мне гэты заморак. Спярша з'ем ягоную маці, а яго потым, на закуску».

— Скажы, калі ласка, дзе жыве твая маці?

— У вёсцы, у самым крайнім двары.

— Ты пачакай мяне тут, нікуды не адыходзься. А я пайду да тваёй маці, запытаюся, ці праўду ты казаў пра правую нагу. Калі гэта сапраўды так, дык заўсёды буду ўставаць гэтак жа.

Воўк пайшоў, а дурненькае Казляня скубла маладую траўку і чакала яго.

Сарока-белабока, якая чула іхнюю размову, паспела паведаміць пра ўсё гэта маці Казе, папярэдзіла ўсіх вясковых сабак, вярнулася да Казляняці і схавалася разам з ім у лесе.

А на Ваўка, ледзь толькі ён з'явіўся ў вёсцы, наляцелі з усіх бакоў вялізныя сабакі. Воўк даў такога драпака, што і ног пад сабой не чуў. А калі апамятаўся трохі, пабег на тое месца, дзе пакінуў Казляня. Не знайшоў Воўк малога, заскрыгатаў ад злосці зубамі і паплёўся куды вочы глядзяць.

ГОРКІ КУСТ АЖЫНЫ

Куст Ажыны яшчэ з вясны пачаў даглядаць свае лісткі, усяляк берагчы іх, ахоўваць. Пойдзе, напрыклад, дождж, ён адразу ж выстаўляе свае галінкі пад жыватворныя кроплі, змывае пыл з лісткоў.

— Сусед, што гэта ты так рана пачаў умывацца? — здзіўлена запыталася дзікае Дрэва Алычы.

Куст Ажыны засаромеўся і ціха адказаў:

— Ведаеш, я люблю акуратнасць, мне падабаецца, калі мае лісткі блішчаць, вось як цяпер. Паглядзі, усе пазіраюць на мяне з зайздрасцю. Відаць, усім хочацца мець лісцікі, як у мяне.

Дрэва Алычы ўсміхнулася і больш нічога не сказала. Куст Ажыны быў яшчэ зусім малады. У гэтым годзе ён упершыню павінен быў даць плады і вельмі хваляваўся.

Аднаго разу Дрэва Алычы ўбачыла на Кусце Ажыны маленькія зялёныя кропачкі. Радуючыся, яно сказала:

— Я віншую цябе, сусед! У цябе такія цудоўныя плады!

Пачуўшы гэтыя словы, Куст Ажыны пачаў разглядаць сябе. Увесь ён зверху быў прыбраны ў маленькія гузічкі.

— Якія, і праўда, цудоўныя плады! — з гонарам прамовіў Куст Ажыны.— Як добра, што вы нарэшце з'явіліся. Яшчэ б трошкі, і сэрца маё не вытрымала б!..

Маленькія зялёныя гузічкі паціху загайдаліся. Навакольны свет, дзе так многа сонечнага святла, ім вельмі спадабаўся.

Для Куста Ажыны пачаліся поўныя клопатаў дні. Як толькі прачнецца, так з ранку і

да вечара працуе без перапынку. Маленькія карэнні паглыбляюцца ў зямлю, смокчуць яе сокі. Зялёныя гузічкі паружавелі. Кожную сваю галінку Куст Ажыны падстаўляе сонечным промням.

— Дзякуй табе, Сонейка! — кажа ён.— Без цябе няма жыцця!

Калі Сонца хоць на якую гадзінку схаваецца за хмары, Куст Ажыны сумуе, маркоціцца.

— Чаму не відаць Сонейка? Навошта хмары засланілі яго цудоўны твар? Што цяпер рабіць? Мае ж плады пазбаўлены жыватворных промняў! Ці ж гэта справядліва?

Усміхаюцца суседзі — Кусты і Дрэвы, супакойваюць:

— Не журыся, Сонца хутка з'явіцца.

Так міналі дні. Гузічкі Ажыны наліваліся сокам, паступова чарнелі.

Аднойчы Дрэва Алычы сказала:

— Малайчына, Ажына, праца твая была недарэмнай. Плады твае такія буйныя, сакавітыя. Усе, хто пакаштуе іх, скажуць табе дзякуй.

Куст Ажыны спалохаўся гэтых слоў, занепакоена сказаў:

— Як гэта будуць каштаваць мае плады? Нікому не дазволю, чуеце, нікому! Гэтага яшчэ не хапала!..

Куст Ажыны апусціў свае галінкі з ягадкамі ўніз, схаваў іх. Сэрца яго напоўнілася трывогай і хваляваннем.

Надышоў канец лета. Прыйшлі ў лес людзі збіраць ягады і плады. Убачыўшы гэта, Куст Ажыны выставіў свае калючкі і калоў усіх, хто блізка падыходзіў да яго. Плады так і засталіся некранутымі.

Надышла восень. Лісце дрэў пажаўцела. Плады з іншых кустоў ажыны, што раслі ўздоўж дарогі, былі сабраны. Уздыхнуўшы з палёгкай, кусты пачалі рыхтавацца да зімы. Іх агарнуў салодкі сон, яны адпачывалі.

А Куст Ажыны ўсё ахоўваў свае плады. Убачыўшы, што ўсе яго браты вызваліліся ад сваіх ягад, не вытрываў і спытаў у Дрэва Алычы:

— Ніяк не магу зразумець, навошта яны так лёгка і неабдумна раздалі свае ягады. Іх жа так цяжка было расціць?!

— А што ж ім было рабіць? Хіба ж яны вырошчваюць ягады для сябе? Я таксама раздала свае плады.

— Не, не, я не разумею, як гэта, навошта?

— Паглядзі вакол. Восень прыйшла! Усе мы вызваліліся ад сваіх пладоў, усю зіму будзем спаць пад снежнай коўдрай. А ўвесну прачнемся, зноў заквітнеем, зноў прынясем плады, раздадзім іх людзям. Няма большага шчасця на свеце!

— Як сабе хочаце, а я свае ягады не збіраюся нікому аддаваць! Гадуеш іх, гадуеш, а нехта прыйдзе на гатовенькае і забярэ! Не бачу ў гэтым ніякага шчасця!..

— А што ж ты збіраешся рабіць?

— Прыціснy іх да грудзей, буду трымаць у сваіх абдымках!

Дрэва Алычы засмяялася:

— Ты ж іх усё роўна не ўтрымаеш. Пачнуцца халады, плады твае зробяцца чорныя-чорныя, скурчацца, высахнуць і пападаюць на зямлю. Ды яны пачалі ўжо асыпацца, паглядзі!

— Не, не, яны не асыпаюцца,— пакрыўджана адказаў Куст Ажыны,— яны ніколі не

скурчацца і не высахнуць. Сваім дыханнем я сагрэю іх.

Дрэва Алычы больш нічога не сказала.

Мінула восень, надышла зіма. Халодны вецер закруціў лістапад. Колькі ні стараўся Куст Ажыны, але ўтрымаць сваё лісце не здолеў. Галінкі яго агаліліся. Засталася надзея на калючкі. Але ў іх ужо не было работы, не было каго калоць. Ягады пачарнелі, скурчыліся, зусім высахлі.

— Вай, вай, што зрабілася з маімі прыгожымі, роднымі пладамі? Няўжо прастудзіліся? Дарагія суседзі, дапамажыце маім ягадам! Я загіну ад гора, не вытрымаю!..

— Чаму не спіць гэты Куст Ажыны? — забурчалі дрэвы ў лесе.— Сціхні, не перашкаджай нам спаць!

Спалохаўся Куст Ажыны, скурчыўся. Дрэва Алычы прашаптала:

— Не бойся, суседзе. Я ж табе казала, што час тваіх пладоў скончыўся, яны павінны былі высахнуць і асыпацца на зямлю. Трэба было рабіць, як гэта зрабілі іншыя ажынавыя кусты — раздаць свае ягады птушкам, людзям...

Нарэшце і да Куста Ажыны прыйшоў зімовы сон. Засынаючы, ён раптам пачуў цырыканне вераб'ёў.

— Цырык-цырык, шкада, што яны павысыхалі.

— Цырык-цырык, проста злосць бярэ! — гаварылі яны пра рассыпаныя пад Кустом Ажыны ягады.

— Цырык-цырык, пры нашым голадзе і гэтыя з'есці можна.

— Вай-цырык, якія яны горкія!..

— Нічога не зробіш, голад не цётка...

ЗАЯЦ-ПАДАРОЖНІК

Пястун дамчаў да кустоў, запоўз у самы гушчар і прыціснуўся да зямлі. Сэрца яго ад страху гатова было выскачыць з грудзей. Калоціцца касавокі, дрыжыць куст, пад якім ён ляжыць.

Варона ўбачыла задыханага зайца, уважліва агледзела ўсё наўкол. Хіба хто гнаўся за небаракам? Але нідзе нікога не было. Варона са смехам села на куст, пад якім схаваўся касавокі. Пястун з перапуду аж падскочыў, а потым ціхенька, прытуліўшы вушы да спіны, адпоўз пад другі куст.

Варона пашкадавала зайца, яна ўжо больш не смяялася з яго. Хіба ж можна смяяцца з чужой бяды?

— Чаго ты гэтак, зайчык? Каго напалохаўся, нідзе ж нікога няма? Не трэба быць такім баязліўцам.

Варона ўзляцела на высознае дрэва.

— Супакойся, калі будзе якая небяспека, я табе адразу гукну. Паглядзі, як высока я сяджу, вочы мае бачаць далёка.

Пястун, заікаючыся, адказаў:

— Вя-лі-кі вам дзя-куй, цё-тачка Кар-Кар.

— Мяне завуць Чарнушка.

— Ой, якое прыгожае імя! А мяне — Пястун. Такое імя дала мне мама.

—Вось мы і пазнаёміліся. Дык раскажы мне, Пястун, чаго ты гэтак напалохаўся?

— Ведаеце, цётачка Чарнушка, я ляцеў сюды на самалёце. Высока-высока!..

— Паглядзіце на яго,— узлавалася Чарнушка,— такі малы, а ўжо хлусіць навучыўся!

— Ды не, цётачка, не хлушу, я ж не з гэтых мясцін, мяне сюды людзі прывезлі.

— Няўжо на самалёце?

— Ага, ага, на сапраўдным самалёце. Мы з мамай жылі зусім у іншым лесе. Перад нашым домам быў цудоўны лужок, зялёны-зялёны!.. У той дзень ранічкай я, як заўсёды, выбег на лужок. Мама сказала: «Пястун, сыночак, не адыходзься далёка». А я не паслухаўся і пабег куды вочы глядзяць. Бег, бег, аж пакуль не адчуў, што наляцеў на нешта. Падняў галаву, агледзеўся і зразумеў: гэта ж я ў сетку трапіў!.. Хацеў выбрацца з-пад яе, ды заблытаўся яшчэ больш. Напалохаўся, заплакаў, пачаў маму клікаць: «Мамачка, родная, вызвалі мяне адсюль!..» Мяне выцягнулі з той сеткі і пасадзілі ў скрыню.

Пястун горка заплакаў. Чарнушка сказала:

— Не плач, даражэнькі, ты ж цяпер на волі. Ну, а што было далей?..

— Я таму плачу, што маму шкада. Яна за мною пабегла, і яе таксама злавілі.

— Адкуль ты пра гэта ведаеш, ты ж у скрыні сядзеў.

— Я праз шчыліны ўсё бачыў. Маму пасадзілі ў другую скрыню. Тады шмат зайцаў злавілі.

— Я, здаецца, пачынаю сёе-тое разумець,— задумліва прамовіла Чарнушка.— Ну, расказвай, а што з вамі было потым?

— Скрыні пагрузілі ў самалёт, мы доўга ляцелі, затым зноў апынуліся на зямлі. Скрыні выцягнулі з самалёта. Раптам скрыня адчынілася, і я, доўга не думаючы, даў такога драпака, што вось толькі тут, пад гэтым кустом, трохі і апамятаўся. Сам дзіўлюся, які я адважны!..

Чарнушка засмяялася:

— Цяпер усё зразумела. Ты не ўцёк, цябе людзі самі выпусцілі на волю.

— Як самі выпусцілі? — здзівіўся Пястун.— Спярша злавілі, а потым вызвалілі? Навошта?..

— Я табе зараз растлумачу. Гэты лес, дзе мы з табой цяпер знаходзімся, зусім малады. Тут яшчэ вельмі мала птушак і звяроў. А які ж гэта лес без сапраўдных яго жыхароў?! Вось і я вырашыла тут пасяліцца. Паглядзі, як хораша наўкола! Хадзем, Пястун, я памагу табе знайсці маму, будзем разам абжываць наш новы зялёны дом!..

ХАЗРЫ

Ноччу Хазры адпачываў, схаваўшыся сярод густых галін раскідзістага стогадовага дуба, аглядаў наваколле, ахутанае святлом месяца. Небасхіл паступова святлеў. Чорныя хмары на гарызонце, убачыўшы Сонца, пачырванелі.

— Сонца ўзыходзіць! Вунь, зірніце! — пераклікаліся яны.

Сонца з усмешкай на твары выглянула з-за гор і прагнала змрок. Велічныя горы, стромыя скалы, раўніны, упрыгожаныя кветкамі, цяністыя лясы, крыніцы — усё гэта быццам толькі-толькі нарадзілася на свет пад промнямі сонца.

Вецер агледзеў усё навокал і засмучана сказаў:

— Заўсёды ў гэтай Прыроды нейкія дзівацтвы! Проста зайздрасць бярэ. Вунь гара ўзвышаецца, дрэвы зялёныя — усе іх бачаць. Нават сябры мае, снег і дождж, калі ідуць,— іх таксама відаць. Толькі мяне ніхто

не бачыць! Чаму такая несправядлівасць?

Дуб, пачуўшы яго, здзіўлена сказаў:

— Хазры, ты памыляешся. Вось і цяпер ты схаваўся ў маіх абдымках, варушыш маё лісце, кожны лісцік у далонькі пляскае. І ўсе ведаюць, што гэта твая работа.

— Гэта праўда, я прымушаю дрыжаць тваё лісце. А калі злуюся, магу і галіны твае паламаць. Але я, як і ты, вельмі хачу, каб мяне ўсе бачылі.

— Ты бачны ўсім. Узнімаеш лістоту ў неба, і ўсе разумеюць, што ляціць яна з тваёй дапамогай.

Лісце дуба загаманіла:

— Праўда, праўда. Мы любім Хазры, ён дае нам крылы, нясе нас у неба. А неба вельмі прыгожае, шырокае, глыбокае.

Хазры сказаў:

— Ды не, вы мяне не зразумелі! Я хачу, каб мяне бачылі, каб дзеці гулялі са мной!

Дуб на гэта прапанаваў:

— Хочаш гуляць з дзецьмі, дык ідзі да іх, ніхто ж табе ўпоперак дарогі не стаў.

— Дзеці ўцякаюць ад мяне,— засмуціўся Хазры.

— Не ўцякуць. Яны возьмуць цябе ў свае гульні.

Хазры ўзрадаваўся і паляцеў. Ляцеў, ляцеў і сеў на дах, паглядзеў на вуліцу, дзе гулялі дзеці, сказаў сам сабе:

— Якія прыгожыя дзеці, яны падобны на матылькоў!

Ён раптам завыў і падляцеў да дзяцей, узняўшы з зямлі хмары пылу, ажно цёмна зрабілася.

— Вай, які моцны вецер, зноў гэты Хазры!..— закрычалі дзеці.

— Як наляціць, дык ад пяску і пылу вочы слепнуць!..

— Ніколі не дасць пагуляць добра!..

Хазры хацеў сказаць: «Чаму ж вы так, дзеці? Што я вам благое зрабіў? Вазьміце і мяне ў сваю гульню!..» — Але не паспеў, бо дзеці разбегліся па хатах.

Пакрыўдзіўся Хазры і паляцеў далей. Убачыў, што на правадах сядзяць вераб'і, шмат вераб'ёў. Хазры хацеў падсуседзіцца да іх, сесці побач, пагаманіць з птушкамі. Але на вераб'ёў павеяла яго халодным дыханнем, шаўковыя пёркі іх натапырыліся. Вераб'і загаманілі:

— Чык-чык, Хазры прывалокся.

— Чык-чык, як холадна.

— Чык-чык, адубець можна.

— Чык-чык, давайце паляцім у свае гнёзды.

Калі вераб'і разляцеліся, Хазры сказаў сам сабе:

— Дзіўна, што з імі здарылася? Эх, баязліўцы! Я хацеў з імі лятаць навыперадкі. Лайдакі!..

Хазры апусціўся на зялёнае поле. Яно адразу захвалявалася, і па ім, быццам па моры, пабеглі хвалі. Птушкі, якія пахаваліся ў зялёнай ніве, паразляталіся хто куды. Поле сказала:

— Дарагі Хазры, якое халоднае тваё дыханне!

Хазры здзівіўся:

— Як ты мяне пазнала, мяне ж ніхто не бачыць?

— Па халодным дыханні, пазнала па капрызных учынках тваіх. Прашу цябе, ідзі адсюль, бачыш, як хвалююцца каласы і кветкі?!

— Добра,— памякчэў Хазры.— Я пайду. Калі засумуеш, пакліч мяне.

— Добра, паклічу!

Хазры падаўся ў горы. Маленькае сяло прытулілася да падножжа вялікай гары. Хазры доўга назіраў за гэтым сялом, а потым сказаў сам сабе: «Не варта сюды апускацца, у такіх горных сёлах нам, вятрам, ніколі не стае сапраўднай прасторы».

Хазры памчаўся далей. На шырокай раўніне ён павырываў кусты перакаці-поля і пагнаў іх паперадзе сябе. Закруціліся яны ваўчком, пачалі наракаць:

— Адкуль з'явіўся гэты злосны Хазры?..

— Куды ён гоніць нас?..

Пакрыўдзіўся Хазры, ён жа сам не ведаў, што вытварае.

«Што ж гэта робіцца? — журботна думаў ён.— Да каго я ні падыду, нікому гэта не падабаецца. Я ж такі, як і маленькія дзеці, мне гуляць хочацца!..»

Сонца ўзнялося высока-высока. Ад дзённай спякоты смылела высахлая зямля, не было чым дыхаць. Людзі скардзіліся адзін аднаму: «Што за гарачыня, а тут яшчэ гэтыя камары таўкуцца! Нам тут, на беразе Каспія, яшчэ няблага. А як тым, што ў горадзе засталіся?..»

Нехта з дзяцей залез на фігавае дрэва і пачаў клікаць Хазры. Калі Хазры пачуў сваё імя, ён спярша не паверыў сваім вушам, а потым угледзеў хлопчыка і, узрадаваны, кінуўся да яго. Хлопчык ад нечаканага парыву ветру ледзь з дрэва не звалiўся.

— Вай, вай! — закрычаў хлопчык.

Але Хазры яго не пачуў. Сваім халодным дыханнем Хазры астудзіў распаленую зямлю.

Людзі сказалі:

— Як добра, што ёсць Хазры. Вось толькі шкада, што шмат ад яго пылу.

І пачалі хутка зачыняць дзверы і вокны.

Хазры ўжо не мог спыніцца: накінуўся на кусты, пачаў абрываць лісце з дрэў, шкуматаў кветкі... І ўвесь час ён незадаволена бурчаў:

— Нічога не магу зразумець. Толькі што самі клікалі мяне, а не паспеў з'явіцца, адразу зачынілі перада мной вокны і дзверы.

ДЗІВОСНЫ МЯШОК

Нарадзіла маці Кенгурыха дзіцятка, маленькае-маленечкае, не большае за напарстак. Асцярожна пагладзіла і сказала:

— Якое ты малюпасенькае! Як жа мне гадаваць цябе? Мусіць, не трэба нікому паказваць, яшчэ сурочаць, смяяцца будуць: «Паглядзіце, каго яна нарадзіла, зусім не відаць!..»

Маці Кенгурыха агледзелася па баках — наўкол нікога. Трохі супакоілася, пачала думаць, куды лепш схаваць сваё дзіцянятка. Спярша хацела схаваць яго пад пахай, але спахапілася, сцяміла, што малое можа і задыхнуцца там. Уважліва агледзела сябе. Позірк спыніўся на валасяным мяшку на жываце. Сунула туды лапу — там было цёпла і мякка. Яна і раней ведала пра свой валасяны мяшок, убачыла яго адзін раз, калі ў ваду глядзелася. Яшчэ падумала тады: «Навошта мне гэты мяшок? Трэба адрэзаць і выкінуць». А потым разважыла: «Не, няхай застаецца. Калі матухна Прырода дала яго мне, значыць, дзеля чаго-небудзь ён абавязкова спатрэбіц-

ца». Цяпер, успомніўшы, зарадавалася: «Ай, як добра, што захавала я свой мяшок. Пакладу ў яго сваё дзіцятка, яму там будзе ўтульна. Выкармлю малаком, і ў хуткім часе маё кенгуранятка вырасце і стане вялікім, добрым і дужым кенгуру!»

Так яна і зрабіла — паклала кенгуранятка ў свой валасяны мяшок. Дзіцяня ўладкавалася там, высунула галоўку, шырока расплюшчыла свае вачаняты, натапырыла свае маленечкія вушкі.

— Бачыш, якое цудоўнае месцейка я табе падрыхтавала,— сказала маці Кенгуру,— тут табе будзе мякка, цёпла і надзейна, ніхто цябе не кране.

Міналі дні. Маленькае кенгуранятка расло не па днях, а па гадзінах, рабілася вельмі падобнае на сваю маці. Яго пачалі прыкмячаць звяры і птушкі.

Неяк Лясны Певень, што сядзеў высока на дрэве, звярнуўся да маці Кенгурыхі:

— Гэй, суседка, ці не тваё гэта такое прыгожае дзіця?

— Вядома, маё,— адказала Кенгурыха, ласкава гледзячы на сваё дзіцятка: — Душа мая! Сэрца маё!

— Ведаеш, суседка, раней я думаў, што самае прыгожае дзіця ў мяне. Такое яно цікаўнае, увесь дзень пытанні задае, за ўсім назірае, усім цікавіцца. Зусім галаву мне затлуміла, няма часу, каб пра ежу падумаць. А яно, як прагаладаецца, такі вэрхал узнімае!..

На суседнім дрэве сядзела Малпа і крадком паглядала на іх. Яна ўжо даўно зайздросціла Кенгурысе: «Хіба ж можа такое быць? Купіла сабе недзе гэты мяшок, прывязала да жывата і гуляе сабе. Быццам яе дзіцятка з не-

ба звалілася, а маё з пацуковай нары выскачыла. Дзе ж яна прыдбала мяшок?»

— Суседка, а суседка!

— Хто гэта?

— Я, Малпа.

— Што добрае скажаш?

— Даўно хачу ў цябе запытацца, вось толькі саромеюся.

— Нешта я не разумею, чаго саромеешся?

— Усё хачу спытацца, дзе ты прыдбала гэты мяшок?

— Які мяшок?

— Ну, гэты, што прывязаны ў цябе да жывата. І я хачу купіць гэткі ж. Бачу, ён дужа аблегчыў твае клопаты. Бачыш, дзіця маё з мяне не злазіць, проста рукі мне звязала. Скажы, калі ласка, дзе мне купіць такі мяшок. Мы ж суседзі, не ўтойвай ад мяне.

Кенгурыха засмяялася, потым сказала:

— Гэты мяшок, суседка Малпа, не прадаецца. Разумееш, мы, кенгуру, нараджаемся разам з ім. Вы, малпы, нараджаецеся з доўгімі рукамі. Вось ты, скажам, адной рукой прыціскаеш дзіця да сябе, а другой хапаешся за галіны і скачаш з аднаго дрэва на другое. І ў дзіцяці твайго рукі ўжо вунь якія доўгія. Сядзіць на спіне і моцна за цябе трымаецца. А маё дзіцятка, паглядзі, якое маленькае і слабенькае. Калі б не мяшок, яно і не жыло б на гэтым свеце. А табе яшчэ і хвост памагае. Учэпішся ім за галіну і можаш вісець уніз галавой. Мой жа хвост ні на што не здатны.

— Чаму ж не здатны? Вунь сядзіш на ім, як у добрым крэсле.

Кенгурыха засмяялася:

— Тут, суседка Малпа, твая праўда. Добра на ім сядзець-адпачываць.

— Ну, дык дзе ж ты ўсё-такі купіла мяшок?

— Я ж кажу: ён нарадзіўся разам са мной.

Моцна пакрыўдзілася Малпа. Падумала: «Зайздросціць мне, таму і не прызнаецца. Ну, калі так, дык ноччу ўкраду я гэты мяшок. Будзе ведаць, як хлусіць высакародным звярам!..»

Чакае Малпа ночы. А Кенгурыха, як на тое ліха, класціся спаць не хоча.

«І чаму яна спаць не кладзецца? — злуецца Малпа.— Хіба яна свой хвост вартаваць збіраецца?»

Малпа ведала, што красці — нядобра. Але яна ўбіла сабе ў галаву, што без таго мяшка жыцця ёй ужо не будзе.

Нарэшце Кенгурыха заснула. Малпа імпэтна саскочыла з дрэва і падкралася да яе.

Узышоў месяц. Усё стала добра відаць. Малпа пачала ўважліва аглядаць мяшок, шукаць тое месца, дзе ён прывязваецца. А ён, і праўда, быццам прыляпіўся да жывата Кенгурыхі. Хацела Малпа адарваць мяшок, ды толькі дакранулася да яго, як Кенгурыха адразу ж прачнулася, санліва прамармытала:

— Хто гэта казыча мяне? Хто не дае мне спакойна спаць?..

Ніхто не адказаў. Кенгурыха паднялася, села на свой хвост, паглядзела наўкол. Нідзе нікога.

Малпа ледзь паспела ўцячы і схавацца ў кустах, што раслі паблізу.

Кенгурыха яшчэ трохі пасядзела, упэўнілася, што дзіця яе соладка спіць у мяшку, зноў легла і спакойна заснула.

ЧАРНАВОКІ

Хмары зацягнулі неба, і адразу пацямнела. Вось-вось пойдзе дождж. Звяры і птушкі, жучкі і казяўкі пахаваліся хто дзе. На лес апусцілася нейкая дзіўная цішыня. Усё жывое з хваляваннем чакала нечага незвычайнага.

Мураш-наезнік, ростам з прасяное зерне, узняўшы маленькую галоўку, клікаў мурашоў у іхні падземны гарадок: «Гэй! Хутчэй бяжыце і хавайцеся!»

І толькі адзін гарэзлівы чарнавокі мураш-забіяка не звярнуў увагі на гэты кліч і, зручна ўладкаваўшыся пад дрэвам, сказаў сам сабе: «Усе ўцякаюць... Баязліўцы!.. Я не стану хавацца ў мурашніку пад зямлёй. Застануся тут і на свае вочы пабачу страшнае. А потым прыйду ў наш падземны гарадок і ўсім раскажу пра ўсё, што ўбачыў. Няхай ведаюць пра маю адвагу».

— Паслухай, Чарнавокі, чаму ты не схаваўся?

Мураш паглядзеў угару. Да яго звяртаўся Дубовы Лісток.

— Я хачу пабачыць страшнае на свае вочы,— адказаў мураш і ўзлез на сухую сцяблінку.

— Малайчына,— пахваліў Лісток.— Толькі будзь асцярожны!..

У гэты момант пачуўся моцны грукат. Чарнавокі хацеў заткнуць вушы. Але ножкі ў яго былі занадта кароткія і не дацягнуліся да вушэй.

Яшчэ раз ляснуў пярун. Лес асвяціўся, у небе бліснула маланка. Сэрца ў мураша застукала: тук-тук, тук-тук, ножкі задрыжалі:

дрыг-дрыг, дрыг-дрыг. Але Чарнавокі стрымаў сябе: «Не бойся! Ты ж адважны мураш!..»

Пачаўся праліўны дождж. Буйныя кроплі лапаталі па лісці, быццам паўсюль білі ў вялізны бубен.

— Які цудоўны бубен, але мне зусім не хочацца танцаваць,— прамармытаў мураш.

Раптам буйная кропля скацілася з лістка і звалілася яму проста на галаву.

— Вай, вай, дапамажыце! — закрычаў Чарнавокі, апынуўшыся на зямлі. Яму здалося, што ён трапіў у мора — столькі вады было навокал.

— Дапамажыце! Таплюся, ратуйце!..

Учапіўшыся за саломінку, мураш круціў галавой ва ўсе бакі, але нідзе нікога не было.

— Ай, які ж я дурань, трэба было хавацца разам з усімі!

Потым сцішыўся, падумаў: «Раптам хто пачуе. Тады ніхто не паверыць у маю адвагу».

А дождж усё ліў і ліў, і канца яму, здавалася, не было. Бліскучыя кроплі, нібы дзівосныя завушніцы, упрыгожылі галіны дуба, яго зялёнае лісце. Вакол магутнага дрэва пад дажджом купалася маладая трава. А кветкі, напоўніўшы вадой свае піялы, з асалодай пілі гаючую вільгаць.

Зноў у небе пачуліся грымоты. Чарнавокі хацеў схавацца ў дупле дуба, але ногі ўжо не слухаліся яго.

— Ой, што са мною будзе? Не магу больш змагацца з гэтым дажджом. Мама, мамачка!..

Пашкадаваў дубовы лісток маленькага мураша, і калі вецер нахіліў галіну, лісток пяшчотна абгарнуў малога, і яны разам з галінкай падняліся высока ўгору.

— Паглядзі, Чарнавокі, як прыгожа наў-

кол! — сказаў Лісток.— Вось і сонейка паказалася з-за хмар. Дождж канчаецца.

— Дзякуй, вялікі дзякуй табе, добры Лісток. Апусці мяне на зямлю, я да мамы хачу!

Падзьмуў вецер, галінка нахілілася і дакранулася да зямлі. Чарнавокі саскочыў з лістка і пабег у свой мурашнік. Браты і сёстры, убачыўшы яго жывым і здаровым, акружылі Чарнавокага.

Пытанні сыпаліся з усіх бакоў:

— Дзе ты быў?

— Як добра, што ты жывы!

— Што ты там бачыў?

— Страшна было, мусіць, дужа напалохаўся?

Чарнавокі слухаў, слухаў і раптам, перапыніўшы ўсіх, з гонарам адказаў:

— Зусім і не страшна, зусім і не напалохаўся! Што я, баязлівец які?!

— Тады раскажы, што ты там наверсе бачыў.

— Усе разбегліся, пахаваліся, а я застаўся...

— Так, так, а потым?..

— Пачуліся страшэнныя грымоты, усё неба паласавалі агні. Цёмная хмара насунулася. Ну, я на яе і закрычаў: «Гэй, хмара, што гэта ты такі шурум-бурум усчала? Спыні зараз жа непарадак!»

Мурашы з павагай пазіралі на Чарнавокага і гаманілі:

— Бач, які смелы!

— Нават хмары не збаяўся!

— Вось якія мы, мурашы, адважныя!

А Чарнавокага ўжо цяжка было спыніць:

— Хмара не паслухалася. Кінула на мяне агонь. А я падскочыў і адкінуў той агонь га-

лавой убок. Не баюся твайго агню! Вось зараз падымуся ў неба і праганю цябе! Хмара зразумела, што не жартую, і паціхеньку, паціхеньку з неба і сышла. І тады на небе з'явілася сонейка.

— Дык гэта, выходзіць, ты спыніў дождж? — спытала старэйшая сястра.

— А ты як думаеш?

І вось тут, трохі апамятаўшыся, Чарнавокі зразумеў, што ён перабірае меру, што яго хлусні могуць не паверыць. І каб нейкім чынам выйсці з няёмкага становішча, ён раптам сказаў:

— Не прымушайце, калі ласка, мяне марна траціць час. Вы не ведаеце, дзе мая маці? Мне вельмі трэба хутчэй пабачыць яе.

І Чарнавокі хуценька шмыгнуў убок і згубіўся сярод мурашоў, што мітусіліся і бегалі туды-сюды.

Праўда, Чарнавокі перабольшваў, калі расказваў пра свой гераізм, і ўсё ж навальніцу ён, хоць і набраўся вялікага страху, пережыў, пабачыў на свае вочы грозную стыхію. Вось чаму яшчэ доўга ў падземным гарадку жыла легенда пра адважнага мураша, якога звалі Чарнавокі.

НУ, ЗАЯЦ, ПАЧАКАЙ ЖА!

Восень кранула халодным дыханнем лясы. І дрэвы змянілі зялёнае ўбранне на іншае, пашытае з жоўтай лістоты. Дзень за днём паціху распраналіся, з сумам скідаючы кожны свой лісток.

Весела напяваючы, скакаў па лесе Куртаты.

— Што такое? Чаму падае лісце? Дуб, чаму ты губляеш сваю лістоту, што здарылася?

Дуб расплюшчыў заспаныя вочы і ўбачыў Зайца.

— Чаго ты да мяне прычапіўся, чаму спаць не даеш? — незадаволена спытаў ён.

— Спаць, спаць... Табе, відаць, толькі гэта і трэба. Паглядзі лепш, што з тваім лісцем робіцца, нават прайсці нельга, сыплецца і сыплецца на галаву!..

— Дык вось ты пра што! Нічога асабліва га, Куртаты, з маім лісцем не адбываецца. Надыходзіць зіма, і мы, дрэвы, аддаем сваё лісце нашай матухне-зямельцы, укрываем яе ад маразоў, апранаем яе ў лістападнае адзенне.

Заяц нічога не зразумеў, толькі плячыма паціснуў.

Дуб сумна паглядзеў на яго:

— Спаць хочацца. Ідзі, Куртаты, не замінай! — І ён заплюшчыў вочы.

Заяц пагардліва махнуў лапкай:

— Ды мне што, калі ласка, заставайся голы! — І паскакаў далей.

Паступова ён пачаў прыкмячаць, што не толькі дуб, але і іншыя дрэвы губляюць сваю лістоту, аддаюць яе зямлі.

— Дзівацтва нейкае! — сказаў Заяц сам сабе.

Пачуўшы гэта, з-за кустоў выбег Вожык.

— Ніякае не дзівацтва. Ты ж і сам хутка памяняеш сваю вопратку. Што ж тут дзіўнага? Увосень мы ўсе так робім.

— Няўжо? А я і не ведаў пра гэта.

Чорная Варона, якая сядзела на сухой галіне, каркнула Зайцу:

— Таму і не ведаў, што гэта першая восень у тваім жыцці.

Зайцу ўжо даўно не падабалася гэтая злосная цётка. Толькі і ведае, што бурчыць, розныя плёткі па лесе разносіць.

— У цябе ніхто не пытае, чаго ты лезеш? Не лічы сябе разумнейшай за ўсіх! — і Заяц павярнуўся да Вароны спінай.

Вожык прысарамаціў Зайца:

— Які ты, Куртаты, грубіян!

— А чаго яна каркае, хай лепш ляціць, куды ёй трэба!..

Заяц паглядзеў на Вожыка, нават губамі прыцмокнуў:

— Дзядзечка Вожык, якія ў цябе прыгожыя іголкі! Дай мне хоць адну.

— Навошта табе мая іголка?

— Ды бачыш, кажушок мой зусім прадзіравіўся, уночы спаць не магу, мерзну. Вось тваёй іголкай і зацырую сваё футра.

— Не давай яму, братка Вожык, не давай! — закаркала Варона.

— Чаму ж не даць, няхай зацыруе свой кажушок, не будзе ўночы дрыжыкі прадаваць.

Заяц падышоў бліжэй. Вожык вырваў адну іголку, аддаў яму. Куртаты так узрадаваўся, што нават і падзякаваць забыўся, пабег стрымгалоў дадому. Але па дарозе, відаць, перадумаў: «Прайду лепш да логава Ваўка, уваткну іголку ў пень, што каля самага ўвахода. Сядзе гэты гад печаны, а іголка яму пад хвост, хай тады паскача! Ніякага нам, зайцам, жыцця ад яго няма!..» Заяц асцярожна падышоў да логава.

Ваўка якраз не было. Заяц уваткнуў іголку ў пень, і толькі паспеў у кустах схавацца, як прыляцела Варона, села на дрэва і давай круціць галавой па баках.

«І зноў яна! Ах, каб на цябе немач, старая пляткарка!» — Прыціснуўся Заяц да зямлі, нават лапкай паварушыць баіцца.

А тут і Воўк з'явіўся. Стомлены, згаладалы, ледзь прыцягнуўся.

— Ах, які ж я галодны, які ж я халодны,— заскуголіў ён.— Хоць бы якая казюрка на зуб трапіла!.. Сяду на свой любы пянёк, адпачну трошкі...

І толькі сеў, як тут жа падскочыў угору, як апантаны.

— Вай, вай, ратуйце! Мяне змяя ўджаліла,— закрычаў шэры на ўвесь лес.— Дапамажыце няшчаснаму ваўку!..

На ягоны крык прыбегла Лісіца.

— Што здарылася, братка Воўк, чаго такі гвалт узняў?..

— Яна яшчэ пытаецца?! Вось каб цябе змяя ўджаліла, ты б яшчэ і не так закрычала!..

— Змяя? Цябе ўджаліла змяя? Дзе, як жа гэта?

— Вярнуўся, ведаеш, ні з чым з паляванння, сеў на пянёк адпачыць, а яна як джгне!..

Лісіца ўважліва агледзела пень, убачыла іголку, што тырчала з яго, і смяецца:

— Якая змяя? Паглядзі, гэта ж звычайная стрэмка табе пад хвост трапіла!..

Лісіца выцягнула іголку і паказала Ваўку. Той паглядзеў і здзівіўся:

— Гэта ж Вожыкава іголка! А каб ты спруцянеў, чарцяня калючае! Вось зараз пайду, выцягну з нары і праглыну!..

— Ага, разяў горла шырэй,— пакпіла Лісіца.— Няўжо забыўся, якія ў яго іголкі? Вунь на адну ўсеўся, дык ад болю ледзь з глузду не з'ехаў!..

— Твая праўда, сястрыца Лісіца,— адказаў Воўк.— Яго так проста не возьмеш...

Варона, якая дагэтуль моўчкі слухала, пераляцела на ніжнюю галіну і закаркала:

— Кар-кар, вы думаеце, што гэта Вожык зрабіў? Памыляецеся, даражэнькія!

— А хто ж, па-твойму? — запытаўся Воўк.

— Хто, хто... Заяц гэта зрабіў, вось хто!

Заяц, які зашыўся ў кусты, пасля гэтых слоў закалаціўся як асінавы ліст.

— Заяц? Не можа гэтага быць, у яго ж іголак няма!

— Што робіцца, што робіцца, усе Зайца абараняюць! — Варона так раззлавалася, што нават пра небяспеку забылася, зляцела на зямлю і падышла да Ваўка.

— А я табе кажу, што гэта Зайцавы штукі. Сама бачыла, як ён гэтую іголку ў Вожыка выпрасіў. А потым уваткнуў у пень і збег. Не паспела я за ім прасачыць.

— Няўжо праўда? — Вочы галоднага Ваўка прагна заблішчалі. Варона была так блізка ад яго.— Ну, Заяц, пачакай жа!

— Праўда, праў...

Варона не дагаварыла, як Воўк кінуўся да яе, каб схапіць і з'есці. Добра, што яна паспела ўзмахнуць крыламі і ўзляцець.

А наш бедны Заяц даў такога драпака, што толькі яго і бачылі.

ЯК МЯДЗВЕДЗЯ ЗЯМЛЯ ПРАГЛЫНУЛА

Маленькая пышнахвостая Вавёрка высунула галаву з дупла, паглядзела ў адзін, у другі бок, потым вылезла, села на галіну і па-

чала прыгладжваць сваю ўскалмачаную пасля сну поўсць. У чорных вачанятах — трывога і неспакой. Яна шукала маму. Колькі малышка ні круціла галавой па баках, маці нідзе не было відаць.

— Мама, мама, дзе ты? Ідзі сюды!

Тоненькі галасок Вавёркі пакаціўся па лесе. Адусюль у адказ пачулася: «Сюды, сюды». Гэта было рэха. Але Вавёрка нічога не зразумела, ёй здалося, што нехта перадражнівае яе. Яна нават пакрыўдзілася на тых невядомых, што гэтак зняважліва ставяцца да яе. Навокал нікога не было. Вавёрка пачала скакаць з дрэва на дрэва, пазіраць на зямлю. І вось там яна раптам убачыла Мыш, якая корпалася ў лісці.

— Цётачка Мыш,— нясмелым голасам аклікнула Вавёрка.

Мыш узняла галаву, убачыла Вавёрку, усміхнулася і сама сабе падумала:

«Божухна, якое цудоўнае дзіцяня. А вачаняткі, вачаняткі, зіхацяць, быццам тыя пацеркі».

— Падыдзі бліжэй, прыгажунька ты мая! — паклікала Мыш.

Вавёрка скокнула на зямлю, падбегла да Мышы. Тая спытала:

— Што здарылася? Чаго ты так непакоішся?

— Я маму шукаю. Прачнулася, а яе няма. Вы, цётачка, не бачылі маёй мамы?

Мыш усміхнулася, вельмі ж ёй падабалася Вавёрачка.

— Маму, кажаш, згубіла? А можа, яна вунь там, у тым зарасніку? — Яна паказала на гушчар у лесе.

— І я там знайду сваю маму?

— Абавязкова. Аднойчы і я шукала сваю маці і знайшла яе якраз там, у гушчары.

— Вялікі вам дзякуй, цётачка Мыш,— узрадавалася Вавёрка і ўскочыла на дрэва.

Доўга яшчэ пасля гэтай сустрэчы скакала Вавёрка з галіны на галіну, з дрэва на дрэва. Забралася ў самыя нетры. Маці нідзе не было. Зусім страціла надзею Вавёрка знайсці маму. Зажурылася, пачала плакаць горкімі слязьмі.

Пачуў яе Лясны Певень. Заківаў сваёй маленькай стракатай галоўкай, залопаў крыламі.

— Вавёрачка, святло вачэй маіх, што з табой?

— Я маму згубіла! — Вавёрка расплакалася яшчэ мацней.— Маму шукаю, не магу знайсці!..

— Не плач, Вавёрачка, не перажывай! Хочаш, пакуль знойдзем тваю маму, я табе бацькам буду.

Разгубілася Вавёрка, нават не ведала, што і адказаць. А потым разгублена сказала:

— Не, я маму хачу. Пакуль не знайду яе, не супакоюся.

Пакрыўдзіўся Лясны Певень.

— Не бачыў я тваёй мамы. Шукай, можа, і знойдзеш.

Пабегла Вавёрка далей. Доўга скакала з дрэва на дрэва. Нарэшце, стаміўшыся, села на галіну адпачыць. Раптам у кустах нешта заварушылася. Гэта быў Заяц. Вавёрка пазнала яго па футру.

— Дзядзечка Заяц, ці не бачылі вы маёй мамы? — запыталася Вавёрка.

Заяц спалохаўся, высунуў галаву з куста. А калі ўбачыў Вавёрку, з палёгкай засмяяўся.

Яму наогул падабаліся вавёркі. Ён заўсёды з зайздрасцю назіраў за імі. Як яны скакалі з дрэва на дрэва!..

— Што ад мяне хочаш, найпрыгажэйшая з дзяцей?

— Можа, вы, дзядзечка, маю маму бачылі? Колькі часу шукаю яе, а ўсё дарэмна. Дапамажыце мне!

Гаворыць Вавёрка, а Заяц адно любуецца ёю: «Якое цудоўнае дзіцяня! Якія вушкі, а які хвост! Ах, які ж бы шчаслівы я быў, каб меў такое дзіцяня!..»

— Дзядзечка Заяц, вы што, не чуеце мяне? Я пытаюся, ці не бачылі вы маю маму?

— Не, не бачыў,— нарэшце адказаў Заяц.— Паслухай, дзіця маё, калі ў цябе няма дзе жыць, ідзі да мяне. Я буду цябе карміць, выхоўваць. Толькі адна ўмова: калі я не дазволю, ты не будзеш скакаць па дрэвах. Бо я за табою не ўганюся. Мы, зайцы, па дрэвах лазіць не ўмеем. Ты згодна?

— Не, я маму хачу! Яна ўмее скакаць па дрэвах. Мы, вавёркі, жывем на дрэвах.

Пакрыўдзіўся Заяц. Нічога не адказаў Вавёрцы, моўчкі зашыўся ў хмызняк.

Пабегла Вавёрка далей. Неўзабаве пад раскідзістай хвояй яна ўбачыла Мядзведзя. На галаве ў яго быў вянок з кветак.

— Які вялізны Мядзведзь! — спалохалася Вавёрка.— А якія ў яго страшэнныя лапы! Каго хочаш растопча, задушыць. Трэба ўцякаць, хавацца, але куды? — І тут Вавёрка раптам успомніла словы маці, якая казала, што Мядзведзь заўсёды абараняе бездапаможных звяркоў. Яго нават Лісіца і Воўк баяцца.

Сеўшы на тонкую галінку, Вавёрка баязліва пазірала на Мядзведзя. Яна так калаці-

лася, што ёй ад страху здалося, быццам галінка не вытрымае і яна паляціць уніз.

— Вай, вай, падаю! — закрычала яна.— Дапамажыце!..

Мядзведзь узняў голаў, убачыў Вавёрку, якая гайдалася на галінцы.

Мядзведзь, які ўважліва сачыў за Вавёркай, сказаў:

— Чаго ты дрыжыш, дзіця маё? Хто цябе гэтак напалохаў, хто пакрыўдзіў цябе?

Лагодны голас Мядзведзя супакоіў Вавёрку.

— Мяне, дзядуля Мядзведзь, ніхто не пакрыўдзіў. Я маму згубіла, не магу знайсці. Вы не бачылі маёй мамы?

Мядзведзь быў у гуморы. Ён сказаў жартам:

— Бачыў я тваю маці. Табе відаць вунь той вялізны дуб? На ім шмат шышак расце. Вось там я, калі міма праходзіў, бачыў, як твая маці збірала шышкі.

Вавёрка радасна падскочыла. Ды тут жа раптам замерла, уважліва паглядзела на Мядзведзя. А той смяяўся. Вавёрка засумнявалася, спытала:

— Дзядуля Мядзведзь, а ты не падманваеш мяне?

— Навошта ж мне маніць, якая мне з гэтага карысць? Не, не, кажу праўду. Слова гонару!

— А вы прысягніце!

— Калі сказаў няпраўду, хай зямля праглыне мяне!..

Вавёрка больш не сумнявалася. Мядзведзь жа даў слова гонару. Пераскакваючы з дрэва на дрэва, яна пабегла да дуба. Уважліва агледзела кожную галіну, але маці сваю не

знайшла. Засмучаная, вярнулася назад. Хацела прысароміць Мядзведзя за тое, што не стрымаў ён свайго слова, сказаў няпраўду. Дайшла да таго месца, дзе сустрэлася з Мядзведзем, і спынілася вельмі здзіўленая — Мядзведзя нідзе не было, знік, толькі вянок на зямлі застаўся.

— Бедны Мядзведзь, бедны дзядзечка Мядзведзь!

Пабегла Вавёрка дадому.

Надышоў вечар. Маці ўжо даўно вярнулася і чакала сваю дачушку. Убачыўшы маці, Вавёрка хуценька падбегла, прытулілася да яе і моцна-моцна пацалавала.

— Як добра, дачушка, што ты вярнулася. Я так непакоілася!

— І я, мамачка, хвалявалася. Дзе ж ты гэтак доўга была? З самай раніцы шукаю цябе!

— Зайдзі, дачушка, у наш дом, паглядзі, колькі арэшкаў я табе прынесла.

Заўважыўшы, што дачка нейкая задумлівая, маці спытала:

— Чаму ты такая сумная, дачушка? Што здарылася?

— Ведаеш, мамачка, за тое, што Мядзведзь зманіў мне, зямля праглынула яго!

Маці не зразумела. Дачка расказала ёй пра ўсе свае вандроўкі і прыгоды.

І тады маці сказала:

— Вось бачыш, дачушка, што чакае таго, хто хлусіць.

НОВЫ ГОД

Навокал ляжаў снег. Галіны дрэў ад яго цяжару прыгнуліся аж да зямлі. Толькі-толькі развіднела, і першыя промні ранішняга сонца серабрылі белы з блакітным адлівам снег.

Заяц — ён змяніў сваё футра на новае — у добрым гуморы скакаў па лесе.

— Як добра,— гаварыў ён сам сабе,— што я памяняў сваё бруднае футра, а то ўсе пачалі абзываць мяне мурзам. Хай цяпер паглядзяць, якое ў мяне чыстае, мяккае, як шоўк, футэрка, які я ўвесь белы-белы, нават хвост! Шкада вось толькі, што ён такі кароткі. Ды нічога не зробіш, ва ўсіх маіх родзічаў гэтакі ж хвост. Сам бачыў!..

Раптам Заяц заўважыў чалавека, які нёс на плячах елку. Заяц, як звычайна, спалохаўся і на ўсякі выпадак схаваўся ў кустах, нават вочы прыжмурыў. Потым адплюшчыў адно вока, другое, паглядзеў уважліва і пазнаў чалавека з елкай на плячах. Гэта быў ляснік.

— Нашто лесніку елка, чаму ён ссек яе?

Цікаўны быў Заяц. Крадком ён паскакаў следам за лесніком. Ляснік занёс елку ў сваю хату. Заяц, счакаўшы крыху, падкраўся і зазірнуў у акно. Тое, што ён убачыў, вельмі яго здзівіла. Лесніковы дзеці хадзілі вакол елкі, якая стаяла пасярод хаты, і навешвалі на яе звяроў і птушак.

— Вай, як цікава! — лыпаў вочкамі Заяц.— Я такога ніколі не бачыў. А гэта ж яны мяне на елку зацягнулі. Не, гэта не я, я ж тут, на двары. Выходзіць, гэта другі заяц, мой брат.

Заяц не разумеў, што дзеці лесніка ўпрыгожваюць елку цацкамі.

— Вай! — Заяц ад здзіўлення ажно рот

разявіў, адно вуха ў яго апусцілася, другое стала тырчком.— І Дзяцел з'явіўся, Верабейку пасадзілі. Ого, нават Мядзведзя! Во, і свечкі запалілі! І сняжком елку пасыпалі!..

Дзеці, узяўшыся за рукі, пусціліся ў скокі, заспявалі:

— Стаяла ў лесе елачка,
У засені расла,
Зімой і летам стройная,
Зялёная была.

— Якая цудоўная песня! Вунь як ім весела. Пабягу раскажу сябрам, мы таксама ўпрыгожым елку і будзем песні спяваць.

Прыбег Заяц дадому і ўжо зусім інакшымі вачыма паглядзеў на елку, што расла побач. Цяпер сярод іншых дрэў яна яму здавалася самай лепшай. «Чым жа яе ўпрыгожыць?» — падумаў Заяц. Нічога не знайшоўшы, ён пабег да суседа Вожыка.

— Братка Вожык! Дай мне трохі лісця. Бачыў я, што ўвосень ты шмат назбіраў яго.

— Назбіраў. А навошта табе лісце?

— А я яго паразвешваю на елцы.

— Я нешта цябе не разумею.

— Ляснік прынёс елку да сябе ў хату, а ягоныя дзеці панавешвалі на яе звяроў і птушак. Я таксама хачу ўпрыгожыць елку, што расце каля майго дома.

— Нарэшце, братка Заяц, я зразумеў. Гэта яны ўпрыгожылі елку, таму што да нас Новы год ідзе!

— То няхай ён і да нас прыйдзе!

— Праўду кажаш. Хадзем!

Вожык набраў лісця, і яны пайшлі да Зайца. Калі развесілі лісткі на елцы і адышліся ад яе, Заяц ад здзіўлення доўга маўчаў, а потым сказаў:

— Ах, як прыгожа!

Неўзабаве тут сабраліся іншыя звяры і птушкі, што жылі зімою ў лесе.

— Чым нам яшчэ ўпрыгожыць елку? — звярнуўся Заяц да лясных жыхароў.— Няма ў нас ні Вавёркі, ні Мядзведзя.

Пачуўшы гэтыя словы, Вавёрка паклікала сваіх дзяцей, і яны паселі на елцы.

— Як добра яны глядзяцца, праўда, братка Вожык? Яшчэ лепш, чым на лесніковай елцы.

— І гэта не дзіўна,— адказаў Вожык,— там жа яны цацачныя, а тут сапраўдныя, жывыя!

У гэты час падышоў Мядзведзь.

— Што за вэрхал, чаму гэтак шумна ў лесе?

— Гэта мы елку ўпрыгожваем, дзядзечка Мядзведзь, будзем сустракаць Новы год! — адказаў за ўсіх Заяц.

— І я хачу сустракаць Новы год, зараз таксама залезу на елку.

— Дзядзька Мядзведзь, ты лепш стань пад елкай,— сказаў Вожык.— Будзеш замест Дзеда Мароза.

— Ну, добра, пастаю тут.

А потым на елку паселі Верабей, Сарока і Варона.

На небе выплыў з-за хмар Месяц. У яго-ным святле ледзяшы на елцы загарэліся, быццам сапраўдныя свечкі. Усе пабраліся за рукі і закружыліся ў карагодзе вакол елкі.

— Мы прыбралі сваю елку,
Зіхацяць на ёй іголкі,
І цяпер наш карагод
Сустракае Новы год!..

Дзед Мароз яшчэ здалёку пачуў вясёлы гоман.

— Цікава, хто гэта без мяне наладзіў навагодняе свята?

Ямчэй паправіўшы на плячы цяжкі мех з падарункамі, ён заспяшаўся туды, дзе звяры і птушкі сустракалі Новы год.

ЛЮСТЭРКА

Аднойчы Сарока сядзела на высокім дрэве і глядзела па баках. Раптам яна ўбачыла на зямлі яркі-яркі агеньчык.

— Вай, што гэта там блішчыць-зіхаціць? — прамовіла ўголас Сарока, зляцела ўніз і асцярожна падышла бліжэй.

На зямлі ляжаў кавалак пабітага люстэрка. У ім адлюстравалася сонца, таму ён так зіхацеў. Адкуль узялося люстэрка ў лесе, хто яго тут згубіў?.. Ды Сарока пра гэта не думала.

— Якое цудоўнае люстэрка! Я яго знайшла, яно маё! Занясу ў сваё гняздо. У мяне будзе сваё ўласнае сонца!..

Сарока падхапіла дзюбай люстэрка і паляцела да сябе. Але як ні старалася, зацягнуць люстэрка ў гняздо яна так і не змагла,— мабыць, дзверы занадта вузкія былі. Тады Сарока павесіла люстэрка на галіну дуба, якраз насупраць свайго гнязда. І тут Сарока заўважыла, што люстэрка больш не блішчыць — гэта цень ад лісця засланіў яго ад сонца.

— Што здарылася з маім люстэркам? — усклікнула Сарока.— Чаму патухла маё Сонца?!

Пачала Сарока мітусіцца вакол гнязда, шукаць сваё Сонца.

Убачыў гэта Вожык, таксама занепакоіўся і запытаўся ў Сарокі:

— Суседка, а суседачка, прыгажэйшая з усіх птушак, скажы, што здарылася, што адбываецца з табою?

Вожык даўно быў закаханы ў Сароку. Ён заўсёды, калі любаваўся яе бліскучымі пёркамі, сарамліва хаваў галаву ў сваё калючае футра. Раніцай ён патаемна назіраў, як суседка з першымі промнямі Сонца ўзлятала ў блакітнае неба, і яму здавалася, што няма на свеце птушкі, прыгажэйшай за яе.

Сарока села на галіну насупраць люстэрка і сумна памахала крыламі.

— Не ведаю нават, што і сказаць, мой добры сусед,— уздыхнула Сарока.— Знайшла люстэрка, у якім было Сонца. У гняздзе яно не змясцілася, дык я павесіла на галіну, і раптам Сонца нехта ўкраў.

Вожык засмяяўся.

— Ніхто не ўкраў, мая прыгажуня! Хіба можна яго ўкрасці? Паглядзі, Сонца схавалася за хмары, таму люстэрка і не блішчыць.

— Навошта тады мне такое шэрае шкло? — паціснула плячыма Сарока.

— Не трэба тужыць,— сказаў Вожык.— Люстэрка мае яшчэ адну ўласцівасць.

— Пра што ты гаворыш?

— А ты паглядзі больш уважліва ў люстэрка і ўбачыш, што няма на свеце птушкі, прыгажэйшай за цябе.

Сарока паглядзелася ў люстэрка і пачала круціцца перад ім, аглядаючы сябе з усіх бакоў.

— І праўда, якая я прыгожая! Вось дык люстэрка, цудоўная рэч! Паглядзі, братка Вожык, якія ў мяне бліскучыя пёры, які доўгі, элегантны хвост! Проста любата!

Час ішоў, а Сарока ўсё не адыходзіла ад

люстэрка, без стомы круцілася перад ім, любавалася сабой, здавалася, што адарваць яе ад люстэрка аніяк немагчыма.

Вожык нарэшце не вытрымаў:

— Хопіць ужо, суседачка, глядзецца ў люстэрка. Трэба павесіць яго ніжэй, хай і другія звяры і птушкі паглядзяць на сябе, убачаць, якія яны часам бываюць неахайныя.

Сарока паслухалася Вожыка, павесіла люстэрка на ніжнюю галіну, дзе ён паказаў.

Неўзабаве прыбег Заяц, як заўсёды, задыханы, як заўсёды, спалоханы.

— Гэй, Куртаты, чаму ты гэтакі бледны, задыханы? — спытаў Вожык.

Заяц, заікаючыся, адказаў:

— Ледзь-ледзь уцё-ёк ад Лі-сі-цы...

— Ідзі паглядзі на сябе ў люстэрка.

Заяц пакруціў галавой, нарэшце ўбачыў люстэрка.

— Адкуль яно тут?

— Сарока нам падарыла, каб усе маглі глядзецца ў яго і быць заўсёды ахайнымі, прыгожымі.

— Можна мне на сябе паглядзець?

— Можна, а чаму ж не,— адказала з верхняй галіны Сарока.

Заяц падскочыў бліжэй, паглядзеў у люстэрка, адышоўся, зноў падышоў. Нарэшце здзіўлена прамовіў:

— О, я тут бачу двух Зайцаў! А я ж адзін.

Вожык і Сарока засмяяліся.

— Не, Куртаты, ты адзін, але ж ты касавокі, таму ўваччу ў цябе дваіцца,— растлумачыў Вожык.

— Заяц, а Заяц, а калі за табою гналася Лісіца, колькі іх было, адна ці дзве? — пажар-

таваў Барсук, высунуўшы галаву з нары.

Заяц толькі плячыма паціснуў, пакрыўдзіўся, адышоўся ўбок.

Неўзабаве прытэпаў Мядзведзь. Уважліва агледзеў сябе ў люстэрку.

Вожык на ўсялякі выпадак адбег падалей ад Мядзведзя і кпліва спытаў:

— Хіба ты не пазнаеш сябе, дзядзька Мядзведзь?

— Пазнаю, а як жа? Вось толькі адзін бок у гэтага люстэрка крывы, як мне здаецца.

— Гэта лапы ў цябе крывыя,— прапішчаў Заяц, нават не паспеўшы здзівіцца сваёй смеласці.

— Мае лапы не крывыя, гэта ў цябе вочы косыя,— злосна зыркнуў на яго Мядзведзь. Заяц ад вялікага страху моўчкі зашыўся ў кусты.

Мядзведзь спытаўся:

— Хто сюды прынёс люстэрка?

— Нам яго Сарока падарыла.

Мядзведзь зірнуў на Сароку, а тая яму ўсміхалася.

— Вялікі табе дзякуй, Сарока-белабока. Можа, у цябе ёсць яшчэ адно люстэрка? Я павесіў бы яго ў сваёй бярлозе.

— Не, братка Мядзведзь, нямашака. Вось калі знайду, абавязкова табе прынясу,— пабяцала Сарока.

— Добра, калі знойдзеш — прынясі. Буду табе вельмі ўдзячны!

У лесе было душна, звяры пахаваліся па сваіх норах. У гэты час з'явілася Лісіца. Убачыла яна люстэрка і ўзрадавалася: «О, якая цудоўная знаходка, і гаспадара няма. Забяру люстэрка сабе. Калі-нікалі і палюбавацца на сябе можна будзе».

Толькі хацела было яна ўзяць люстэрка, а Сарока тут як тут. Узняла вэрхал на ўвесь лес. Лісіца падкурчыла хвост і кінулася наўцёкі. «Ну, пачакай жа, крыкуха паршывая! Злаўлю, не пашкадую!..»

Дужа спадабалася люстэрка і Барсуку. Выбраўшы зручны момант, ён асцярожна зняў люстэрка, сунуў яго пад паху і занёс дадому. Хацеў спярша павесіць на сцяне, а потым, падумаўшы, схаваў пад сяннік.

Пад вечар, калі звяры зноў сабраліся на тым месцы, дзе вісела люстэрка, узняўся пярэпалах. Усе шукалі люстэрка.

— Мне здаецца, што яго ўзяла Лісіца,— прамовіла Мыш.

— Не, не, яна сапраўды хацела забраць люстэрка, але я не дала, прагнала яе,— сказала Сарока.

— Куды ж падзелася наша люстэрка? — спытаў Вожык, неспакойна паглядаючы па баках.

— Нават уявіць сабе не магу! — настрой у Сарокі зусім сапсаваўся.

— Пойдзем шукаць люстэрка,— сказаў Мядзведзь.— Цяпер нам яго будзе вельмі не хапаць.

— Так ужо і не хапаць! — усміхнуўся Барсук.— Вунь непадалёк адсюль ёсць возера. Пойдзем да яго, і няхай кожны глядзіцца ў ягоную люстраную ваду колькі хоча!..

Але Барсук сказаў гэта больш для таго, каб заспакоіць сябе. На самой жа справе яму было сорамна за свой непрыгожы ўчынак.

Пакуль звяры разважалі ды меркавалі, Барсук непрыкметна прынёс люстэрка і паклаў яго ў траву. І адразу на зямлі ўспыхнуў агеньчык. Гэта Сонца, што выплыла з-за хмар,

адлюстравалася ў люстэрку. Люстэрка так блішчала, зіхацела, што звяры ў першы момант нават спалохаліся. А Сарока закрычала:

— Люстэрка, маё люстэрка! Знайшлося нарэшце!

Мядзведзь ажно заскакаў ад радасці.

— Цяпер буду глядзецца ў люстэрка колькі захачу!

А Барсук сказаў:

— Няхай люстэрка будзе агульнае, няхай ім карыстаюцца ўсе. А калі самому і не давядзецца глянуць у яго, усё роўна мне хопіць радасці сяброў.

КАЛІ ПРЫХОДЗІЦЬ ВЯСНА

Сонца высока ў небе, яно свеціць усяму жывому. Зазелянелі дрэвы. Зямля дыхае вольна і шырока. Вырасла трава, узнялі свае галоўкі кветкі. Усё ў прыродзе абудзілася. Прыйшла Вясна.

Адусюль ляцелі, вярталіся з выраю птушкі. Два вераб'і — Шэры і Чорны — сядзелі на тэлеграфным провадзе і назіралі, як вяртаюцца ў родны край, уладкоўваюцца на старых і новых кватэрах пералётныя птушкі. І вось якая размова адбылася паміж вераб'ямі.

— Паглядзі, з якой радасцю ўсе яны вяртаюцца дадому,— сказаў Шэры.

— А як жа! Якая ж Вясна без іх? — адказаў Чорны.— Ты толькі паглядзі на людзей! Будуюць для іх кватэры.

— І вельмі добра робяць. Лёгка жыць увесну і летам! Цёпла, і корму ўдосталь. Вось узімку жыць цяжка.

— Праўда, праўда! Колькі цяжкасцей да-

водзіцца перанесці. А мы, тым не менш, прызвычаіліся, нікуды не адлятаем. Не тое што пералётныя птушкі. Хаця і ім нялёгка. Я заўсёды сумую, калі іх няма. Усё думаю, як ім там жывецца ў далёкіх краінах. Дарэчы, а дзе цяпер твая сяброўка ластаўка, ужо вярнулася?

— Так, так, прыляцела. У першы ж дзень знайшла мяне. Колькі цікавага расказала, колькі яна, бедная, нагаравалася на той чужыне. А цяпер шчаслівая, усё-такі дома!

— А я чакаю прылёту жураўлёў. Учора прыляцела вялікая чарада, сам бачыў. Я іх сустракаў, але майго жорава сярод іх не было.

— Не журыся, яшчэ прыляціць. Глядзі, глядзі! — Шэры ажно ўзляцеў з провада.— Вунь здалёк паказаўся жураўліны клін!

Калі жураўлі наблізіліся, адзін з іх аддзяліўся ад чарады і паляцеў проста да іх. Гэта быў сябар Чорнага. Нарэшце сустрэліся! Радасць іх была бязмежнай.

Калі прыходзіць Вясна, радуюцца ўсе — дрэвы, кветкі, птушкі. Абуджаюцца лепшыя пачуцці. Радуецца Зямля. Смяецца Сонца.

ГУСІ

У маці Гускі было жоўценькае-жоўценькае гусяня. Яна яго карміла-паіла, не зводзіла з яго вачэй, вадзіла гуляць, купацца на возера.

Аднойчы, калі маці Гуска плыла па возеры са сваім гусянём, на ваду, у чарот апусціліся два гусакі. Яны паплылі побач адзін з адным, высока трымаючы свае доўгія, з мяккім пухам, шыі. Ганарлівыя гусакі былі белыя-белыя, як снег.

Гусяня спытала:

— Мама, паглядзі, хто яны такія? Яны вельмі падобныя на нас!

Маці Гуска адказала:

— Гэта дзікія гусі. Вясной яны прылятаюць у нашы мясціны. Увосень, калі надыходзяць халады, яны адлятаюць у вырай, у цёплыя краіны.

Гусяня зноў спытала:

— Мама, а як жа мы? Мы таксама паляцім у цёплыя краіны?

— Не! Нашы мясціны цёплыя, зручныя, тут заўсёды ёсць ежа. Навошта ж нам некуды ляцець?

— А я, мамачка, таксама хачу паляцець далёка-далёка!..

— Калісьці нашы продкі таксама адлыталі ў далёкія краіны. Але з часам яны прызвычаіліся да мясцовых умоў, пакінулі неба, зрабіліся свойскімі птушкамі.

Гуска залопала крыламі, але ўверх не ўзляцела. Толькі кругі па вадзе пайшлі.

Міналі дні. Гусяня падрасло, зрабілася, як маці, белае-белае. Сапраўдны Гусак-прыгажун! Ён ужо больш не думаў пра тое, каб адлятаць у вырай.

Надышла восень, пачаліся халады. З дрэў у арыкі ападала лісце.

У апошнія дні Гусак хадзіў сумны-сумны.

— Што здарылася? — пыталіся сябры.— Чаму ты такі журботны?

— Сам не ведаю,— адказваў Гусак.

Аднойчы ён убачыў у небе чараду птушак. Яны ляцелі на поўдзень.

— Гусі ляцяць! Гусі! — закрычаў Гусак, пазіраючы ў неба.

Яму растлумачылі:

— Гэта не гусі, гэта жураўлі. Яны ляцяць у цёплыя краіны.

Аднойчы ўвечары Гусак убачыў у небе дзікіх гусей. Яны ляцелі, ганарліва выцягнуўшы свае доўгія шыі. Гусак замітусіўся, пачаў кідацца ў розныя бакі, а потым пабег да возера.

— Куды ты, вярніся! — аклікнула яго маці.

Гусак не адказаў, нават галавы не павярнуў. Ён бег доўга-доўга і нарэшце ўзбег на невялікі пагорак. Адтуль Гусак тужліва глядзеў услед дзікім гусям. А потым, апусціўшы галаву, перавальваючыся з боку на бок, вярнуўся дадому.

Маці Гуска сказала:

— Не трэба ім зайздросціць, дзіця маё. Думаеш, яны ад добрага жыцця адлятаюць на поўдзень? Не, яны выпраўляюцца ў цяжкія вандроўкі, каб пракарміцца, не памерці з голаду. Шлях іх доўгі і небяспечны, на іх нападаюць арлы, ястрабы... Нашы сябры-людзі абараняюць нас ад гэтай навалы. Летам і зімою яны кормяць нас, будуюць птушнікі, усяляк даглядаюць і песцяць.

Гусак вельмі любіў сваю маці, слухаўся яе ва ўсім. І да таго ж быў ён свойскай птушкай. Яму было цікава жыць на зямлі.

Разам з маці Гусак падаўся да возера, дзе яны далучыліся да сваіх сяброў — свойскіх гусей, якія з асалодай плавалі і плюхаліся ў вадзе.

КАЧАНЯ-ХВАЛЬКО

У зялёным-зялёным лесе тулілася прыгожае возера. Вада ў ім была такая празрыстая, такая чыстая, як сапраўднае люстэрка. Звяры,

што жылі ў лесе, заўсёды прыходзілі да гэтага возера. Яны пілі ваду, купаліся, а потым любаваліся сваім адлюстраваннем у вадзе. Рознакаляровыя качкі, што жылі на гэтым возеры, былі яшчэ адным яго ўпрыгожаннем. Яснае возера карміла, паіла іх, давала ім прахалоду і жыллё. Сярод качак вылучалася Качаня-хвалько. Цэлымі днямі яно толькі і рабіла, што выхвалялася перад іншымі качкамі:

— Паглядзіце, якое я прыгожае! Кожнае пёрка мае свой колер. Гэтаму возеру толькі я надаю прыгажосць, я і мае пёркі!

Спярша качкі не звярталі ніякай увагі на яго пахвальбу. Няхай сабе, думалі яны, выхваляецца гэтае малое. Толькі смяяліся з яго слоў ды пакеплівалі. Але Качаня рабілася ўсё больш надакучлівым, не давала нікому спакою.

— Я, быццам кавалачак золата,— выхвалялася Качаня.— І Сонцу надаю харaство!..

Неўзабаве прыйшла Вясна. Не злічыць птушак, што прыляцелі з выраю. Цяпер у гэтых мясцінах можна было ўбачыць самых розных птушак, якія вярталіся да сябе на радзіму. Глядзяць на іх качкі, вітаюць кожную чараду: «Зірніце, вунь ластаўкі прыляцелі, а вунь — жураўлі!..»

Толькі Качаня-хвалько ні на кога не зважае. Плавае сабе, плюхаецца ў вадзе, цешыцца самім сабою.

Аднойчы прыляцелі лебедзі. Распасцёршы шырока свае белыя, як снег, крылы, яны пачалі мякка апускацца на ваду.

— Вай, якія прыгожыя птушкі,— у адзін голас усклікнулі качкі і качаняты.

— Ага, гэта лебедзі, найпрыгажэйшыя з птушак,— сказала Старая Качка, якая шмат

пражыла і шмат чаго пабачыла на сваім вяку.

А Лебедзі, што паселі на ваду, адпачывалі. Яны ж зрабілі такое вялікае падарожжа.

Качаня-хвалько зайздросціла гэтым птушкам, якія, грацыёзна выгнуўшы свае белыя прыгожыя шыі, нячутна плылі па люстраной вадзе.

«Я не хацеў бы быць такім белым, як яны. Навошта мне гэта. Я і без таго такі прыгожы, такі шыкоўны. Яны напэўна зайздросцяць мне».

Качаня павярнулася да лебедзяў. Маўляў, глядзіце, любуйцеся! Але ніхто з іх не звяртаў на яго ўвагі. Выхваляка раззлаваўся. Але нічога не зробіш. Качаня падумала: «Бадай, што шыя ў іх даволі прыгожая. Цікава, што можна зрабіць, каб і мая шыя зрабілася такой доўгай і гнуткай?» Так нічога і не прыдумаўшы, Качаня яшчэ больш раззлавалася.

У гэты час яго і ўбачыла Лісіца, якая прытаілася ў кустах і прагна назірала за птушкамі. Падпусціўшы Качаня блізка да сябе, яна выглянула з-за куста і спытала:

— Што з табой здарылася, самая прыгожая з усіх птушак, чаму ў цябе такі кепскі настрой?..

— Колькі я ні спрабую выцягнуць сваю шыю, нічога не выходзіць,— з сумам адказала Качаня-хвалько.

— А навошта табе гэта спатрэбілася?

Качаня з зайздрасцю паглядзела ў бок лебедзяў:

— Хачу, каб і ў мяне была такая доўгая шыя, як у іх. Кароткая шыя псуе маю прыгажосць.

Хітрая Лісіца вельмі ўзрадавалася, пачуў-

шы гэтыя словы. Нарэшце яна паласуецца гэтым Качанём. Яна сказала:

— Ці ведаеш ты, маё даражэнькае Качаня, што выцягнуць шыю гэтым лебедзям дапамагалі мы, лісіцы?..

— Як жа вы ім іх выцягнулі? — зацікавілася Качаня-хвалько.

— Вельмі проста,— адказала Лісіца-хітрыца,— узялі сваімі зубкамі за галаву, пацягнулі, і шыі ў іх выцягнуліся...

— Праўда, а ім не балела?

— Відаць, трошкі і балела, але яны цярпелі. Каб стаць прыгожым, трэба трошачкі і пацярпець.

Вельмі ўзрадавалася Качаня. Але потым, падумаўшы аб нечым, сказала:

— Пайду, паклічу сюды качак, а ты ім выцягні шыі.

— Не, не, маё прыгожанькае Качанятка,— спалохалася Лісіца,— не трэба іх сюды клікаць. Ці ж ты хочаш, каб і яны зрабіліся такімі ж прыгожымі, як ты? Хай усе качкі табе зайздросцяць. Я дапамагу толькі табе. Плыві да мяне хутчэй! Ты будзеш самым прыгожым Качанём на ўсім свеце!

Узрадавалася Качаня-хвалько, выйшла на бераг і паклыпала да Лісіцы. Хітруха чакала за кустом, зубы яе ляскалі ад прагнасці і нецярплівасці.

Качаня падышло да яе, выцягнула шыю, заплюшчыла вочы, а гэта толькі і трэба было рыжай разбойніцы.

САМАЎПЭЎНЕНЫ ПАТОК

Прыйшла вясна. Снег у гарах пачаў раставаць. Кропелькі вады, весела пераклікаючыся, збегліся, аб'ядналіся і ператварыліся ў вялікі Паток, і ён рынуўся з гары ўніз.

Скалы, якія патрывожыў Паток, спыталі ў яго:

— Паслухай, Паток, куды ты спяшаешся? Куды бяжыш?

— Я ўбачыў з горнай вяршыні Мора,— адказаў Паток.— Хачу з ім аб'яднацца!

— Дык Мора адсюль далёка, ты не дойдзеш да яго,— папярэдзілі Скалы.

— А гэта мы яшчэ паглядзім! Пабачыце, як мая бурная, шпаркая вада дамчыцца да Мора і напоўніць яго. Ого! Мае хвалі, як птушкі, умомант даляцяць!..

Сказаўшы гэтак, Паток памчаўся ўніз. Па дарозе гэты свавольнік усё, што траплялася на яго дарозе, нават вялізныя камяні, цягнуў за сабою. І нікога ён не чуў і не слухаў. Мацнеючы, набіраючы сілы, Паток радаваўся — цяпер, бач, ніхто яго не затрымае!

Высокія Горы, што стаялі ўдалечыні і былі недасягальныя для Патока, папярэдзілі яго:

— Беражы сілы, дарагі, не чапай камяні, не падмывай скалы. Сцеражыся, бо твая сіла кончыцца і ты спынішся, не дойдзеш да Мора.

Але Паток і слухаць не хацеў.

— Эх,— шумеў ён у адказ,— шкада, што не магу да вас дацягнуцца, а то і вы адчулі б маю сілу!

Горы змоўклі, толькі з пагардай назіралі за Патокам. А той, весела гуляючы хвалямі, разліваўся па наваколлі.

— Не разлівай сваёй вады, не растрачвай

сілу, да Мора яшчэ далёка,— папярэдзіла Паток старая, мудрая Варона.

— Хто ты, каб мяне вучыць! Не лічы сябе разумнейшай за мяне, ляці па сваіх справах!..— І Паток імчаў далей.

Паступова сілы яго меншалі, але ён гэтага яшчэ не адчуваў. Аднойчы захацеў, як раней, вырваць з карэннем дрэва, ды дзе там! Колькі ні стараўся, нічога не выйшла.

— Вай, вай, бедны Паток! — закаркала Варона.— Хіба яшчэ не пераканаўся, што сіла пакідае цябе!

— Прэч, агідная птушка! Вельмі яно мне трэба, тое дрэва! Проста не хачу з ім звязвацца.

Так ён гаварыў, каб схаваць сваю збянтэжанасць.

Бегучы далей, Паток раптам наткнуўся на маленькую скалу. Колькі ні намагаўся ён, а ссунуць яе з месца так і не здолеў. Падзяліўшы свае воды, ён абышоў скалу з двух бакоў. Цяпер, калі сіла Патока кончылася, усё, што сустракалася на ягоным шляху, яшчэ больш драбніла яго моц, нават маленькія каменьчыкі сталі для яго перашкодай. Нарэшце ён зусім аслабеў, зямля ўсмактала яго, і Паток знік, так і не дасягнуўшы Мора.

МОЙ РОДНЫ КУТ

Прыйшла вясна. Птушкі вярталіся з выраю. Усе радаваліся Сонцу і цяплу.

Пасеўшы на тэлеграфны провад, паціху размаўлялі паміж сабой Варона і Шэры Верабей.

— Дзіўлюся я,— разважаў Шэры Вера-

бей,— чаму ўсе так радасна сустракаюць пералётных птушак? Людзі для іх нават кватэры будуюць. Уладкоўвайцеся, маўляў, вам тут будзе зручна і ўтульна.

— Я нешта не разумею цябе,— сказала Варона, скасавурыўшы на Вераб'я адно вока.

— А што тут разумець! Увесну і летам жыць няцяжка: надвор'е цудоўнае, усё наўкол квітнее, корму колькі хочаш! А як толькі надыходзіць восень, уся гэтая пешчаная кампанія адлятае ў вырай, зноў, значыць, у цёплыя краіны. Яно і праўда: «Чаму ж нам не пець?»

— Праўду кажаш, Шэры Верабей. Мы з табой ніколі не адлятаем у вырай, не пакідаем родны край.

— Вось бачыш, і ніхто нас не сустракае, не будуе нам жыллё.

— Ведаеш, Шэры, кожны раз даю сабе слова, як пачнуцца халады, дык і я палячу ў цёплыя краіны. І кожны раз застаюся.

— Нельга жыць без радзімы,— сказаў Шэры Верабей.— І няма нам чаго рабіць на чужыне.

Пачула іхнюю размову Ластаўка:

— Дарэмна вы нас, пералётных птушак, крыўдзіце. Думаеце, лёгка пераадолець тысячы і тысячы кіламетраў? А колькі нас гіне ў гэтай доўгай і цяжкай дарозе!

— Дык не адлятайце, заставайцеся, як і мы! — усклікнула Варона.

— Адчуеце не толькі цяпло, але і холад, і бяскорміцу,— прамовіў Шэры Верабей.

— Якія ж вы дзівакі, шаноўныя Варона і Шэры Верабей! Думаеце, што нам ахвота лячець у чужыя краіны? Але так наканавана матухнай Прыродай. Не можам мы зімаваць,

усе загінем. Застаняцеся адны. Няўжо сумаваць без нас не будзеце?

— Будзем, будзем,— у адзін голас закаркала Варона і зацырыкаў Шэры Верабей.

— Вось бачыце,— усміхнулася Ластаўка,— таму мы заўсёды і вяртаемся ў родны край. Мы таксама вельмі любім сваю радзіму.

ДУБ І КРЫНІЦА

Пустыня. Куды ні глянь — пяскі, пяскі... Зямля і неба згараюць ад гарачыні. Нідзе ні кусціка, ні травінкі... Толькі адзінокі Дуб стаіць сярод гэтага пясчанага царства. Сонца высушыла яго, лісточкі счарнелі, зморшчыліся. Даўно ўжо ніхто не праходзіў цераз пустыню, не чуў цяжкіх стогнаў некалі магутнага дрэва.

Вечарамі, калі прахалода ахутвала Дуб, яму рабілася крыху лягчэй, і ён ненадоўга засынаў. У снах Дуб заўсёды бачыў Крыніцу — сваю нязбытную мару. І кожны раз, як толькі Дуб хацеў напіцца, ён у той жа момант прачынаўся. І зноў надыходзіў спякотны дзень, гарачыня і смага мучылі няшчаснае дрэва.

Мінула шмат часу, змяняліся поры года. Дуб зрабіўся чорны-чорны. Кара яго патрэскалася, але ён без стомы клікаў і клікаў Крыніцу. І вось аднойчы ў сне, як заўсёды, ён нахіліўся над Крыніцай і раптам адчуў, што гаючая вада дакранулася да яго. Дуб імгненна прачнуўся і ўбачыў, што пад ім сапраўды цячэ, пераліваецца на сонцы жывая вада.

— Адкуль ты, святло вачэй маіх, узялася? — усё яшчэ не верачы ў такі цуд, запытаўся ў Крыніцы Дуб.

— Пачула твой покліч, мілы мой, гаротны Дуб, і прыйшла да цябе.

— Не ведаю, чым і аддзячыць табе, нават слоў не знаходжу ад шчасця, любая мая, ненаглядная Крынічка!

Мінулі тыдні, месяцы. Вакол Дуба пачалі расці кветкі, дзе-нідзе скрозь пясок прабіваліся парасткі хмызняку. Радаваўся Дуб, гледзячы, як вакол яго абуджаецца жыццё. І нарадзілася ў Дуба мара, каб усе, хто праходзіў цераз пустыню, знаходзілі тут, у яго засені, адпачынак, каб маглі папіць, прагнаць смагу.

Падзяліўся Дуб сваёй марай з птушкамі, што звілі гнёзды ў ягонай густой зялёнай кроне. А яны расказалі пра гэта ўсім.

І пачалі каля Дуба спыняцца караваны. Людзі радаваліся вадзе і прахалодзе, дзякавалі Дубу і Крыніцы за гасціннасць і прытулак. Кожны лічыў сваім абавязкам пасадзіць тут садовае дрэўца, і ў хуткім часе вакол Дуба і Крыніцы вырас вялікі, неабсяжны сад.

Пустыня. Куды ні глянь — пяскі і пяскі... Паволі рухаецца караван. Людзі і вярблюды стаміліся, прагнуць вады і адпачынку. І раптам наперадзе — і гэта не міраж, а сапраўдны цуд — вялікі аазіс, над якім узвышаецца, распасцёршы свае зялёныя шаты, магутны Дуб. А каля яго кіпіць і пеніцца, весела перамаўляецца з ім маладая красуня Крыніца.

МАРА ЗОРКІ

Я — Зорка. Як і ўсе мае сёстры, удзень я сплю, а ўвечары прачынаюся, шырока расплюшчваю вочы і гляджу на Зямлю. Я бачу Людзей, я люблю Людзей. Гэта для іх я выпраменьваю святло, хачу, каб да іх дайшла мая цеплыня. Але я вельмі далёка ад

Людзей. Аднойчы я спытала ў Старой Зоркі:

— Бабулька Зорка, няўжо мы заўсёды будзем гэтак далёка ад Зямлі, ад Людзей?

— Так, унучка, такі наш лёс, лёс зорак.

— Але я хачу быць бліжэй да Зямлі, я вельмі сумую без Людзей!

— І я ў маладосці марыла пра гэта. Але потым прызвычаілася, што зробіш! Цяпер састарэла, вочы мае пабляклі, не мігцяць, як раней...

— Не, Бабуля, я з такім лёсам не хачу мірыцца!

— Пачакай, унучка, цяпер надышлі іншыя часы. Людзі хутка прыляцяць да нас. Яны паслалі ўжо да Марса і Венеры свае касмічныя апараты.

Гэта абнадзеіла мяне, я пачала чакаць Людзей.

Аднойчы я ўбачыла на паверхні Месяца Чалавека, а потым туды прыляцеў месяцаход. Тут я ўжо не стрымалася, паляцела ўніз, наблізілася да Месяца:

— Добры вечар, дзядзечка Месяц!

— Хто ты? — запытаўся ён.

— Я Зорка! Прыляцела сюды, каб зблізку ўбачыць Чалавека, сына Людзей. Дазволь мне застацца побач з табою.

— Калі ласка, Зорачка, заставайся. Адсюль да Зямлі не так і далёка. Глядзі на Людзей, аддавай ім сваё святло. А яны будуць любавацца табою.

— Няўжо яны звернуць на мяне ўвагу? Я ж зусім звычайная непрыкметная зорка.

— Абавязкова ўбачаць. Гэта там, наверсе, ты адна з мільёнаў, губляешся і знікаеш у зоркавым пыле. А побач са мной ты будзеш толькі адзіная. Магчыма, Людзі дадуць табе

імя, пераканаюцца ў тваёй прыгажосці і аддана-сці ім і складуць пра цябе вершы і песні. І мне не будзе гэтак адзінока. Разам нам будзе весялей.

— Вялікі дзякуй табе, дзядзечка Месяц, за тваю шчырую дабрыню!

З таго часу мы заўсёды побач. Разам ідзем на спачын, разам прачынаемся, каб зноў і зноў аддаваць Людзям святло і цяпло. І яшчэ мы спадзяемся, што Людзі ў хуткім часе прыляцяць да нас, абжывуць касмічную прастору і мы будзем жыць побач, як самыя лепшыя суседзі і сябры.

ЯК ВАВЁРКА ПАСАДЗІЛА ХВАІНКУ

Сядзела маленькая Вавёрка на дрэве і, як заўсёды, уважліва паглядала наўкола. Убачыўшы на зямлі шышку, Вавёрка хуценька збегла ўніз. Гэта была прыгожая хваёвая шышка, поўная смачных зярнятак. Вавёрка схапіла шышку і адбеглася ўбок, пільна паглядзела, ці не назірае хто за ёю. Вакол нікога не было.

«Ніхто не адбярэ ў мяне шышку, сама ёю паласуюся!» — падумала яна.

Толькі яна дакранулася да шышкі сваімі вострымі зубкамі, як пачула паблізу нейкі трэск.

«Вай, хто гэта? Трэба хутчэй закапаць шышку ў зямлю. Потым з'ем, а то яшчэ адбяруць!» — спалохалася Вавёрка.

Вавёрка закапала шышку і хуценька ўзбегла на дрэва. Адтуль яна ўбачыла, што гэта Мыш напалохала яе. Тая нешта цягнула ў сваю норку.

«Добра, што схавала шышку. Усе хацелі б паласавацца ёю: і Мядзведзь, і Заяц, і Мыш, і птушкі. Калі сцямнее, я вярнуся сюды і вылушчу шышку».

Вавёрка, пераскокваючы з дрэва на дрэва, пабегла дадому. Колькі яна там ні завіхалася, а пра шышку не забывала. Не заўсёды натрапіш на такую вялікую, поўную зярнят, шышку...

Надышоў вечар.

— Пара ўжо ісці па шышку,— сказала ўголас Вавёрка.

Пачула яе Варона.

— Што здарылася, малая, пра якую шышку ты ўспомніла?

Вавёрка спалохалася, што пра яе сакрэт даведалася Варона, і, запінаючыся, адказала:

— Не, не, нічога не здарылася, проста галава баліць.

— Дык ідзі паспі — і галава пройдзе.

— Праўду кажаце, цётачка Варона. Вось толькі крышку пагуляю на свежым паветры.

Сказала гэтак Вавёрка, саслізнула з дрэва і пабегла на тое месца, дзе яна схавала шышку. Але колькі ні шукала, ніяк не магла знайсці. Было ўжо зусім цёмна. «Пачакаю, пакуль узыдзе Месяц,— вырашыла Вавёрка.— Стане відно, і я знайду сваю шышку».

Доўга не паказваўся на небе Месяц, нешта забавіўся. Стамілася Вавёрачка чакаць. Давялося вярнуцца дадому, каб ранічкай зноў прыйсці па шышку.

Калі Вавёрка прачнулася, навокал ляжаў снег.

— Ну вось, Месяца не дачакалася, дык гэты снег прыспеў. Як я цяпер знайду сваю шышку?..

Міналі дні. Вавёрачка ўсё шукала і шукала тое месцейка, дзе схавала шышку. І аднойчы яна ўбачыла, як з зямлі, якраз на тым самым месцы, пачаў прарастаць хваёвы парастак.

Усе здзівіліся, а Варона сказала:

— Цікава, хто тут пасадзіў хвойку? У нашым лесе хвоі не растуць.

— Адкуль яна трапіла сюды? — здзіўлена прамовіў Дзяцел.

А маленькая Вавёрка не звяртала ўвагі на іх размову, яна шукала сваю згубу. І ўсё ніяк не магла сцяміць, куды падзелася гэтая вялікая, поўная смачных зярнят, шышка.

ЛАСТАЎКА-ГУЛЬТАЙКА

Прыляцелі ластаўкі з выраю. Усюды быў чуваць іх вясёлы шчэбет. Усе яны пачалі будаваць гнёзды. Лётаюць і лётаюць ластаўкі без стомы. Каторая ў дзюбе нясе камочак гліны, каторая — саломінку. Усе працуюць. Толькі адна Ластаўка нічога не робіць. Заўважыла гэта старая Ластаўка і зрабіла заўвагу:

— Гэй, гультайка, чаму не будуеш гняздо? Спяшайся, потым будзе позна!

Гультаяватая Ластаўка бесклапотна адказала:

— Пабудаваць гняздо ніколі не позна. Лепш пагуляю, пацешуся, а там будзе відаць.

— Лухту вярзеш, любенькая,— раззлавалася Мудрая Ластаўка.— Кожную справу трэба рабіць у свой час. Не збудуеш гнязда, не выведзеш птушанят, потым спахопішся, ды позна будзе!

— Ат, знайшла чым палохаць! Можна па-

думаць, што збудаваць гняздо і вывесці птушанят такая ўжо цяжкая работа! Яшчэ ёсць час, паспею!

— Ты ж зразумей, калі позна пабудуеш гняздо, птушаняты не паспеюць падрасці, убрацца ў пер'е. Калі мы ўсе паляцім у вырай, яны застануцца, замерзнуць, загінуць.

Гультаяватая Ластаўка так і не паслухалася, не звярнула аніякай увагі на словы Мудрай Ластаўкі.

Мінула колькі часу, і ва ўсіх ластавак гнёзды былі гатовы. Амаль пад кожным дахам ляпіліся яны, падобныя на маленькія кошыкі. І ў кожным гняздзе ляжалі яечкі.

А гультаяватая Ластаўка ўсё лятае, носіцца ў паветры, весяліцца, бесклапотна шчабеча.

Нарэшце з яечак з'явіліся жаўтаротыя птушаняткі, прыгожыя-прыгожыя!

Убачыла іх гультаяватая Ластаўка і засумавала, занепакоілася. Але гэта было позняе раскаянне. Паляцела гультайка да Мудрай Ластаўкі:

— Дапамажы мне, мудрая разумная сястра мая!

— Цяпер позна ўжо выседжваць птушанят. З дня на дзень прыйдзе восень.

— Вай, вай,— заплакала гультаяватая Ластаўка,— засталася я бяздзетнай... Гора звядзе мяне ў магілу!..

— Я дам табе параду, хоць за тваё непаслушэнства цябе трэба было б пакараць. Папрасі ў бацькоў дазволу даглядаць іх птушанят. У гэтым твой паратунак, толькі так апраўдаеш сваё гультайства.

І пачала Ластаўка карміць і даглядаць чужых птушанят. Спярша бацькі злаваліся:

— Не чапай нашых дзетак, трэба сваіх мець!..

Але потым зразумелі яе становішча, адчулі боль сваёй бяздзетнай сястры і згадзіліся, нават пачалі яе падахвочваць. І тая дзень пры дні, без стомы, забываючы на сябе, карміла і даглядала птушанят. Не было таго гнязда, не было таго птушаняці, якога б не накарміла Ластаўка. І чым больш даглядала, тым меншым рабіўся цяжар на яе сэрцы. Яна адчувала сябе маці.

Мінуў час. Птушаняты падраслі, навучыліся лятаць, станавіліся ўсё больш самастойнымі.

Пачаліся халады, лісце на дрэвах пажоўкла — гэта надышла восень.

Мудрая Ластаўка звярнулася да моладзі:

— Збірайцеся, дзеці, у дарогу. Паляцім у цёплыя краіны. Час не чакае!..

Раніцай, як толькі ўзнялося Сонца, усе ластаўкі паляцелі вялікай чарадой у вырай. І разам з імі, упоравень з маладымі, ахоўваючы іх, ляцела наша знаёмая Ластаўка. Яна ўжо не адчувала сябе бяздзетнай, яна была маці ўсіх гэтых падужэлых, дзякуючы і яе клопатам, прыгожых птушак.

У ХЛУСНІ КАРОТКІЯ НОГІ

Лісіца была галодная. Вось ужо колькі дзён не змагла нічога сабе здабыць. Думала-думала, і пайшла да Зайца, пастукалася ў весніцы.

Прачнуўся Заяц, высунуўся ў акно.

— Слухаю цябе, ханум Лісіца!

— Добры дзень, Зайчык! Выйдзі да мяне на хвілінку.

Заяц ведаў, з кім мае справу, таму і адказаў:

— У мяне, ханум Лісіца, дужа вока баліць. Доктар забараніў выходзіць на двор. Кажы, што ў цябе да мяне, я і адсюль добра пачую.

Лісіца зразумела, што хітрыкі яе не ўдаліся, і ўзяла яе злосць. Але хутка адумалася, стрымала сябе і пяшчотным галаском сказала:

— Каб ты ведаў, якую я табе вестачку прынесла, якую цудоўную навіну, сам бы да мяне прыбег!

Пачуўшы гэтыя словы, Заяц ужо хацеў было адчыніць дзверы, так яму карцела даведацца пра навіну, але страх перад Лісіцай перамог.

— Не, не, ханум Лісіца, я не магу выйсці на двор, гавары адтуль!

«Нічога, сёння я з табой так пагавару,— падумала Лісіца.— Заўтра ты ад мяне нікуды не дзенешся, усё роўна злаўлю і з'ем!»

— Добра, добра, я табе і адсюль скажу. Ты ж свайго суседа, Куртатага, што жыве на тым баку дарогі, ведаеш?

— Канечне, ведаю, мы з ім сябруем, разам у лес ходзім.

— Ну, дык вось, гэты Заяц, твой сусед, прыбег на вяршыню гары і пачаў чакаць усходу Сонца. Як толькі Сонейка паказалася, Заяц адламаў ад яго маленькі кавалачак, прынёс дадому і павесіў на дзверы. Цяпер у яго доме ўдзень і ўночы светла. Куртаты выхваляецца, усім кажа, што сонца да яго ў госці прыйшло.

Вельмі здзівіўся Заяц, ён ажно вочы вырачыў.

— Не можа быць, ці ж гэта можна — адламаць кавалак Сонца?

— Можна, можна! Ранічкай сонца халоднае, і толькі апоўдні награецца, тады ўжо да яго не дакранешся. А раніцай колькі хочаш! Дык я і кажу, давай разам з табой сходзім і таксама адломім кавалачак Сонца, прынясём і павесім над тваімі дзвярыма. Няхай усе бачаць і зайздросцяць табе. Ну, што скажаш?

— Вядома, сходзім,— адказаў Заяц. Ён ужо зразумеў хітрыкі Лісіцы.

Узрадавалася Лісіца, а Заяц кажа:

— Хачу і я табе расказаць адну навіну, ханум Лісіца.

— Якую, кажы хутчэй!

— Кажуць, што ўсіх манюк будуць лавіць і вешаць на дрэвах.

Задрыжала Лісіца, азірнулася па баках.

— Нешта я нічога пра гэта не чула,— не зусім упэўнена прамовіла яна.

— Учора сам Мядзведзь хадзіў па лесе і ўсіх папярэджваў, каб не хлусілі, бо такіх хлусоў будуць лавіць і вешаць!

— Вай, вай, як нядобра ўсё выйшла,— замітусілася Лісіца.— Паслухай, Заяц, давай заўтра нікуды не пойдзем.

— Чаму? — наўмысна здзівіўся Заяц.

— Я ўспомніла, заўтра ў мяне ёсць адна тэрміновая справа. І потым, ведаеш, Зайчык, я ж гэта знарок табе сказала. Ну, праўда, хіба ж можна на самай справе адламаць кавалачак Сонца? Я, любенькі мой, пажартавала!..

— Калі так,— адказаў Заяц,— то і я пажартаваў. Я ўжо з тыдзень не бачыў Мядзведзя, ды і не гаварыў ён нічога такога пра манюк і хлусоў.

Але Лісіца гэтых слоў ужо не пачула. Падкурчыўшы хвост, яна, баязліва азіраючыся па баках, бегла дадому.

ПЕСНЯ ФІЯЛКІ

Кветкі прачнуліся. Герань заківала галавою, Кактус натапырыў свае калючкі, Ружа выпрасталася, пачала прыхарошвацца. А Фіялка расплюшчыла свае блакітныя вочы, паглядзела на Сонейка і ўсміхнулася. Сонечны прамень дакрануўся да яе пругкіх лісточкаў, здзівіўся:

— Хто ты?

— Я — Фіялка!

— Няўжо? Я заўсёды бачыў Фіялку пад кустом, яна дрыжала, галава яе была прыгнута да зямлі. У вас бадай што толькі адно падабенства — прыгожыя блакітныя вочы. Хто яна табе?

Фіялка засаромелася.

— Гэта мая сястра, дачка палёў. Яна адзінокая, ніхто аб ёй не клапоціцца. Сястра мая заўсёды сумуе па Сонейку, бязлітасныя вясновыя вятры раняць яе далікатнае сэрца, і яна, прыгнуўшы галоўку, тужліва глядзіць на свет блакітнымі вачамі. А я — цяплічная кветка, мая маці — вось гэтая жменька зямлі. Не ведаю я ні дажджу, ні снегу, мне тут цёпла і ўтульна. Я так шкадую маю бедную сястру.

— Не турбуйся, Фіялка, я спяшаюся якраз туды і не дам яе ў крыўду.

Сонечны прамень аблашчыў блакітныя вочы Фіялкі і знік.

Фіялка вельмі ўсцешылася, на ёй высыпала мноства бутонаў,— яна цяпер нагадвала

маленечкае неба, упрыгожанае блакітнымі зорачкамі. Яна ж цвіла ўпершыню!..

Мінулі сакавік і красавік, надышоў май, Фіялка ўсё цвіла і цвіла. Дужа зайздросціў ёй сусед Кактус. Калі Фіялка расцвіла, усе звярталі ўвагу толькі на яе, на Кактуса ніхто і не глядзеў. Ён злаваўся, еў сам сябе знутры, увесь распух, пакруглеў. Урэшце Кактус не вытрываў і забурчаў:

— Паглядзіце на Фіялку: яшчэ крыху, і яна, глядзіш, закахаецца.

Фіялка пакрыўдзілася, часта-часта заміргала блакітнымі вочкамі.

Герань папракнула Кактуса:

— Ты сам калючы і словы твае калючыя. Хіба ты не бачыш, што яна ўпершыню цвіце?

— Ну дык і што? Колькі ж можна цвісці? Дарэмна ты яе хваліш!..

— Не, шаноўны дзядуля Кактус,— адказала Фіялка,— гэта я сплачваю свой доўг.

— Чуеш, Герань, хто з нас больш калючы? «Дзядуля, дзядуля Кактус». Які я табе дзядуля? Я маладзейшы за цябе. Калі я ўпершыню расплюшчыў вочы, ты ўжо цвіла. Каму гэта, цікава, ты доўг аддаеш?

— Жменьцы зямлі, якая нарадзіла мяне. Я люблю маці-зямліцу, ёй і аддаю свае пялёсткі.

— Ты іх лепш на сабе трымай! — падкалоў Кактус.— Ведаеш, на каго ты робішся падобнай пасля таго, як асыпаюцца твае пялёсткі?

— На каго?

— На сямігаловую пачвару.

— На каго? — перапытала спалоханая Фіялка.

— Так, так, на пачвару! Сама паглядзі на

сваю сцяблінку, галава акурат як у пачвары, нават язык высунула, быццам праглынуць каго хочаш.

Усе кветкі, што былі на падаконніку, замерлі ад здзіўлення. Пялёсткі ў Фіялкі асыпаліся, і яе сцябло сапраўды нагадвала пачвару з некалькімі галовамі.

Фіялка замаркоцілася: «Праўду кажа Кактус. Трэба, калі пялёсткі мае ападаюць, хаваць сваё сцябло. На каго ж я падобна! Гэта ж такая ганьба!..»

Кактус, задаволены сваёй перамогай, фанабэрыста паглядаў навокал. А кветкі, быццам нехта лінуў на іх гарачай вадой, маўчалі. Нарэшце цішыню парушыла Герань.

— Так на прыгажосць не глядзяць, не шукаюць у ёй заганаў,— сказала яна.— Не засмучайся, Фіялка, не вярэдзь сэрца! Мы ўсё роўна любім цябе!

Кактус зноў забурчаў нешта сваё.

— Фіялка,— звярнулася да яе Герань,— можа, табе лепш не скідаць сваіх пялёсткаў? Зрабі, як я. Калі мяне своечасова не сарвалі, лісточкі мае скурчваюцца, высыхаюць.

— Вы ж не ведаеце, чаму я скідаю свае пялёсткі. На гэта ёсць прычына! — усклікнула Фіялка.

— Якая прычына? — зацікавіліся ўсе.

— Раскажы, раскажы!

— Зараз яна зноў нешта выдумае,— здзекліва прамовіў Кактус,— напляце глупства...

— Не, Фіялка праўду кажа,— сказала Герань.— Усё гэта здарылася на маіх вачах.

— А што, што здарылася?— загаманілі кветкі.— Раскажыце, каб і мы ведалі.

І Фіялка пачала свой расказ.

— Аднойчы, гэта адбылося даўно, мая ма-

ці пачала цвісці. Тады я была зусім маленечкім лістком, толькі-толькі на свет з'явілася.

— Ты была лістком?

— Так, мы нараджаемся лісткамі.

— Не магу паверыць,— падаў голас Кактус.

— Верце, верце,— адказала Герань,— гэта здарылася на маіх вачах, усё сама бачыла.

— Фіялачка, расказвай далей,— папрасіла Ружа.

— А на чым гэта я спынілася? — сумелася Фіялка.

— Ты сказала, што толькі-толькі на свет нарадзілася.

— Ага, і вельмі добра, весела мне было жыць у абдымках маці. Госці, што прыходзілі ў наш дом, заўсёды лашчылі нас. І вось аднойчы...

Фіялка раптам змоўкла. Усе кветкі, акрамя Кактуса, занепакоіліся.

— Што з табой, Фіялка?

Фіялка глыбока ўздыхнула:

— Калі б не тое нявыхаванае дзіця...

— Хто? Хто?..

— Гэта была свавольная дзяўчынка. Аднаго разу яна схапіла маю маці за шыю і вырвала яе з карэннем. Мая бедная маці назаўсёды заплюшчыла свае вочы. Мы ўсе адразу скурчыліся, пажаўцелі. Мае брацікі і сястрычкі, як і я, задыхаліся без паветра і вады. Але нечыя клапатлівыя рукі ўзялі нас і пасадзілі ў зямлю, напаілі вадой. Яны, гэтыя рукі, штодзень даглядалі, песцілі нас. Але, на вялікі жаль, усе мае брацікі і сястрычкі завялі, як і мая маці. Засталася я адна-адзінюткая. Зямелька падаравала мне жыццё. Я ўспамінала сваю маці, сваіх брацікаў і сястрычак, сэрца

маё сціскалася, вочы напаўняліся слязьмі. Аднаго разу пачула я голас: «Не журыся, хутка ты сама станеш маці. А жыццё падарыў табе Чалавек». Гэта быў голас Зямлі.

Паступова я пачала абрастаць карэннем, яно ўсё глыбей уваходзіла ў зямлю, я расла, рабілася дарослай. Нарэшце і я нарадзіла новыя лісткі, яны ператварыліся ў кветкі. Маё сэрца поўна ўдзячнасці Зямлі, Людзям. Таму я і цвіту, дару ўсім блакітныя кветкі.

ЦІ ТРЭБА РВАЦЬ КВЕТКІ?

Сустрэліся аднойчы Заяц з Дзятлам.

— Добры дзень, Даўгавухі! — павітаўся Дзяцел.— Чаму не ў гуморы? Што здарылася?

— Прывітанне, Барабаншчык! Вунь, паглядзі, усе, каму толькі хочацца, рвуць па ахапку кветак і нясуць немаведама куды! — Заяц незадаволена пакруціў галавою і апусціў свае доўгія вушы.

Дзяцел паціснуў плячамі.

— Ну і што, калі рвуць?

— Як гэта што? Калі кожны пачне рваць па цэлым ахапку, дык на нашай паляне зусім не застанецца кветак. Ведаеш, на каго будзе падобна Вясна? На абскубеную курыцу!..

У гэты момант паўз іх, сапучы, прайшоў Вожык, які начапіў на іголкі як панесці кветак.

— Ты толькі паглядзі на яго, на гэтага франта няшчаснага! — усклікнуў Заяц.— Кветкі яму патрэбны? Аднае хапіла б!..

Гэтыя словы абразілі Вожыка. Ён узняў голаў, пагардліва зірнуў на Зайца: «Што ты, маўляў, разумееш?»

— Нарцысы і фіялкі не для таго выраслі, каб аднаго дня завянуць і знікнуць. Яны рады, калі мы зрываем іх і ўпрыгожваем сябе, наколваем іх на грудзі альбо, зрабіўшы вянок, надзяваем на галаву!..

— «На галаву, на грудзі»! — перадражніў яго Заяц.— Глянь на сябе! Начапіў на свае іголкі кветкі і выхваляецца. Эх ты, пудзіла гарохавае!

— Ты проста зайздросціш мне, баязлівец ты гэтакі! Цікава, а куды ты прычэпіш кветкі, няўжо на свае доўгія вушы? Хі-хі-хі! — захіхікаў Вожык.

— Ды хай мае вушы ўкароцяцца, калі я зайздрошчу табе! Захачу і назбіраю кветак, упрыгожуся не горш за цябе!

— А я сам не хачу, разумееш, не хачу!

— Чаго ж ты чакаеш! Хто табе не дае?

— А чаму?

— Ды таму, што кветкі прыгожыя, калі растуць на палянах, на лузе, у полі. Сарвеш іх, і яны адразу ж вянуць і паміраюць. І застаюцца нашы лугі і палі без кветак.

— Паглядзі, колькі іх! Сто гадоў будзеш ірваць, усё роўна не скончацца!..

— Нічога ты не разумееш, калючка неразумная. Кветкі ж даюць насенне, яго падхоплівае вецер і разносіць ва ўсе бакі. Насенне падае на зямлю, і ў хуткім часе з'яўляюцца ўсё новыя і новыя прыгожыя кветкі.

Сэнс Зайцавых слоў нарэшце, відаць, дайшоў да Вожыка.

— Ты праўду кажаш?

— Вядома, праўду!

— Адкуль ты ведаеш?

— Вецер мне сказаў.

— Вецер?

— Ну, але!

— Ніколі ў жыцці я не размаўляў з Ветрам. Як жа гэта здарылася?

— Аднойчы я, як заўсёды, збіраў кветкі. Шмат я іх тады нарваў. Раптам наляцеў Вецер, пачаў тузаць, трэсці мяне, ледзь вушы не паадрываў. «Чаго ты злуешся, шаноўны Вецер? — пачаў прасіцца я.— Адпусці мае вушы, мне вельмі баліць!» — «Мала накруціць табе вушы,— пачуў я,— іх трэба адарваць!» — «У чым жа мая віна?» — спалохаўся я. І тады Вецер сказаў мне: «Ты рвеш прыгожыя кветкі, а потым кідаеш іх. Не чапай кветак, не рві!» — «Яны мне падабаюцца»,— сказаў я. «Калі падабаюцца, дык нагніся, панюхай, прылашчы іх. Не разлучай кветкі з Зямлёй. Толькі яна ахоўвае іх, надоўга робіць духмянымі і свежымі. Што ж атрымаецца, калі кожны будзе рваць кветкі? Усе нашы палі, раўніны, горы і цясніны стануць голыя і непрыгожыя. І не будзе каму спяваць песні Вясне».

Вожык спахмурнеў. Словы Зайца падзейнічалі на яго.

— Што ж мне цяпер рабіць з гэтымі кветкамі? Паслухай, збяры ты іх з маёй спіны...

— Не, на гэты раз занясі кветкі дадому, усё роўна яны завянуць, ужо не будзе ад іх карысці лугам і палям.

— Добра, занясу іх дзеткам, яны вельмі ўзрадуюцца. Толькі мне здаецца, Даўгавухі, што сарваць па адной кветцы, відаць, можна...

— Не, не, Вецер папярэдзіў, што нямożна іх ірваць.

Раптам Заяц шмыгнуў носам:

— Чуеш, Ветрык павеяў? Удыхні... Які прыемны ў яго пах! Дзьме, відаць, з боку фіялак. І яшчэ пахне палявой травой. Значыць,

недзе побач арык, вада крынічная... Нешта піць захацелася, пайду да арыка...

— Добра, ідзі, толькі адкажы яшчэ на адно пытанне: перад тым як сустрэцца з Ветрам, ты шмат тады кветак сарваў?

— Уга, цэлы ахапак!

— Вось і я, дурань, зрабіў гэтак жа. Начапіў на кожную іголку!.. А калі рваць па адной кветцы — адзін нарцыс, адзін рамонак, адну фіялку,— тады ні Вецер, ні Зямля не пакрыўдзяцца.

Доўга думаў Заяц і, нарэшце, згадзіўся. Развітаўся з Вожыкам і пайшоў да арыка піць ваду. Дзяцел, які ўважліва слухаў іхнюю размову, задаволена паківаў галавою і паляцеў па сваіх неадкладных справах.

ВОСЕНЬ-МАСТАЧКА

Надышла Восень. Дрэвы паскідалі сваё лісце, і ўся зямля ў лесе пакрылася жоўта-барвовым дыванам. Толькі адна Чынара з сумам пазірала, як ападае на зямлю яе лістота.

Яліна, што стаяла непадалёку, спытала:

— Чаго ты смуткуеш, дарагая Чынара?

— Яшчэ пытаешся, хіба сама не бачыш?

— Бачу і разумею, але не варта журыцца. Прыйдзе Вясна, і ты зноў апранешся ў сваю цудоўную сукенку.

— Не трэба супакойваць мяне, мілая Яліна, табе майго гора не зразумець. Сама ты заўсёды, у любую пару года, стаіш зялёная, прыгожая! А мае лісты ападаюць і ападаюць. Што яны, цікава, робяць там, на зямлі.

— Расказваюць адзін аднаму асеннюю казку. Цішэй...— раптам папярэдзіла Яліна.—

Бачыш, у лес прыйшлі дзеці. Давай паслухаем, пра што яны будуць гаварыць.

І сапраўды, па лесе, не спяшаючыся, хадзілі дзеці. Яны збіралі ягады і грыбы, укладвалі іх у кошыкі і лубянкі.

Падышлі дзяўчынкі да Чынары. Адна з іх, Лала, агледзела дрэва зверху данізу і сказала:

— Прыгожая!

— Ага, вельмі прыгожая,— падхапіла яе сяброўка.

Чынару разабраў смех. Яна паглядзела на Яліну, хацела ёй сказаць: чым, маўляў, я магла спадабацца гэтым дзецям? Але Яліна зрабіла ёй знак маўчаць.

Лала паставіла свой кошык пад дрэва.

— Ведаеце, каго мне нагадвае гэтая Чынара? Дзяўчыну, якая вельмі стамілася з дарогі і вось цяпер рыхтуецца да адпачынку.

— Я вельмі люблю лес у гэтую пару,— задумліва прамовіла сяброўка Лалы.— Зямлю, быццам барвовым золатам, абсыпала.

— І праўда, лісты, што ападаюць з дрэў, падобны на птушак.

Лала яшчэ раз уважліва паглядзела на Чынару.

— Яна і зімою будзе стройнай і прыгожай.

«Ды вы што, здзекуецеся з мяне?..» — ледзь не крыкнула Чынара, але Яліна зноў прымусіла яе памаўчаць.

— Зімой пойдзе снег,— гаварыла далей Лала,— ён ухутае галіны Чынары. Прыйдзем сюды, а яна будзе з намі гуляць, абсыпаць нас снегам.

Яліна падміргнула Чынары: «Ну вось, бачыш, я ж казала табе, не трэба маркоціцца. У кожнай пары года свая прыгажосць. Матухна Прырода ведае сваю справу».

— Калі дрэвы ўвосень не паскідаюць сваё лісце,— гаварыла Лала,— увесну не вырастуць новыя лісты.

Настрой у Чынары ўзняўся, ёй хацелася смяяцца. Размова дзяўчынак ёй вельмі спадабалася.

Лала падняла з зямлі лісток.

— Паглядзіце,— звярнулася яна да дзяцей,— колькі колераў у адным лістку — белы, чырвоны, жоўты, блакітны. Як прыгожа!

— Цікава, а хто намаляваў гэтыя ўзоры? — спытала Бахар.

— Восень,— адказала Лала.

— Хіба яна мастачка?

— А як жа, самая сапраўдная! Паглядзі на лес, азірніся вакол.

У адным месцы ён блакітны, у другім — ружовы... Хто так можа зрабіць-намаляваць, акрамя Восені!.. Вось і гэтая Чынара дапамагае Восені ўпрыгожыць лес, каб мы ім любаваліся.

Нехта з дзяцей, заварожаны прыгажосцю лесу, прашаптаў:

— Восень-мастачка!..

Чынара супакоена ўздыхнула, варухнула галінамі і скінула дзецям некалькі ажурных лісткоў. Дзеці паднялі іх і, весела размаўляючы, пайшлі дадому.

Чынара задумліва ўсміхнулася і прамовіла:

— Восень-мастачка...

Яліна згодна ківала галавой-верхавінай. А па лесе шапацела лагоднае мяккае рэха:

— Во-сень-мас-тач-ка...

ЗМЕСТ

Гэта — Набрань 3

Маленькія прыгоды з маленькай Гюльцем-гіль 4
Бабуля і я 10
Эльбеніз ідзе ў школу 15
Блізняты 18
Суботнік 22
Ідзе Хазар з Хазара 27
Калі ўдод ляціць нізка... 30

Падснежнік — кветка вясны 33
Яе палюбілі кветкі 36
Зіма-падманшчыца 39
Калыханка 40
Таплан і яго цень 43
Чык-Чык і Гранат 46
Як Мядзведзь пасварыўся з лесам 48
Круглагаловы 52
Верблюдзяня 57
Сяброўства 61
Плаксівае Казляня 69
Горкі Куст Ажыны 72
Заяц-падарожнік 76
Хазры 78
Дзівосны мяшок 82
Чарнавокі 86
Ну, Заяц, пачакай жа! 90
Як Мядзведзя зямля праглынула 95
Новы год 101
Люстэрка 104
Калі прыходзіць Вясна 110
Гусі 111
Качаня-хвалько 113
Самаўпэўнены Паток 117
Мой родны кут 118

Дуб і Крыніца 120
Мара Зоркі 121
Як Вавёрка пасадзіла хваінку 123
Ластаўка-гультайка 126
У хлусні кароткія ногі 128
Песня Фіялкі 131
Ці трэба рваць кветкі? 135
Восень-мастачка 138

Ахмедава А.

А 95 Вавёрка-садоўніца: Апавяданні і казкі: Для мал. шк. узросту /Пер. з азерб. У. Б. Ідэльсона; Маст. У. І. Сытчанка.— Мн.: Юнацтва, 1987.— 143 с.: іл.

Аўтар тонка і ўсхвалявана малюе навакольны свет: пчалу-працаўніцу, якая завіхаецца каля салодкай кветкі; касавокага зайку, што заблудзіў у капусце; ластаўку, якая старанна і надзейна лепіць пад страхою гняздо для свайго будучага патомства. А поруч з гэтым у апавяданнях і казках пісьменніцы А. Ахмедавай прысутнічае свет дапытлівага дзіцяці.

А $\frac{4803010200—087}{М\ 307(03)—87}$ 121—86 ББК 84 Аз

Ахмедова Азиза Яхья кызы

БЕЛКА-САДОВНИЦА

Рассказы и сказки

Минск, издательство «Юнацтва»
На белорусском языке

Загадчык рэдакцыі *А. П. Чаркасаў*
Рэдактар *У. І. Анісковіч*
Мастацкі рэдактар *Ул. М. Жук*
Тэхнічны рэдактар *Г. М. Шашко*
Карэктар *Л. С. Мануленка*

ІБ № 680

Здадзена ў набор 18.11.86. Падпісана да друку 09.04.87. Фармат 84×108 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура школьная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 7,56. Ум. фарб.-адб. 7,98. Ул.-выд. арк. 5,69. Тыраж 12 000 экз. Зак. 2982. Цана 25 к.

Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

25 к.